# 1945

# ДА НАШЫХ ДЗЁН

## ГОД ЗА ГОДАМ, ПАДЗЕЯ ЗА ПАДЗЕЯЙ

Скончылася злавесная ноч фашысцкай акупацыі, якая прынесла безліч пакут і няшчасцяў. Горад ляжаў у руінах, пад нагамі трашчала бітае шкло, вывернутыя з карэннем выбухамі мін і снарадаў усохлыя дрэвы перагароджвалі вуліцы, зейралі задымленымі прабоінамі ацалелыя дамы, і гарклява, задушліва пахла попелам.

Гітлераўцы разбурылі цэментны і фасфарытны заводы, увесь чыгуначны вузел, разрабавалі маёмасць 72 калгасаў, 2 МТС: спалілі ўсе жывёлагадоўчыя пабудовы, вывезлі калгасных кароў, коней, авечак і свіней. Яны спалілі 3695 жылых дамоў, што склала больш за 50 працэнтаў усёй жылой плошчы раёна. Акрамя таго, былі спалены або разбураны 52 школы, усе будынкі ўстаноў культуры, 9 урачэбна- амбулаторных пунктаў.

Увесь цяжар па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі ў першыя гады лёг на плечы жанчын, старых і падлеткаў. Акрыленыя вызваленнем ад фашысцкіх захопнікаў, пераможным наступленнем Чырвонай арміі, людзі працавалі з падвоенай энергіяй, рабілі ўсё магчымае для набліжэння доўгачаканай Перамогі.

У раёне адразу пасля выгнання акупантаў была адноўлена дзейнасць органаў савецкай улады, партыйных арганізацый, камсамола. Першым сакратаром райкома партыі быў выбраны К.А. Рэуцкі. Як успамінае Кузьма Андрэевіч, раённая партыйная арганізацыя на дзень вызвалення налічвала толькі 7 камуністаў, у канцы 1943 г. было 54 члены партыі і 20 кандыдатаў.

Для патрэб аднаўлення і развіцця гаспадаркі выдаткоўваліся значныя грашовыя сродкі. У раён завозілася прамысловае абсталяванне, трактары, аўтамабілі, будаўнічы матэрыял, буйная рагатая жывёла, коні.

Ужо ў пачатку кастрычніка 1943 г. на стале ў крычаўлян з’явіўся духмяны бохан хлеба, выпечаны адноўленай пякарняй. Хворых прыняла бальніца на 50 ложкаў з хірургічным, тэрапеўтычным, радзільным і інфекцыйным аддзяленнямі, пачала працаваць паліклініка. У вёсках Маляцічы, Бацьвінаўка, Паланіца і Зарубец неўзабаве адкрыліся амбулаторыі. У райцэнтры і вёсках паступова пачалі адчыняць дзверы магазіны.

Крычаўляне за год з нечым змаглі

ўзвесці каля 50 школ, пабудаваць нямала адміністрацыйных і жылых памяшканняў, поўнасцю ачысціць ад друзу горад, пачаць выпуск клінкеру на разбураным фашыстамі цэментным заводзе, пусціць у эксплуатацыю льнозавод, прывесці да ладу чыгуначныя пуці, засеяць і ўбраць ураджай збожжа і бульбы на палетках, навесці парадак на пашкоджаных вайной шасэйных дарогах і г.д. І тэта пры адсутнасці тэхнікі, недахопе рабочых рук і кваліфікаваных кадраў.

Развівалася і культурнае жыццё раёна. Аматараў мастацкай, дакументальнай і навукова-тэхнічнай літаратуры абслугоўвала гарадская бібліятэка, адкрыліся бібліятэкі і ў вёсках, пачалі дзейнічаць кінаперасоўкі, ствараліся калектывы мастацкай самадзейнасці. Пачала выдавацца раённая газета «Шлях сацыялізму», тыраж якой у 1944 г. складаў 900 экземпляраў.

Хоць ужо далёка ад Крычаўшчыны, але грымелі баі, працягвалася вайна. І аб гэтым памяталі жыхары раёна. Насельніцтвам у 1944 г. было нарыхтавана і перададзена для Чырвонай арміі 25950 пудоў зерня, 2964 - мяса і 132347 - бульбы, таксама атрымалі воіны гародніну і сена з Крычаўшчыны. Збіралі грошы для фронту. На другую Дзяржаўную пазыку было падпісана аблігацый на 11 мільёнаў рублёў. Жыхары раёна сабралі для будаўніцтва танкаў і самалётаў 2 мільёны рублёў. Неўзабаве ў неба ўзляцелі пабудава- ныя на гэтыя сродкі ІТО-2, якія назвалі «Чыгуначнік Крычава» і «Вызваленая Беларусь», паблісkваючы свежай афарбоўкай, рушылі ў бой новыя танкі.

Праяўляўся ў раёне клопат аб сем’ях франтавікоў, асірацелых дзецях. Добры плён даў праведзены ў раёне месячнік дапамогі пацярпелым ад вайны, у выніку якога каля трохсот чалавек атрымалі пэўныя грашовыя сумы, хлеб і бульбу. (Сабрана было 73680 рублёў, 295 пудоў хлеба і 1000 пудоў бульбы).

Зладжаны стук сякер і залівісты перазвон пілаў будзілі цішыню над вёскамі. Будавалі кароўнікі, канюшні, свірны і жыллё для сем’яў калгаснікаў. Створаныя будаўнічыя брыгады гіраравалі ад цямна да цямна. Толькі за 1944—1945 гг. будаўнікі ўзвялі 2192 дамы, падрыхтавалі 1238 зрубаў.

У 1944 г. пачалі працу 2 машынна-трактарныя станцыі, у якіх тэхнікі мелася небагата, але калгасы і саўгасы ўсё ж атрымлівалі неабходную і своечасовую дапамогу.

Урэшце надыйшоў незабыўна радасны дзень Перамогі. У горад і вёску пачалі вяртацца ўзмужнелыя воіны з ордэнамі і медалямі на гімнасцёрках, колішнія кавалі, слесары, шафёры, механікі, інжынеры. Прыток гэтых сіл аказаўся тым свежым і жыватворным струменем, што колькасна і якасна павялічыў працоўныя здабыткі як на прадпрыемствах, так і ў калгасах і саўгасах раёна.

І ўсё ж становішча заставалася цяжкім, асабліва ў сельскай гаспадарцы. Руплівай увагі патрабавала да сябе абязгноеная і запушчаная за гады вайны зямля. Спустошаныя і незасяваныя плошчы яе ўжо сталі пакрывацца маладымі асінкамі, бярозкамі і хвойкам!. Аратыя былі, але не хапала коней, не мелася і іншых, нават самых прымітыўных сельскагаспадарчых прылад. Свае соткі калгаснікі вымушаны былі араць на сабе. У плуг запрагаліся жанчыны, падлеткі, мужчыны. Гэтая пакутлівая праца знясільвала людзей, харчаванне якіх у той час складалі не заўсёды забелены малаком шчавель, по-

сны рэдзенькі бульбяны суп. Кавалак хлеба не заўсёды быў на сялянскім стале.

Тыя вяскоўцы, у каго мелася карова, спрабавалі выкарыстоўваць яе ў якасці цяглавай сілы. Буронка ўпарцілася, не хапала ў яе сілы цягнуць плуг, часта спынялася, зморана аддыхвала- ся, а скура цямнела ад поту. У калгасах і саўгасах аралі на конях, уручную высявалі пшаніцу, грэчку, ячмень, саджалі бульбу, жалі сярпамі, касілі, стагавалі. Тэхнікі, безумоўна, было мала.

Успамінае былая калгасніца калгаса «Іскра» (цяпер імя Карла Маркса) Матрона Аўрамаўна Старавойтава:

— Мой муж не вярнуўся з вайны. Пяцёра дзяцей засталося без бацькі. Хату немцы пры адступленні спалілі. Пагарэла і вопратка, і прадукты. Хоць ты ў вір галавой кідайся разам з дзяцьмі. Бедавала я, бедавала, усе слёзы выплакала. Галашу, а вочы сухія, расчырванелыя. Начамі думкі розныя не даюць заснуць. Асабліва даймала адна: узяць і пазбавіць жыцця сябе і дзяцей, навошта ім пакутаваць ад голаду і холаду? Без слёз нельга было глядзець на дзетак, схуднелыя яны, бедныя, тварыкі завастрыліся, сталі жоўта-белымі, а ручкі тонкія, бы тыя нітачкі. Кожную хвіліну просяць: «Мама, есці дай», а дзе ж я вазьму харчу? Наўрад ці выжыла б я з дзяцьмі, каб не аднавяскоўцы. Добрыя ў нас людзі, спагадлівыя, да чужой бяды чу- лыя. Хто прынясе збанок малака ці сы- раквашы, хто - акрайчык хлеба, а то і кавалачак сала. Хоць і хлеб той нярэдка быў ацеслівы, з мукі буйнога памолу на самаробных жорнах, але для дзяцей ён з'яўляўся найсаладзейшым ласункам.

Вясной ранняй, калі ў лагчынах ляжаў снег, хадзілі на поле збіраць памерзлую мінулагоднюю бульбу. Прынясеш дамоў цэлы кошык, аблупіш, абмыеш, патаўчэш і на патэльню. Са смакам і сама і дзеці ўплyталі «ташноцікі», трохі падманвалі голад. Цяжка прыходзілася зімой. Дроў не было, упражэшся ў саначкі і па снежнаму цаліку ў лес, насячэш арэхавага ці лазовага кустоўя і цягнеш кіламетры са тры. Папаліш, праз два дні зноў кіруй. Маразы з вятрамі так выстудзяць хату, што хоць ваўкоў ганяй у ёй, акрыцца не было чым, цісналіся на астылай печы адзін да аднаго, гэтым і саграваліся.

На працу ў калгас хадзіла. Бывала, возьмеш з сабой збаночак калодзежнай вады на жніво, схаваеш яго ў снапы, а ён так нагрэецца, што губы, бы іскрынай, апякае. Намахаешся на спякоце за дзень сярпом, аж спіна дранцвее і ногі дрыжаць ад стомы, дамоў ледзь клыпаеш. І раптам хто-небудзь з жанок зацягне песню. На дапамогу ёй прыходзіць адзін голас, потым другі, трэці. Гладзіш, і ўсе пяюць, ды так зладжана, роўна, прыгожа. Быццам артысты... А песні то журботныя, то вясёлыя. І спяваючы, забываліся мы пра сваё гора, пра нястачу ў хаце, у вёску ўваходзілі пасвяжэлыя і быццам памаладзелыя. Лячыла нас песня ад скрухі, ой, як добра лячыла!

Расказвае пенсіянер, жыхар вёскі Кашаны Канстанцін Гаўрыленка:

—Некалі ў нас былі лугі заліўныя. Гэта цяпер іх сапсавала няўдалая меліярацыя, расце дзядоўнік ды крапіва. А тады вымахвалі травы да пояса чалавеку. Каштоўнае было сена. Духмянае, з мноствам рознакаляровых красак. Касілі, грэблі, скідалі ў стагі яго людзі ўручную. Бывала, толькі дзень пачне, яшчэ неба цёмнае, а на лузе ў тумане свішчуць косы. Спорна касіла-

ся з расічкай, лёгка. Покуль сонца ўзыйдзе, мужчыны спляжвалі ладныя кавалкі лугу. Цікава тое, што на сенакосе не назіралася гультайства, абыякавасці. У кожнага касца ад поту аж сарочкі прыліпалі да цела. Такая стараннасць мужчын і жанок, што сушылі і грэблі сена, дапамагала своечасова ўбраць травы, задоўга да надыходу жніва. Не ўпускалася, рупна выкарыстоўвалася кожная пагодлівая часіна: на лузе за якіх-небудзь два—тры тыдні выстрайвалася процьма стагоў, на якіх аж да самага адлёту ў вырай бавілі час буслы. Здзіўляе цяперашні час: у калгасах трактары і касілкі, хапае і іншай сенаўборачнай тэхнікі, а травы то няякасна ўбіраюцца, а то і на значных плошчах застаюцца няскошанымі. Каровам зімой сена выдаецца па жмені. І невядома каго ў гэтым вінаваціць: кіраўнікоў гаспадарак за ганебную бесклапотнасць ці механізатараў за нядбайныя адносіны да сваёй справы. Думаецца, што вінаваты і тыя, і другія. Няўжо прыгасла ў душах тая іскрын- ка, што прымушала і бадзёрыла людзей у нялёгкі пасляваенны час? Менавіта дзякуючы ёй мы дасягалі выдатных поспехаў.

За невыносна цяжкую пасляваенную працу хлебаробам налічваліся працадні. Паколькі ўраджай усіх сельскагаспадарчых культур быў даволі нізкі, а трэба было штогод разлічвацца з дзяржавай, засыпаць насенны фонд, то на аплату калгаснікам заставалася мізэрная колькасць прадукцыі. Так, у 1950-я гады ў калгасе «Іскра» глыбокай восенню на працадзень вяскоўцы атрымалі па 200 грамаў няякаснага збожжа і па 20 капеек грашыма.

Між тым час ішоў, пакрысе залечваліся нанесеныя вайной раны. Папаўняўся трактарны парк МТС, у гаспадарках павялічвалася колькасць цяглавай сілы, і тэта давала магчымасць расшыраць пасяўныя плошчы, больш дбайна апрацоўваць зямлю, скарачаць тэрміны пасяўных работ. У 1946 г. на ўзбраенні дзвюх МТС мелася ўжо 29 трактароў і два збожжаўборачныя камбайны, пабольшала і іншай сельскагаспадарчай тэхнікі. Пасяўная плошча ў тэты час у раёне складала 16596 га, што на 20% было менш за даваенную. Паспяхова выконвалася і пастаўленая раённым кіраўніцтвам задача - найхутчэй перасяліць пацярпелых ад фашыстаў людзей з зямлянак у новыя хаты.

На старонках раённай газеты, з трыбун на розных сходах і мітынгах загучала прозвішча П.К. Малахава, трактарыста другой Крычаўскай МТС. Сапраўды, яго праца здзіўляла высокімі здабыткамі. Пры норме 300 га П.К. Малахаў на трактары ХТЗ выпрацоўваў за год па 600 га і больш мяккага ворыва. Адным з першых сярод сельскіх працаўнікоў раёна ён быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

У 1947 г. у Крычаве пачалі будаваць завод гумавых вырабаў, які ўжо ў 1949 г. выпусціў першую прадукцыю: жаночыя боцікі, галёшы, дзіцячыя цацкі. Будаўнікі заканчвалі аднаўленне цэментнага завода, у 1949 г. гэтае прадпрыемства было запушчана - выдала першыя 65 тон доўгачаканага ў краіне матэрыялу. Завод перасягнуў даваенныя магутнасці на 40%, што дало магчымасць калектыву ў кароткі тэрмін перавысіць паказчыкі выпускаемай прадукцыі за 1938-1940 гг.

У маі 1950 г. прынята пастанова ЦК ВКП(б) «Аб узбуйненні дробных калгасаў і задачах партыйных арганізацый у гэтай справе». Гэты працэс пачаўся і на Крычаўшчыне. Так, у 1950 г.

у адзін калгас «Камунар» аб’ядналіся сельгасарцелі «Камунар» (в. Дарагая), імя Карла Маркса (в. Лушчэвінка), «Свабода» (в. Дарлівая). Сельгасарцелі «Чырвонае Сормава» (в. Зару- бец), «Бор» (в. Ягораўка), «Чырвоны колас» (в. Першамайская) увайшлі ў калгас «Чырвоны колас».

Адбылося ўзбуйненне калгасаў, якія знаходзілісяў вёсках Бель-1, Паўлавічы, Залессе, Паклады, Першы Крычаўскі пасёлак, Сарочына, Слабуты, Маляцічы, Стаборшчына, Баяры, Стараселле і іншых. У пасляваенны час налічвалася 71 гаспадарка, пасля ўзбуйнення іх стала 27.

Павышалася ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур, узрастала пагалоўе жывёлы, расла эканамічная база калгасаў і саўгасаў. Калі ў 1953 г. у гаспадарках раёна налічвалася 1459 кароў, 2525 свіней, а валавая вытворчасць малака складала 14365 ц, то ўжо ў 1956 г. пагалоўе кароў узрасло да 2902, свіней - да 6959, а вытворчасць малака - да 26007 ц. Тады на 100 га сельскагаспадарчых угодзяў было атрымана 74,5 ц малака і 13,9 ц мяса. На грамадскіх палетках раёна ў тэты час працавала ўжо каля 60 трактароў. Да канца 1950-х Крычаўшчына перавысіла даваенны выпуск прадукцыі па ўсіх паказчыках.

Калі была ліквідавана разруха, запрацавалі адноўленыя прадпрыемствы, сталі тэхнічна ўзбройвацца калгасы і саўгасы, прыкметна пачаў узрастаць дабрабыт насельніцтва, непазнавальна стаў мяняць сваё аблічча горад, прыгажэлі вёскі. Некалі паміж цэнтральнай часткай Крычава і пасёлкамі цэментнікаў і чыгуначнікаўў ляжала неўрадлівае балоцістае поле, парослае чэзлымі бярозкамі ды ніцым лазняком. Цяпер па абодва бакі шашы красуюцца мікрараёны «Сож» і Камсамольскі, забудаваныя ў асноўным пяціпавярховымі дамамі. Тут працуюць магазіны, дашкольныя ўстановы, школы, стаматалагічная паліклініка, рэстаран на 120 месцаў, бібліятэка. Толькі за гады адзінаццатай пяцігодкі 1000 сем’яў атрымалі кватэры з усімі зручнасцямі. Пабудаваны мясакамбінат,



Мікрараён Камсамольскі ў г. Крычаў.



Забудова мікрараёна «Сож» у Крычаве.

разлічаны выпрацоўваць за змену 60 т мяса і субпрадуктаў першай катэгорыі і 6 т каўбасных вырабаў.

Увод у эксплуатацыю мясакамбіната прынёс палёгку не толькі гаспадаркам Крычаўшчыны, але і многіх суседніх раёнаў, бо значна зменшыліся расходы на транспарціроўку жывёлы, скараціліся чэргі пры здачы.

Першую прадукцыю выпусціла мэблевая фабрыка. Кухонныя гарнітуры спадабаліся не толькі крычаўлянам і жыхарам рэспублікі, іх з задавальненнем набывалі на Украіне, у Прыбалтыцы, Сярэдняй Азіі, у Маскве. У адзінаццатай пяцігодцы ў вёсках было пабудавана больш за 16 тыс. квадратных метраў жылля. На цэнтральных сядзібах гаспадарак з'явіліся новыя вуліцы, упрыгожаннем якіх сталі дабротныя і светлыя дамы з гаспадарчымі прыбудовамі. У дамы засяляліся механізатары, жывёлаводы, паляводы. Цэлыя вуліцы ўзнікалі ў вёсках калгасаў імя Суворава, «Запаветы Леніна», імя Карла Маркса, «Звязда», «Перамога» і іншых. Будаўнічыя арганізацыі горада таксама працавалі з творчым запалам, імі было выканана будаўніча-мантажных работ на 96,3 млн рублёў што на 4,3 млн больш планавага паказчыка. Аўтарытэт і павагу заслужылі тады брыгады цесляроў В.В. Раманятава, В.Н. Стражнікава, маляроў Т.М. Трацяковай (ПМК-118), комплексныя брыгады МЛ. Кавалёва і А.К. Івашкевіча (МПМК-115). Члены гэтых будаўнічых брыгад раней тэрміну і якасна выконвалі даручанаю работу, эканомілі матэрыялы.

Дзякуючы праведзенай рэканструкцыі на цэментна-шыферным камбінаце ўзрос выпуск прадукцыі. Калі ў даваенны час завод выпускаў за год

100 тыс. т цэменту, то цяпер - 1,2 млн т. Павялічваў свае вытворчыя ма- гутнасці і завод гумавых вырабаў, расшыраў асартымент, якасна абнаўляў прадукцыю.

3 аддачай сіл, самаахвярна і зладжана працавалі крычаўскія чыгуначнікі. У многія куткі былога СССР адпраўляліся цягнікі з самымі разнастайнымі грузамі, у ліку якіх быў і крычаўскі цэмент, шыфер, гумавы абутак, мэбля і г.д. Вялі іх вопытныя машыністы Л.С. Баброў, А.Ф. Матылькоў, Н.Ф. Туркоў, В.І. Кірыенка. Калектыў чыгуначнага вузла паспяхова справіў- ся з выкананнем узятых абавязацельстваў на адзінаццатую пяцігодку, звыш плана перавёз мільёны тон неабходных гаспадарцы грузаў.

Насельніцтву горада і вёскі аказвалася каля 40 відаў паслуг рамонтна-будаўнічым упраўленнем, вытворчым аб’яднаннем жыллёва-камунальнай гаспадаркі, міжраённым упраўленнем газавай гаспадаркі, радыёатэлье, камбінатам бытавога абслугоўвання. Быў здадзены ў эксплуатацию Дом быту на 70 рабочих месц, двухпавярховы, з светлымі праторнымі цэхамі, аснашчаны сучасным абсталяваннем. Бытавікі таксама ўносілі важкі ўклад у эканамічнае развіццё раёна. Нарыхтоўшчык верха абутку С.В. Васкабойнікаў, закройшчыца А.В. Курцянкова, эканаміст па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні В.А. Жарыкаў, прыёмшчык заказаў комплекснага прыёмнага пункта в. Дзягавічы Я.Ф. Сергіенка ўдастоены звання «Заслужаны работнік бытавога абслугоўвання насельніцтва». У адзінаццатай пяцігодцы аб’ём паслуг узрос у 1,4 раза ў параўнанні з папярэдняй.

Паспяхова развіваўся аўтобусны рух. Райцэнтр быў ім звязаны з усімі цэнтральнымі сядзібамі калгасаў і саўгасаў, абласным цэнтрам, суседнімі раёнамі, Масквой, Гомелем, Мінскам, Ро-



Новая вуліца ў Сакольнічах.

славам. Дзейнічала 11 гарадскіх, 9 прыгарадных і 6 міжгародніх маршрута.

У калгасе «Звязда» быў пабудаваны міжгаспадарчы комплекс па адкорму буйной рагатай жывёлы на 4800 галоў, а ў гаспадарцы «Запаветы Ільіча» дзейнічаў комплекс па вырошчванню нецеляў на 3000 галоў. Грамадскае пагалоўе жывёлы ўзрастала, статак рабіўся болып прадуктыўным.

У 1984 г. у гаспадарках раёна налічвалася 31906 галоў буйной рагатай жывёлы, 19973 галавы свіней.

Ураджайнасць збожжавых па раёну перавысіла дваццаціцэнтнеравы рубеж, у 1986 г. хлебаробы змагаліся за тое, каб атрымаць з кожнага гектара па 27 ц збожжавых і зернебабовых, 205 - бульбы, 10 - ільнавалакна, а на кожныя 100 га сельгасугоддзяў - па 450 ц малака і па 100 ц мяса. Канешне, у гаспадарках ураджайнасць сельгаскультур не была аднолькавай. Саўгасы «Дзягавічы», «Крычаўскі» не маглі штогод пахваліцца добрым зборам зерня, а такія калгасы, як «Сацыялістычны шлях», імя XXII з’езда КПСС, імя Суворава дасягалі 40 ц з гектара. Тут добра ўгнойвалі глебу, у сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні праводзілі пасяўныя работы, без страт убіралі вырашчаны ўраджай.

Плённая праца хлебаробаў не заставалася незаўважанай дзяржавай. Механізатару калгаса «Памяць Леніна» М.М. Аляксеенку была ўручана за высокія здзяйсненні Дзяржаўная прэмія СССР, атрымаў Дзяржаўную прэмію БССР трактарыст калгаса імя XXII з’езда КПСС С.Ф. Лабушкін. Многіх працаўнікоў узнагародзілі ордэнамі і медалямі. Свінарка калгаса «Памяць Леніна» Г.В. Малатабойцава выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі.

Разам з інтэнсіўным ростам пагалоўя жывёлы ў калгасах і саўгасах ра-



Уборка льну на Крычаўшчыне.

ёна прыкметна павялічвалася яе прадуктыўнасць. З кожным годам узрастала колькасць даярак, якія на кожную карову надойвалі па 3000 кг малака. Валянціна Налькоўская з калгаса імя Карла Маркса і Ніна Панцялеева з калгаса «Запаветы Ільіча» падыйшлі да чатырохтысячнага рубяжа. Некалькі год запар лідэрства ў раёне па адкорму буйной рагатай жывёлы цвёрда трымалі Леанід Кісялёў з жонкай Верай з калгаса імя Карла Маркса. Сярэднесутачныя прывагі жывёлы ў іх складалі каля кілаграма.

У 1986 г. у калгасах і саўгасах раёна налічвалася 5280 працаздольных. У 1986-1987 гг. на палетках раёна працавала дастаткова тэхнікі: 551 трактар, 276 аўтамашын, 240 збожжаўборачных камбайнаў, 44 бульбаўборачныя і 52 ільнаўборачныя камбайны.

Павялічвалася колькасць вывозімых на палеткі арганічных і мінеральных угнаенняў, і за такі безупынны клопат зямля шчодра адплочвала хлебаробам. У 1989 г. калгас «Сацыялістычны шлях» выйшаў пераможцам ва ўсесаюзным сацыялістычным спаборніцтве за паспяховае выкананне плана эканамічнага развіцця гаспадаркі. Узначальваў калгас тады Барыс Якаўлевіч Белянкоў, вопытны, працалюбівы і патрабавальны кіраўнік, які строга адносіўся да выканання абавязкаў кожным працаўніком і ў той жа час не пакідаў без увагі калгаснікаў, аказаў ім неабходную падтрымку і дапамогу. Тады гаспадарка з кожнага гектара атрымала па 40 ц збожжа, 791 ц малака і 189 ц мяса на 100 га сельгасугоддзяў. Калгас «Сацыялістычны шлях» пад кіраўніцтвам Б.Я. Белянкова ў 1993 г. з кожнага гектара атрымаў па 45,6 ц збожжавых. Гэта яскравае



Пасля працоўнага дня ў калгасе «Памяць Леніна».

сведчанне таго, што крычаўская зямля можа даваць багатыя ўраджаі ўсіх сельскагаспадарчых культур, калі на ёй клапатліва і ўмела гаспадарыць.

Вядома, тармазіла справу існуючая ў тыя часы аднапартыйная камандна-адміністрацыйная сістэма, пры якой кіраўнікі гаспадарак амаль пазбаўлены былі самастойнага пошуку шляхоў развіцця калгасаў і саўгасаў, а выконвалі ўказанні «зверху».

Пасля распаду СССР і прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў раёне пачалася перабудова эканомікі і духоўнага жыцця. Была ажыццёўлена зямельная рэформа, праведзена інвентарызацыя зямель калгасаў і саўгасаў, створаны спецыяльны фонд мясцовых Саветаў. Хлебаробам былі павялічаны зямельныя ўчасткі да 1 гектара.

У пачатку рэформы зарадзіўся фермерскі рух. Цяпер у раёне налічваецца 10 фермерскіх гаспадарак, у іх карыстанні знаходзіцца 113 гектараў зямлі. Вырошчваюць яны капусту, бульбу, збожжа. Высокай ураджайнасцю сельскагаспадарчых культур пакуль што не могуць пахваліцца, і прычына гэтага - адсутнасць неабходнай тэхнікі, грашовых сродкаў на набыццё мінеральных тукаў.

Інтэнсіўны рост цэн на сельскагаспадарчую тэхніку, угнаенні, гаруча-змазачныя матэрыялы адмоўна адбіўся на сацыяльна-эканамічным становішчы раёна ў перыяд пераходу да рынычных адносін. Ва ўмовах фінансавага банкруцтва гаспадаркі не могуць весці сельскагаспадарчыя работы адпаведна патрабаванням сучаснай агратэхнікі. І, як вынік, назіраецца ад-



Ветэраны вайны і працы.



Авіятары СВК «Бель»

чувальны недабор усіх культур у калгасах і саўгасах, пагаршаецца матэрыяльнае становішча гаспадарак. У раёне значна скарацілася пагалоўе буйной рагатай жывёлы і свіней, знізілася прадуктыўнасць грамадскага статка. У 1997 г. гаспадаркі мелі на ўзбраенні 390 трактароў, 269 грузавых аўтамашын, 84 збожжаўборачныя камбайны, 33 бульбаўборачныя камбайны і шэсць ільнаўборачных агрэгатаў. Гэта менш, чым мелі калгасы і саўгасы ў папярэднія гады. Неабходна заўважыць, што трактары, камбайны і аўтамашыны, а таксама прычапны інвентар маюць значную зношанасць вузлоў і агрэгатаў і, з-за адсутнасці сродкаў на запчасткі, рамонт іх вядзецца нерэгулярна. Адсюль і прадукцыйнасць нізкая, спад сельскагаспадарчай вытворчасці, нізкая і культура земляробства. Невысокія эканамічныя паказчыкі гаспадарак раёна адмоўна ўплываюць і на заробкі механізатараў і жывёлаводаў. У выніку моладзь не жадае затрымлівацца ў вёсках, шукае сабе занятак у гарадах.

Цяжкасці пераходнага перыяду адбіліся і на прамысловых прадпрыемствах раёна. Складанасці ўзніклі ў працоўнага калектыва завода гумава-тэхнічных вырабаў. Дарагавізна сыравіны, якую даводзіцца набываць за межамі рэспублікі, зменшаны попыт на прадукцыю, адсутнасць матэрыяльных рэсурсаў парушылі звыклы рытм прадпрыемства. Пачаліся перабоі ў рабоце завода, затрымкі выплаты зарплаты, вымушаныя прастоі механіз- маў. З-за недахопу сыравіны такія праблемы і ў мясакамбіната, цяжкасці эканамічнага выжывання ў рыначных умовах адчулі на сабе працаўнікі цэментна-шыфернага камбіната.

Аднак у апошнія гады справа значна палепшылася як на прамысловых прадпрыемствах, так і ў аграпрамысловым комплексе раёна.

За 2002 г. прамысловымі прадпрыемствамі раёна атрымана прадукцыі на 52,2 мільярда рублёў. Тэмп росту склаў 9,5 працэнта да ўзроўню 2001 г. пры прагнозе 3 працэнты. Найбольшы прырост прадукцыі атрымалі ВРУП

«Крычаўцэментнашыфер», завод гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР, хлебазавод, спіртзавод «Чырвана-будскі». Выпуск цэменту павялічыў- ся на 37 працэнтаў, гумавага абутку на 26,6, пладова-ягаднага віна на 29,6, а хлеба і хлебабулачных вырабаў на 12,3 працэнта.

На нарошчванне прадпрыемствамі аб’ёмаў вытворчасці аказала ўплыў павелічэнне інвестыцый у мадэрнізацыю і тэхпераўзбраенне вытворчасці, работа па павышэнню якасці прадукцыі. За 2002 г. уклад у мадэрнізацыю і тэхпераўзбраенне вытворчасці павялічыўся ў 3,5 раза ў параўнанні з 2001 годам. Многім прадпрыемствам удалося значна скараціць запасы гатовай прадукцыі шляхам яе рэалізацыі на рынках блізкага і далёкага замежжа.

А вось такія прадпрыемствы як ААТ «Крычаўскі мясакамбінат», ААТ «Крычаўскі маслазавод», Крычаўскі завод жалезабетонных вырабаў не могуць пакуль што пахваліцца высокімі працоўнымі здабыткамі. Яны не выканалі прагнозных паказчыкаў да ўзроўню 2001 г., знізілі аб’ём вытворчасці прадукцыі. Нявыкананы і паказчык па выпуску тавараў народнага спажывання.

Для працаўнікоў сельскай гаспадаркі 2002 г. аказаўся надзвычай цяжкім. Недахоп вільгаці адмоўна паўплываў на рост культур. Але, нягледзячы на тэта, у раёне павялічыўся валавы збор збожжа на 17 працэнтаў і склаў 30,8 тыс. тон. Хлебаробы атрымалі па 27,4 цэнтнера зерня з гектара. Паспяхова выкананы план продажу збожжа дзяржаве. А ў такіх гаспадарках, як «Бель», кожны гектар даў па 40 цэнтнераў збожжавых, імя Суворава - 33,4, «Звязда» - 31,2 цэнтнера.

Лепш, чым у 2001 г., папрацавалі і жывёлаводы раёна. Вытворчасць мяса павялічылася на 7 працэнтаў, а продаж яго дзяржаве - на 14 працэнтаў.

На развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы раёна за кошт усіх крыніц фінансавання выкарыстана 3952 мільёны рублёў інвеетыцый, што ў супастаўных цэнах на 3 працэнты болын, чым у 2001 г. Пабудавана 40 кватэр агульнай плошчай 4696 кв. м, у тым ліку на вёсцы 24 кватэры агульнай плошчай 2348 кв. м. Інтэнсіўныя работы вядуцца па добраўпарадкаванню горада, асфальтуюцца вуліцы, прыводзяцца да ладу скверы, выкладваюцца тратуары.

Павелічэнне аб’ёмаў укладання ў пераўзбраенне вытворчасці, работа па павышэнню якасці прадукцыі далі магчымасць прадпрыемствам забяспечыць рост экспарту на 29,2 працэнта да ўзроўню 2001 г. пры прагнозным паказчыку 5 працэнтаў. Экспарт вырас у 2 разы, гумавага абутку - на 26,4 працэнта. Агульная выручка ад экспарту склала 10,9 мільёна долараў ЗША.

Рэфармаванне раённай камунальнай уласнасці праводзіцца шляхам раздзяржаўлення і прыватызацыі асобных аб’ектаў. Было праведзена 10 аукцыёнаў па продажу аб’ектаў нерухомасці раённай камунальнай уласнасці. У выніку прададзены памяшканні: «Чэбурэчнай», «Піўбара», «Грыльбара», магазіна № 1 «Будматэрыялы», памяшканне былой школы №4. У мясцовы бюджэт пасгупіла звыш 131 мільёна рублёў.

Па стану на 1.1.2003 г. у раёне зарэгістраваны 722 індывідуальныя прадпрымальнікі, або ў 1,3 раза болып, чым у 2001 г. На працягу 2002 г. прадпрымальнікамі былі адкрыты 3 магазіны, дыска-бар «Пірамідa», піўбар, 4 закусачныя, майстэрня па рамонту мэблі,

2 міні-рынка, 8 гандлёвых кіёскаў, 15 гандлёвых кропак, што дазволіла стварыць 307 рабочых месц. За 2002 г. плацяжы ў раённы бюджэт ад суб'ектаў малога прадпрымальніцтва склалі 722,5 мільёна рублёў, або 5,9 працэнта ад даходнай часткі бюджэту.

Рэалізуецца ў раёне дзяржаўная маладзёжная палітыка. Колькасць моладзі ад 14 да 31 года - 9046 чалавек, што складае каля 23 працэнтаў усяго насельніцтва. У 2002 г. аднаразовую бязвыплатную субсідыю на паляпшэнне ўмоў жыцця атрымалі 10 маладых сем'яў на агульную суму 50270 тысяч рублёў. На льготных умовах выдадзены крэдыты на суму 70 мільёнаў рублёў (іх атрымалі 127 чалавек).

У раёне вялікая ўвага ўдзяляецца выхаванню падрастаючага пакалення. На пачатку 2001/2002 навучальнага года працавалі 10 сярэдніх, 2 базавыя школы, 13 дашкольных устаноў, 3 комплексы «школа-дзіцячы сад». Рашэннем выканкома ў 2002 г. 6 пазашкольных устаноў рэарганізаваны ў цэнтр пазашкольнай работы, што дазваляе болын плённа праводзіць работу гурткоў. Навучаннем і выхаваннем падрастаючага пакалення займаюцца 686 педагагічных работнікаў. Вышэйшую адукацыю маюць 419 выкладчыкаў.

Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік школы БССР» прысвоена болыд чым 20 педагогам, 48 узнагароджаны знакам «Выдатнік народнай адукацыі», 71 - ганаровымі граматамі



У дзіцячым садзе №4 г. Крычаў.

Міністэрства адукацыі БССР, а 89 атрымалі ордэны і медалі СССР. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны ЕЛ. Маніна вызначылася і на ніве народ- най адукацыі. Ёй было присвоена звание Героя Сацыялістычнай Працы за самаадданую педагагічную дзейнасць. Заслужанай павагай і аўтарытэтам карыстаюцца педагогі Л.М. Стаўская, В.К. Старавойтава, Н.Ф. Нікалаенка і іншыя.

У мэтах развіцця здольнасцей вучняў выкладчыкі ў сваёй рабоце широка выкарыстоўваюць такія элементы педагагічных тэхналогій, як «Дальтон-тэхналогія» (школа № 3), «Праблемнае навучанне» (СШ № 1), «Узроўневая дыферэнцыяцыя» (СШ №№ 1, 5 і інш.).

Для садзейнічання здольным вучням, падтрымкі ініцыятывы і творчасці таленавітай моладзі зацверджана раённая праграма «Развіццё здольнасцей», якая прадугледжвае правядзенне конкурсаў творчых работ, прадметныя алімпіяды і г.д.

Улетку 2002 г. была арганізавана работа лагераў з дзённым наведваннем на 670 вучняў у тры змены, праходзілі аздараўленне дзеці ў лагеры «Ластаўка» Магілёўскага раёна, на турыстычнай базе «Лосвіда» у Віцебскай вобласці, 110 вучняў адпачылі за мяжой нашай рэспублікі. 360 школь-



Будынак фонду сацыяльнай абароны насельніцтва ў мікраараёне г. Крычаў.



На прыёме ў старшыні Крычаўскага райвыканкома І.І. Пракопава.

нікаў і дашкольнікаў, што пражываюць на забруджанай радыенуклідамі мясцовасці, атрымалі санаторнае лячэнне ў абласных лекавых установах.

У мэтах умацавання вучэбна-матэрыяльнай базы толькі ў 2002 г. было набыта спартыўнага інвентару для школ раёна на суму 2173141 рублёў.

Паспяхова складваюцца выхаваў- чыя сістэмы ў школах. Так, у СШ № 3 асноўным накірункам работы ўзята патрыятычнае выхаванне вучняў, у СШ № 7 - фарміраванне здаровага ладу жыцця, у Сакольніцкім комплексе «школа-дзіцячы сад» - адраджэнне нацыянальных традыцый і культуры.

Сталі традыцыяй арганізацыя летняга адпачынку на базе цэнтра пазашкольнай работы для здольных дзяцей, лагера для сацыяльна неабароненых дзяцей, спаборніцтваў юных інспектараў дарожнага руху, творчых музычных фестываляў і г.д.

Адным з напрамкаў радыкальных пераўтварэнняў з'яўляецца вяртанне жыхароў горада і вёскі да сваіх гістарычных каранёў - духоўнай спадчыны. Прыярытэтным напрамкам у дзейнасці ўстаноў культуры стала работа па зберажэнні і адраджэнні здабыткаў нацыянальнай культуры. Працуюць гарадскі Дом культуры, 19 сельскіх клубаў, 23 бібліятэкі, 2 музычныя, мастацкая і спартыўная школы, раённы краязнаўчы музей.

Клубнымі ўстановамі раёна ў 2002 г. было праведзена 3228 культурна-масавых мерапрыемстваў. Упершыню ў тым жа годзе прайшоў раённы агляд-конкурс беларускага абраду. Паспяхова выступілі з цікавымі праграмамі Бацьвінаўскі, Сычыкаўскі, Іванаўскі і Лабковіцкі сельскія дамы культуры. Праведзены абласны агляд-конкурс прафесійнага майстэрства клубных работнікаў «Праз вучобу да майстэрства». Арганізаваны на гарадскім рынку кірмаш вырабаў народных умельцаў Крычаўшчыны. Пры дамах культуры, клубах працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці. 6 самадзейных калектываў удастоены звания народнага. Яны часта выязджаюць з канцэртамі ў суседнія раёны як рэспублікі, так і Расійскай Федэрацыі.



У раённай бібліятэцы.

Навучэнцы дзіцячых музычных і мастацкіх школ прымаюць актыўны ўдзел у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Так, у рэспубліканскай экалагічнай акцыі 14 работ навучэнцаў дзіцячай мастацкай школы ўзнагароджаны дыпломамі, а навучэнка Чырванабудскага філіяла мастацкай школы Насця Пашкевіч стала лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Дом, у якім мы жывём». Дыпломамі на розных конкурсах адзнача- ны Юля Кузьміцкая, Ірына Гладкая, Мікалай Барысевіч і многія іншыя. Маша Дудзіна прымала ўдзел у заключным канцэрце нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу юных талентаў «Сузор'е надзей», які праходзіў у Мінску.

Зараз паслугамі бібліятэк раёна ка-



Урачы раённай бальніцы.

рыстаюцца 20172 чытачы. За 2002 г. фонд бібліятэк папоўніўся амаль на 6 тысяч кніг.

Важкі ўклад у развіццё культуры ўнеслі загадчык аддзела культуры райвыканкама Г.І. Міхееў (працуе на гэтай пасадзе каля 20 гадоў), выкладчыца музыкі І.У. Шчарбакова, бібліятэкар Лутаўскай бібліятэкі Г.А. Азарава, загадчыца аддзела мастацкай самадзейнасці раённага цэнтра культуры і кіраўнік народнага ансамбля «Штайне» Я.С. Разікава і іншыя.

Вялікая ўвага надаецца развіццю аховы здароўя, бытавому абслугоўванню насельніцтва.

*В.Ф. Куліненка.*

## Крычаўшчына спартыўная

Як у райцэнтры, так і ў сельскай мясцовасці спорт знаходзіцца ў вялікай пашане, развіццю яго ўдзяляецца сур'ёзная ўвага.

У горадзе маюцца два стадыёны («Цэментнік» - 1500 месц, гарадскі - 3000 месц), 22 спартыўныя залы, 3 стралковыя ціры, 2 хакейныя пляцоўкі, 2 тэнісныя корты, 1 міні-басейн і шэраг іншых спартыўных збудаванняў. Работу па фізічнаму аздараўленню людзей вядуць 67 спецыялістаў з адпаведнай адукацыяй (45 выкладчыкаў фізічнай культуры, 10 трэнераў, 12 інструктараў-метадыстаў па спорту).

У раёне праводзіцца штогод 49 фізкультурна-аздараўленчых мерапрыемстваў з агульнай колькасцю ўдзельнікаў 6890, у тым ліку 19 - сярод дзяцей і падлеткаў. Праводзяцца спартакіяды сярод працоўных калектываў (11 відаў спорту), сельскіх пасялковых Саветаў (9 відаў спорту), кіруючых работнікаў (5 відаў спорту), школьнікаў (8 відаў спорту). Традыцыйнымі сталі спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў: па хакеі «Залатая шайба», футболу «Скураны мяч», шахматах «Белая ладдзя» і г.д., а таксама спартыўныя спаборніцтвы сярод інвалідаў і людзей сталага ўзросту.

Рэгулярна праводзяцца спартыўныя святы, прысвечаныя знамянальным датам у жыцці рэспублікі, арганізоўваюцца турыстычныя паходы па славутых мясцінах раёна, вобласці, краіны. Шмат збіраюць удзельнікаў спаборніцтвы, прысвечаныя памяці героя-воіна М. Сірацініна (валейбол), генерала арміі, двойчы Героя Савецкага Саюза І. Гусакоўскага (вольная барацьба), Г. Лузеніна і А. Акаёмава (лёгкаатлетычны крос), воіна-інтэрнацыяналіста Л. Краўцова (міні-футбол).

У студзені 2001 г. у горадзе быў створаны фізкультурна-спартыўны клуб «Ювента». Наведвальнікамі яго сталі як дзеці, так і дарослае насельніцтва. Тут працуюць 8 трэнераў па валейболу, футболу, шахматах і іншых відах спорту. У першы год свайго існавання клуб заняў 1-е месца па міні-футболу сярод цэнтраў і спартыўных клубаў па месцы жыхарства, 2-е - па культурызму ў чэмпіянаце Магілёўскай вобласці. Значны ўклад у развіццё фізічнай культуры ўносіць нядаўна створаны клуб «Патрыёт», дзе ў розных спар- тыўных секцыях займаюцца болын як 200 дзяцей і падлеткаў

На працягу апошніх гадоў Крычаўскі раён займае першае месца ў абласной спартакіядзе сярод дзіцячаюнацкіх спартыўных школ, а таксама заваёўвае прызавыя месцы па футбо-




Выступаюць юныя баксёры.

лу і хакею з шайбай. У 2001 г. крычаўскія спартсмены занялі 2-е месца ў рэспубліканскай спартакіядзе «Здароўе чалавека».

У 1982 г. у гарадской ДзЮСШ была адкрыта секцыя па вольнай барацьбе (трэнеры - кандыдат у майстры спорту М.М. Іваноў і майстар спорту СССР А.М. Іваноў). Імі падрыхтаваны 9 майстроў і 31 кандыдат у майстры спорту. Выхаванец гэтай секцыі Яўген Куралёнак у Канадзе стаў чэмпіёнам свету сярод моладзі. Неаднаразова займалі прызавыя месцы ў абласных, рэспубліканскіх спаборніцтвах і іншыя вучні трэнераў Івановых.

Вось ужо 20 гадоў каманда раёна па хакеі з шайбай знаходзіцца ў прызёрах абласной спартакіяды школьнікаў (трэнеры І. Курбака, В. Емяльянаў). Некаторыя яе ігракі ўваходзілі ў зборныя рэспублікі і вобласці.

Лідзіруючае становішча ў абласных спаборніцтвах сярод школьнікаў на працягу апошніх 10 гадоў займае і каманда па лёгкай атлетыцы (трэнер Э. Прыгонікер). Нямала творчых намаганняў унёс у развіццё шахматнай гульні дырэктар ДзЮСШ, кандыдат у майстры спорту Л. Шматкоў. Сярод яго выхаванцаў дзесяткі майстроў, кандыдатаў у майстры, а С. Ліпнік у 1984 г. стала чэмпіёнкай Украіны, яна міжнародны гросмайстар.

Адным словам, шчырая і мэтанакіраваная праца выкладчыкаў фізкультуры, трэнераў прыносіць свой плён. Няхай не ўсе ўдзельнікі розных секций змогуць пахваліцца калі-небудзь спартыўнымі дасягненнямі сусветнага ці рэспубліканскага маштабу, але відавочная карысць у тым, што ў жыццё яны ўступаюць фізічна і духоўна загартаванымі.

Карыстаецца на Крычаўшчыне вялікай папулярнасцю і футбол. У 1965 г. каманда раёна выйграла кубак ЦК ЛКСМБ «Юнацтва». Неаднаразова станавілася прызёрам у абласных спаборніцтвах. Любяць крычаўляне сваю каманду, ахвотна прыходзяць «пахварэць» за яе на стадыён, узнагароджваюць спартсменаў гарачымі апладысментамі.

Вядома, што дасягнутыя поспехі ў пэўных відах спорту, масавасць у фізкультурным руху не прыйшлі самі па сабе. Шмат сіл і намаганняў уклалі ў свой час у выхаванне моладзі М.І. Зайцаў, М.С Балотнікаў, В.З. Бабкоў,

В.Ф. і Г.У. Краснапрошыны, М.С. Трынчанка і многія іншыя выкладчыкі фізкультуры і трэнеры. Зараз іх традыцыі з той жа любоўю да сваёй справы плённа працягвае маладзейшае пакаленне.

*В.А. Емяльянаў.*

# За газетным радком

## Па старонках раённай газеты «Ленінскі кліч»

**1965 г., 20 красавіка**

**ЗАНЕСЕНЫ НА ДОШКУ ПАШАНЫ**

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за першы квартал 1965 года пастановай бюро райкома КПБ і выканкомаўраённагаі гарадскога Саветаўдэпутатаў працоўныхна раённую Дошку пашаны занесены:

Цэментна-шыферны камбінат (дырэктар АЛ. Ставер, сакратар партарганізацыі В.А. Ушкевіч), калектыў якога мае найболын высокія паказчыкі ў краіне па выкарыстанні вытворчых магутнасцей новых вярчальных печаў і выканаў план па выпуску валавой прадукцыі на 104,4 працэнта, па таварнай - на 101,5, па прадукцыйнасці працы - на 102,8 працэнта. Зніжаны сабекошт выпускаемай прадукцыі на 0,2 працэнта. Камбінату прысуджаны пераходны Чырвоны снят РК КПБ, гарсавета.

Птушкакамбінат (дырэктар П.Н. Савінаў, сакратар партарганізацыі Л.Н. Янушкоў), які план па валавой прадукцыі выканаў на 117,9 працэнта, па таварнай - на 118,3, па прадукцыйнасці працы - на 110,1 працэнта.

Саўгас «Крычаўскі» (дырэктар А.М. Калачоў сакратар партарганізацыі С.П. Баранаў), які атрымаў на сто гектараў сельгасугоддзяў па 32 цэнтнеры малака і па 13 цэнтнераў мяса, у тым ліку свініны на сто гектараў ворыва па 6,2 цэнтнера.

Калгас «Перамога» (старшыня В.Я. Жукаў, сакратар партарганізацыі І.Н. Кандрашоў), які атрымаў на сто гектараў сельгасугоддзяў па 48,4 цэнтнера малака і па 12,7 цэнтнера мяса, у тым ліку свініны на сто гектараў ворыва па 9,6 цэнтнера.

**1965, 9 мая**

**ШЧЫРАЕ ПРЫВІТАННЕ**

Мне давялося прыняць удзел у абароне Крычава ў грозны 1941 год. Цяжкі тэта быў час. З-пад Масквы мы трапілі сюды ў самы разгар баёў. Сілы аказаліся няроўнымі і наша дывізія аказалася ў акружэнні.

Мы неслі вялікія страты, але ніхто з чырвонаармейцаў не думаў здавацца. Вера ў перамогу давала нам сілы. І мы прарвалі ланцуг акружэння, каб у другім месцы зноў сустрэць ворага агнём.

Як ветэран вайны, віншую працоўных Крычаўскага раёна з 20-годдзем Дня Перамогі. Жадаю кожнаму здароўя, шчасця і радасці ў жыцці.

С.Г. Мялёшын.
Жытомірская вобласць,
г. Радамышль

**1965 г., 20 мая**

**ВЫСОКАЯ АПЛАТА СВІНАРКАМ**

Добрых поспехаў у свінагадоўлі дабіліся сёлета свінаркі калгаса імя Суворава Кацярына Астапенка і Паліна Казлова. У першым квартале ад свінаматак яны атрымалі і гадавалі да двухмесячнага ўзросту па 9—11 парасят. Вага кожнага парасяці пры ад’ёме - 10—13 кілаграмаў.

За добрую працу атрымана і добрая аплата. За сакавік на працадні і за лік дадатковай аплаты К. Астапенка атрымала 275 рублёў, а П. Казлова - 306 рублёў 30 капеек.

**1965 г., 23 кастрычніка**

## КАБ УТУЛЬНЫМ ПРЫВАБНЫМ БЫЎ ГОРАД

Дамы і вуліцы нашага горада з кожным годам усё болын і болын хаваюцца ў зялёным голлі дрэў. У Крычаве ёсць чатыры паркі і два скверы агульнай плошчай 48,4 гектара. Азелянёны многія вуліцы. Толькі сёлетняй вясной сіламі калектываў арганізацый і ўстаноў, грамадскасцю горада было пасаджана каля 6 тысяч дэкаратыўных і пладовых дрэў і больш за 15 тысяч кустарнікаў.

**1965 г., 25 лістапада**

## ЗА КАРОТКІ ТЭРМІН

У 6-й брыгадзе калгаса «Запаветы Леніна» сваімі сіламі пабудаваны кароўнік на 200 галоў. У памяшканні абсталяваны станкі для цялят.

Дзякуючы старannай працы калгасных цесляроў Л. Літрэева, В. Глушанкова, М. Якіменкі, Е. Міцяніка і іншых усе будаўнічыя работы выкананы за тры месяцы. На зіму грамадскі статак пераведзены ў прасторнае памяшканне.

**1968 г., 1 студзеня**

## РАПАРТЫ ПРАЦОЎНЫХ ПЕРАМОГ

Рабочыя цэментна-шыфернага камбіната план па выпуску асноўных відаў прадукцыі перавыканалі. Звыш плана краіна атрымала больш 7 мільёнаў умоўных плітак шыферу, каля 14 тон цэменту.

Калектыў завода гумавых вырабаў гадавую праграму па выпуску валавой прадукцыі выканаў 7 снежня. Звыш задания выпушчана каля 200 тысяч пар гумавага абутку.

Больш за 3 тысячы цяжкавагавых саставаў правялі ў юбілейным годзе паравознікі дэпо станцыі Крычаў.

Паспяхова справіліся са сваімі задачамі рабочыя маслазавода. Атрымана 159 тон цэльнамалочнай прадукцыі звыш плана.

Работнікі райпрамкамбіната яшчэ 1 кастрычніка адрапартавалі аб выкананні гадавога плана па выпуску мэблі.

Значных поспехаў дабіліся ў 1967 годзе калгасы і саўгасы раёна. Яны перавыканалі гадавыя планы продажу дзяржаве мяса, малака, зерня, яек, ільнасемя, ільнавалакна, бульбы.

Вытворчасць мяса на 100 гектараў сельгасугоддзяў узрасла за 11 месяцаў на 9,6 цэнтнера і склала 49,6 цэнтнера. Вытворчасць малака ў такім жа разліку павялічылася на 20,5 цэнтнера і склала 257,3 цэнтнера.

**1975 г., 1 студзеня**

## ДАТЭРМІНОВА

Калектыў завода гумавых вырабаў, выконваючы ўзятыя на сябе сацыялістычныя абавязацельствы, атрымаў выдатную працоўную перамогу. Д атэрмінова, па стану на 27 снежня 1974 года, выкананы гадавы план выпуску прадукцыі. Дадаткова да задания выпушчана 50 тысяч пар гумавага абутку.

Добра папрацавалі ў мінулым годзе рабочыя цэха № 2. Аб датэрміновым выкананні гадавога плана яны рапартавалі 25 снежня. У гэтым калектыве 420 чалавек з’яўляюцца ўдарнікамі камуністычнай працы.

**1975 г., 1 студзеня**

Ударна папрацавалі ў 1974 годзе работнікі лакаматыўнага дэпо станцыі Крычаў. План перавозак народнагаспадарчых грузаў яны выканалі амаль на паўмесяца раней. Удвая перавыканана сацыялістычнае абавязацельства па перавозцы грузаў звыш нормы ў цяжкавагавых цягніках.

Лепшага выніку ў спаборніцтве дабіўся машыніст Е. Чэрнікаў. На яго рахунку 67 цяжкавагавых цягнікоў і 15 тысяч 266 тон грузаў, перавезеных звыш нормы.

**1975 г., 1 студзеня**

Цэментна-шыферны камбінат план выпуску будаўнічых матэрыялаў выканаў датэрмінова, 30 снежня. Звыш плана выпушчана шэсць тысяч тон цэменту, каля 500 тысяч умоўных плітак шыферу. Дадаткова дадзена працаўнікам палёў 18 тысяч тон вапнавай мукі.

**1975 г., 1 студзеня**

Найлепшых паказчыкаў у спаборніцтве дабіліся пастухі калгаса «Запаветы Леніна» М.Ф. Чыгілаў і А.В. Дворнікаў. Надоі на карову ў іх статку перавысілі 3200 кілаграмаў малака.

**1975 г., 1 студзеня**

**АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ПЕРАВЫКАНАЛА**

Прайшоўшы год прынёс мне вялікую радасць. Я стала пераможцай сацыялістычнага спаборніцтва сярод жывёлаводаў нашага калгаса і раёна. Надаіла ад кожнай каровы амаль 4000 кілаграмаў малака. Перайшоўшы трохтысячны рубеж, я датэрмінова выканала сваё сацыялістычнае абавязацельства і знайшла новыя рэзервы павышэння росту надояў малака. Гэта дазволіць мне сёлета ўзяць чатырохтысячны рубеж па надоях малака.

Н.Я: Пруднікава.
Даярка калгаса «Запаветы Леніна».

**1975 г., 23 студзеня**

**ПРАДУКЦЫЯ ФАБРЫКІ**

Мэблевая фабрыка спецыялізуецца на выпуску кухонных гарнітураў. У гарнітур уваходзіць абедзенны стол, тры навясныя шафы, тры рабочыя тумбачкі, чатыры табурэткі. Першыя партыі гарнітураў, якія паступілі ў гандлёвую сетку, сведчаць аб тым, што яны карыстаюцца попытам. Іх хутка раскупілі жыхары горада. Сёлета фабрыка выпусціць 3800 такіх гарнітураў.

Апрача нашага раёна, вобласці і рэспублікі, гарнітуры будуць пастаўляцца ў Расійскую Федэрацыю, Казахстан і Кіргізію.

**1977г., 4 студзеня**

**УЗНАГАРОДЫ ЛЕПШЫМ**

Напярэдадні новага года ў райсельгасупраўленні групе працаўнікоў вёскі былі ўручаны медалі ВДНГ СССР і каштоўныя падарункі, Ганаровыя дыпломы Міністэрства сельскай гаспадаркі і нарыхтовак.

Сярэбранымі медалямі ўзнагароджаны даглядчык жывёлы І.Я. Стралецкі і свінарка Р.К. Іконская з калгаса «I Іамяць Леніна», бронзавымі - брыгадзір калгаса «Сацыялістычны шлях» Г.Ф. Свадкоўскі, камбайнер калгаса імя Суворава В.І. Дружанкоў, даярка саўгаса «Крычаўскі» Т.Е. Верхатурава, працаўнікі калгаса «Памяць Леніна» - звенявая М.С. Фядосенка, даглядчык жывёлы І.І. Мырза, палявод В.В. Яўсееў. Яны ж атрымалі і каштоўньм падарункі. Р.К. Іконскай, напрыклад, уручаны дыван.

Дзесяць чалавек узнагароджаны Ганаровымі дыпломамі.

**1977 г., 27 студзеня**

**ЛЕПШЫЯ ПРАЦАЎНІКІ**

За высокія паказчыкі ў выкананні індывідуальных сацыялістычных абавязацельстваў занесены на раённую Дошку гонару, узнагароджаны Ганаровай граматай райкома КПБ і райвыканкома з уручэннем бясплатнай пудёўкі ў санаторый і прысвоена ганаровае званне:

Лепшая даярка раёна - Дворнікавай В.Р. з калгаса «Памяць Леніна», якая надаіла 3503 кілаграмы малака на карову.

Лепшы механізатар раёна - Капылову І.П. з калгаса «Звязда», які выпрацаваў на трактары МТЗ-50 1350 эталонных гектараў і ўбраў бульбу з плошчы 186 гектараў.

Лепшая свінарка раёна - Іконскай Р.К. з калгаса «Памяць Леніна», якая атрымала і вырасціла па 22 парасяці ад кожнай свінаматкі.

Лепшая цялятніца раёна - Кутарковай Г.А. з калгаса «Ударнік», якая вырасціла 70 цялят і забяспечыла 724 грамы сярэднесутачнай прывагі.

Лепшы пастух раёна - Анціпенка В.Л. з калгаса «Памяць Леніна», які забяспечыў атрыманне надою малака па 2952 кілаграмы на карову.

Лепшы палявод раёна - Пятроўскай М.Н. з калгаса «Вялікі Кастрычнік».

**1977 г., 10 лютага**

## У ДАМАХ АДПАЧЫНКУ І САНАТОРЫЯХ

Многія рабочыя саўгаса «Дзяіавіч ы» штогод адпачываюць у дамах адпачынку і санаторьмх. Так, у мінулым годзе ў дамах адпачынку пабывалі каваль Пётр Расееў, трактарыст Андрэй Куцапалаў, бухгалтар Вера Цыганкова, а ў санаторыях - цялятніца Марьи Цупрукова, сталяр Антон Аўраменка і іншыя.

**1977 г., 22 лютага**

## ПРЫГАЖЭЕ СЯЛО

Саўгасу «Крычаўскі» уручаны дыплом трэцяй ступені ВДНГ за добраўпарадкаванне цэнтральнай сядзібы - вёскі Чырвоны Ручай. Бронзавымі медалямі выстаўкі ўзнагароджаны дырэктар саўгаса А. Калачоў, рабочыя-будаўнікі А. Клімянкоў, А. Лагуноў, Д. Курыленка.

Вёска Чырвоны Ручай - адна з самых прыгожых у раёне. Яна нагадвае сабой добраўпарадкаваны пасёлак гарадскога тыпу. ІІІматкватэрныя цагляныя жылыя дамы, двухпавярховы Дом культуры, гандлёвы цэнтр, Дом быту. Вуліцы заасфальтаваны, дзейнічае вадаправод. Летам вёска патанае ў зеляніне.

**1977 г., 17 сакавіка**

## ПЕРАМОЖЦА ПА ВЫТВОРЧАСЦІ ЗБОЖЖА

Бюро абкома КПБ, выканком абласнога Савета дэпутатаў працоўных, прэзідыум абласнога Савета прафесіянальных саюзаў і бюро абкома ЛКСМБ разгледзелі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва раёнаў, калгасаў, саўгасаў, брыгад, звенняў і перадавікоў сельскай гаспадаркі вобласці па павелічэнні вытворчасці збожжа і іншых прадуктаў земляробства ў 1976 годзе.

Пераможцам у сацыялістычным сгіаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак збожжа прызнаны сярод раёнаў, аднесеных да другой трупы - Крычаўскі.

У калгасах і саўгасах раёна сабраны ўраджай збожжавых і зернебабовых культур па 27,4 цэнтнера з гектара, або на 15 цэнтнераў болыы, чым у папярэднім годзе. 3 кожнага бала- гектара атрымана па 0,25, і на адзін кілаграм дзеючага рэчыва мінеральных угнаенняў - 5,8 кілаграмазбожжа. План вытворчасці збожжа выкананы на 133,7 і продажу - на 105,4 працэнта.

**1996 г., 17 студзеня**

## УРУЧАНЫ ПАДАРУНКІ

Гарадскі выканком зрабіў навагоднія падарункі дзецям-інвалідам. У сем’ях пабывалі старшыня гарвыканкома А.К. Яленскі, яго намесніца С.К. Сімага, загадчыца аддзела сацыяльнай абароны насельніцтва Т.В. Заблоцкая, якія павіншавалі дзяцей-інвалідаў з Новым годам, уручылі падарункі.

**1996 г., 31 студзеня**

## КАРЫСТАЮЦЦА ПОПЫТАМ

Крычаўскія пакупнікі з задавальненнем набываюць у гарадскіх магазінах макароны, якія выпрабляюць на хлебазаводзе.

—Гэтая прадукцыя пачала выпускацца на нашым прадпрыемстве летась, — расказвае начальнік вытворча-тэхнічнай лабараторыі Ж.В. Кустрэй. - У 1995 годзе мы адправілі ў магазіны 4 тоны макаронаў. Сёлета ёсць намер вырабіць болып.

Зараз выпускаецца ў дзень 1120 кілаграмаў гэтай неабходнай прадукцыі.

**1996 г., 3 лютага**

**НЕ ЗАБЫВАЮЦЬ ПРА ПЕНСІЯНЕРАЎ**

У калгасе «Запаветы Леніна» не забываюць пра тых, хто ўжо шмат год назаслужаным адпачынку, пра тых, хто прысвяціў усё жыццё сяляпскай справе. У пераліку паслуг, якія аказвае ім калгас, і бясплатнае выдзяленне зерня, бульбы, малака, і забеспячэнне палівам, і замена кароў, калі яны ў селяніна захварэлі і перасталі даваць малако.

**1996 г., 29 мая**

**«КРОК» НА КРЫЧАЎШЧЫНЕ**

На працягу чатырох дзён у нашым раёне працавала здымачная трупа праграмы «Крок» беларускага тэлебачання на чале з каментатарам Андрэем Шпегам. Крычаўшчыне будзе прысвечаны цыкл з трох перадач. Праз два—тры тыдні жыхары горада і раёна змогуць убачыць на экранах тэлевізараў свой родны кут, наша паўсядзённае жыццё, працу і адпачынак. Пачуюць яны і вясёлыя прыпеўкі ў выкананні Тамары Дземчанкі.

**2000 г., 15 сакавіка**

**КАЛЕКТЫЎ ВЫЙШАЎ ПЕРАМОЖЦАМ**

Штогод Беларуская чыгунка падводзіць вынікі спаборніцтва за званне лаўрэатаў прэміі імя В.А. Яцкевіча. Лаўрэатамі становяцца калектывы, якія дабіліся высокіх вынікаў па забеспячэнню руху цягнікоў і тэхнікі бяспекі.

І вось вынікі спаборніцтва падведзены. Кіраўніцтва Беларускай чыгункі, прафсаюз вызначыў пераможцу. Гэта Крычаўская дыстанцыя пуці. Калектыў пуцейцаў узнагароджаны прэміяй у памеры 880 тысяч рублёў.

**2000 г., 27 мая**

**ЗА ЗДАРОЎЕМ У «КОЛАС»**

Рашэннем аблвыканкома з лістапада 1998 года аздараўленчаму комплексу «Колас» нададзены статут санаторыя. Тут папраўляюць здароўе пераважна дзеці з забруджаных рыдыенуклідамі раёнаў.

3 ростам насельніцтва горада павялічваўся выраб хлебабулачнай прадукцыі, расшырыўся яе асартымент. У 1952 г. пачалося будаўніцтва новага хлебазавода, які быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1966 г. Вытворчая магутнасць - 60 тон хлебабулачных вырабаў за суткі. Стаў працаваць і кандытарскі цэх, які за суткі вырабляў 300 кг салодкай прадукцыі: шэрбету, бісквітаў і іншых прысмакаў.

Прадпрыемства рэканструявана, устаноўлена сучаснае абсталяванне. Штогод хлебазавод дабіваецца высокіх паказчыкаў у працы, з’яўляецца адным з лепшых прадпрыемстваў раёна.

## Дыстанцыя пуці

Будаўніцтва чыгункі Орша—Крычаў—Унеча распачалося ў 1908 г. Тэмгіы яго былі даволі нізкія. Выкарыстоўвалася ў асноўным ручная праца. У першую сусветную вайну будаўніцтва спынілася. Аднавілася яно толькі ў 1920 г. Конь, малаток і рыдлёўка - вось і ўся «тэхніка», якой аснашчаны былі рабочыя-пуцейцы. У 1923 г. чыгунка Орша—Унеча была здадзена ў эксплуатацыю.

У 1931 г. было закончана будаўніцтва другой чыгуначнай магістралі Рослаў—Крычаў—Магілёў—Асіповічы. У гэтым жа годзе была створана Крычаўская дыстанцыя пуці. Крычаў стаў важным чыгуначным вузлом.

Першым сярод крычаўскіх пуцейцаў званне ўдарніка працы было прысвоена брыгадзіру В. Карпекіну і пуцявому рабочаму



На будаўніцтве чыгункі Орша—Крычаў.



У цяпліцы падсобнай гаспадаркі чыгуначнага дэпо г. Крычава.

І. Аўтушкову. Потым стаханаўцамі сталі дарожны майстар С. Штолік, брыгадзір І. Карасёў, рабочыя Вацура, Дзенісенка і іншыя. Узводзіліся інжынерныя збудаванні, укараняліся новыя машыны і механізмы.

Вайна, пачатая 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкай Германіяй супраць Савецкага Саюза, стала суровым выпрабаваннем для нашага народа, у тым ліку і для жыхароў Крычаўшчыны. Нямецкія самалёты бамбілі чыгуначны вузел. Пачалася эвакуацыя людзей, тэхнічных сродкаў і абсталявання заводаў. Самы актыўны ўдзел у гэтым прымалі крычаўскія чыгуначнікі. Апошнім пакінуў станцыю намеснік начальніка дыстанцыі пуці К. Іваненка, які кіраваў эвакуацыяй.

Пры адступленні нямецка-фашысцкія акупанты ў многіх месцах узарвалі чыгунку, палатно ўзаралі на глыбіню болын аднаго метра спецыяльным пуцеразбуральнікам, знішчылі маеты. Трэба было ў кароткі тэрмін аднавіць 300 км чыгункі, пабудаваць 60 мастоў, узвесці службовыя і жылыя памяшканні. Адначасова рабочыя і служачыя чыгункі сабралі і перадалі Чырвонай арміі грашовыя сродкі на пабудову двух самалётаў. Баявыя машыны называліся «Крычаўскі чыгуначнік». Яны былі перададзены ў авіячасць, якой камандавала славутая лётчыца, маёр В. Ламака.

Работы па аднаўленні пуці з кастрычніка 1943 г. па сакавік 1945 г. узначальваў начальнік дыстанцыі пуці К. Іваненка, намеснікам яго працаваў М. Сілкін.

У 1950 г. чыгунка была адноўлена, па ёй пачаўся інтэнсіўны рух цягнікоў. Радзіма высока ацаніла працоўны подзвіг пуцейцаў. Ордэнам Леніна ўзнагароджаны К. Іваненка, дарожны майстар В. Грып, атрымалі ўрадавыя ўзнагароды С. Штолік, Н. Тартынаў і іншыя. Многім працаўнікам было прысвоена званне «Ганаровы чыгуначнік».

Шмат клопатаў у крычаўскіх чыгуначнікаў і на мяжы стагоддзяў. Зроблены капітальны рамонт чыгункі на ўчастках Орша—Крычаў—Сураж, Крычаў—Шасцераўка, адноўлена 16 мастоў, праведзена рэканструкцыя станцый Крычаў-1, Камунары, Чавусы,



Ветэраны-чыгуначнікі г. Крычаў.

Цёмны Лес, Пагодзіна, Клімавічы, Ходасы.

Удзяляецца ўвага сацыяльна-бытавым праблемам. Узведзена шмат жылых дамоў, клуб, у новым памяшканні дыстанцыі пуці ёсць спартыўная зала, саўна з басейнам. Пабудаваны стадыён.

У музеі працоўнай і баявой славы захоўваюцца шматлікія ганаровыя граматы, якія атрымаў калектыў за сумленную працу. Чацвёра чыгуначнікаў узнагароджаны ордэнамі Леніна, 6 - ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, 3 - ордэнам «Знак Пашаны», многія працаўнікі атрымалі іншыя ўрадавыя ўзнагароды.

Дыстанцыю пуці ў розны час узначальвалі П.І. Зайцаў, І.Л. Котляр, Л.Г. Новікаў, І.Д. Шапавал, П.А. Мяндрэнка, М.Б. Казанік, М.Т. Грычарук, Т.М. Чубкоў, А.М. Пшэнай, П.С. Цюцюннікаў, П.М. Глухаў.

*В.Ф. Куліненка.*

## Адкрытае акцыянернае таварыства «Мясакамбінат»

Прадпрыемства пачало працаваць у кастрычніку 1974 г. Займала плошчу каля 18 гектараў. Разліковыя магутнасці камбіната таксама выглядалі ўнушальна: выраб мяса за змену - 60 тон, каўбасных вырабаў - 10,2, мясных паўфабрыкатаў - 4,9 тоны. Ёмістасць вытворчага халадзільніка складала 1000 тон, столькі гатовай прадукцыі адразу магло захоўвацца на прадпрыемстве.

З самага пачатку Крычаўскі мясакамбінат меў статус прадпрыемства саюзнага значэння.

Першым дырэктарам камбіната быў зацверджаны Пётр Пятровіч Казлоўскі. Пад яго кіраўніцтвам прадпрыемства рабіла свае першыя крокі. І, трэба сказаць, даволі ўпэўненыя. Ужо да канца 1974 г. выраб мяса склаў 6897 тон, каўбасных вырабаў — 96 тон.

Максімальнай выпрацоўкі мясакамбінат



У каўбасным цэху Крычаўскага мясакамбіната.

дасягнуў у 1988 г. У той час было выпушчана 28185 тон мяса і субпрадуктаў першай катэгорыі. У1989 г. каўбасныя вырабы склалі 5643 тоны. У тэты час на прадпрыемстве працавалі 724 чалавекі.

Агульны няўстойлівы стан краіны адбіўся на рабоце прадпрыемства. У 1999 г. вытворчыя магутнасці мясакамбінатазагружаны былі толькі на 30-40%.

У апошнія гады становішча на камбінаце паляпшаецца. Праведзена рэканструкцыя цэха, павялічана магутнасць тэрмічнага аддзялення да 12,5 тоны. Тэта дало магчымасць павялічыць выпуск вараных, вэнджаных і іншых вырабаў. Запушчана новая камера па замарозцы пельменяў на 2,5 тоны.

На прадпрыемстве шмат передавікоў вытворчасці. Ніна Мікалаеўна Логвінава, Кацярына Пятроўна Янчанка, Аляксандра Еўдакімаўна Сяргееваўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Многія працаўнікі ўдастоены медаля «За працоўную доблесць».

Вялікі ўклад у развіццё прадпрыемства ўнеслі В.Ф. Карнееў, В.М. Баразна, А.І. Сяргееў, В.П. Бубнова, Г.М. Шаршнёва, Г.І. Куцянёва, М.І. Бяззубенка, Л.П. Фітлоўская і іншьш.

*С. Дынікаў.*

## Аўтобусны парк № 3

Паводле рашэння Міністэрства аўтамабільнага транспарту і шасейных дарог БССР ад 7.9.1954 г. у Магілёве быў арганізаваны міжабласны транспартны траст, у які ўвайшла і Крычаўская аўтатранспартная кантора. Потым яна была перайменавана ў аўтабазу № 7, а ў 1970 г. - у аўтабазу № 15. Тут меліся грузавыя аўтамашыны і аўтобусы. Самастойнасць аўтобусны парк атрымаў у 1980 г.

Зараз у Крычаўскім аўтапарку № 3 налічваецца 59 аўтобусаў розных марак, пераважную болынасць якіх складаюць машы- ны маркі «Ікарус». Працуе 7 гарадскіх, 9 прыгарадных і 5 міжгародніх маршрутаў. Кожны дзень з аўтастанцыі адпраўляюцца аўтобусы ў суседнія райцэнтры: Клімавічы, Мсціслаў, Чэрыкаў, у буйныя населения вёскі раёна, а таксама ў Мінск, Магілёў, Гомель, Маскву.

У аўтапарку працуюць людзі розных узростаў. Майстры сваёй справы ахвотна перадаюць свой вопыт моладзі. Нямала тут сумленных працаўнікоў, якімі заслужана ганарыцца калектыў. Некаторыя з іх ужо на пеней, але часта прыходзяць у аўтапарк, цікавяцца яго справамі, дапамагаюць рознымі карыснымі парадамі маладым вадзіцелям і рамонтнікам. Б.С. Барысаў, С.П. Кальны, С.П. Марчанка, І.І. Міхальчанка, В.С. Нусаў, Г.Н. Пятроў і некаторыя іншыя работнікі аўтапарка за высокія паказчыкі ў працы маюць урадавыя ўзнагароды.

## Фасфарытны завод

Работы па ўзвядзенні фасфарытнага завода пачаліся ў 1927 г. У маі 1930 г. завод з праектнай магутнасцю 30 тыс. тон фасфарытнай мукі ў год быў запушчаны. Сыравіну на фасфарытны завод дастаўлялі па р. Сож на баржах грузападымальнасцю ад 50 да 300 тон з радовішчаў у Хіславіцкім раёне Смаленскай вобласці. Да 1941 г. прадпрыемства дасягнула магутнасці 50 тыс. тон прадукцыі ў год.

У 1943 г. пры адступленні нямецка-фашысцкія захопнікі ўзарвалі большую частку завода. Аднаўляць яго пасля вызвалення Крычава не сталі. На тым месцы прыступілі да будаўніцтва завода гумавых вырабаў.

## Завод гумавых вырабаў

Будаўніцтва завода гумавых вырабаў на месцы разбуранага фашыстамі фасфарыт-

нага пачалося ў 1947 г. паводле рашэння Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР. У ліпені 1949 г. уступіла ў строй першая чарга. Пайшла першая прадукцыя - прагумаваная плашчовая тканіна. Другая чарга капітальнага будаўніцтва была закончана ў 1950 г. На ўстаноўленых магутнасцях прадпрыемства асвоіла выпуск новага віду прадукцыі - шынкі для дзіцячых веласіпедаў, дзіцячых мячыкаў і гумавых цацак.

У 1950 г. гадавы вытворчы план быў выкананы да першага лістапада. Да канца года яго выканалі на 128,5%. У сакавіку 1950 г. на заводзе прыступілі да асваення тэхналогіі вырабу гумавых ботаў. Часовую брыгаду клейшчыц з 5 чалавек узначаліла Е. Карнеева. У тым годзе брыгада зрабіла 1158 пар ботаў.

З 1951 па 1954 гг. праведзена рэканструкцыя завода. Цэх па вырабу гумавага абутку ўступіў у строй 1 чэрвеня 1954 г. У 1957 г. прыступілі да асваення тэхналогіі выпуску абутку на вулканізацыйных прэсах. З 1959 г. асвоены выпуск клееных лакіраваных гумавых ботаў. У 1963 г. уведзены ў эксплуатацыю цэх магутнасцю 1150 тыс. пар абутку. На прадпрыемстве ўстанавілі абсталяванне для вырабу новых відаў гуматэхнічнай прадукцыі метадам фармавання і шпрыцавання, устаноўлены чэхаславацкія прэсы «Світ» для вытворчасці фармовага спартыўнага абутку. У мэтах механізацыі працаёмкіх працэсаў устаноўлены грузавыя ліфты, вырубныя прэсы, поўнасцю механізаваны працэс нарыхтоўкі паўфабрыкатаў.


У фірменным магазіне «Чаравічак».

У 1965 г. прыступілі да выпуску спартыўнага абутку. У 1968 г. аб'ём вытворчасці абутку перавысіў праектную магутнасць у 2,5 раза. У 1966 г. плашчовыя тканіны былі зняты з вытворчасці, завод пачаў спецыялізавацца пераважна на выпуску гумавага абутку.

З 1968 па 1985 гг. вялася рэканструкцыя завода. У 1971 г. асвоены выпуск каляровага гумавага абутку. З 1985 г. уведзены ў эксплуатацию цэх па вытворчасці клеенага абутку магутнасцю 3 млн пар у год, цэх па вытворчасці таварных клеяў магутнасцю 500 т у год. У1985 г. пачаўся выпуск абутку метадам ліцця пад ціскам з кампазіцый ПВХ. З 1986 г. па 1988 г. праведзена тэхнічнае пераўзбраенне ў падрыхтоўчым цэху па вытворчасці фармавога абутку.

Працоўны кал ектыў завода асвоіў выпуск больш за 30 узораў клеенага абутку, 32 віды - спартыўнага і фармавога, 12 - ліццявога абутку з кампазіцый ПВХ. За гады існа- вання завода выраблена каля 150 млн пар гумавага абутку. У 1968 г. прадпрыемству присвоена імя 50-годдзя БССР.

## Раённы вузел сувязі

Першая паштовая кантора ў мястэчку Крычаў была адчынена ў 1850 г. Зараз у горадзе 5 аддзяленняў сувязі, а ў раёне - 11. Раённы вузел сувязі аказвае разнастайныя паслугі насельніцтву. Тэта прыём, перасылка, уручэнне паштовых адпраўленняў, дастаўка на дом лістоў і бандэроляў, грашовых пераводаў выплата пенсій, арганізацыя ведамаснай і індывідуальнай падпіскі на га-

зеты і часопісы, дастаўка перыядычных выданняў адрасатам, перасылка паштовых адпраўленняў міжнароднай паскоранай поштай і г.д.

Аказваюцца ў аддзяленнях сувязі і нетрадыцыйныя паслугі: рэалізацыя тавараў народнага спажывання, ксеракапіраванне, прыём плацяжоў за камунальныя паслугі, электраэнергію, газ, антэны калектыўнага карыстання, плацяжы Дзяржстраха і шмат іншых. За 9 месяцаў 1999 г. раённым вузлом сувязі аказана паслуг насельніцтву на 25 мільярдаў 390 мільёнаў рублёў.

Значны ўклад у развіццё паштовай сувязі ўнеслі ветэраны працы Пётр Арусмавіч Марачкаў, Аляксей Васілевіч Грабскі, які за самаадданую працу ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Павагай сярод сувязістаў карыстаюцца Тамара Сямёнаўна Мудрачэнка, Тамара Мікалаеўна Марозава, Паліна Сяргееўна Зазькіна і многія іншыя добрасумленныя працаўнікі.

У 1999 г. раённы вузел сувязі атрымаў новае, па-сучаснаму абсталяванае памяшканне, дзе значна палепшыліся ўмовы працы.

## З гісторыі школ

**Бацьвінаўская СШ.** Першая царкоўнапрыходская школа ў вёсцы Бацьвінаўка была адкрыта ў 1906 г. Размяшчалася яна ў хаце селяніна Карнея Грышына. Вучняў у ёй было няшмат. Вучыліся толькі дзеці заможных вяскоўцаў. Настаўнікам працаваў Міхаіл Якаўлевіч Раманенка.

Вядома ж, у сялянскай хаце зручнасцей для вучобы было мала. Цесна, асабліва зімой, калі вокны замураваў мароз, не хапала святла. У такіх умовах дзеці вучыліся да 1915 г., да дня пабудовы школьнага будынка на два класныя пакоі. Настаўніцай стала працаваць Вера Іванаўна Савіч.



Настаўніцкі калектыў Бацьвінаўскай школы, 1936 г.

У1933 г. у вёсцы была адкрыта сямігадовая школа. Першым дырэктарам яе стаў Іван Мікітавіч Касценіч. Бацьвінаўказабудоўвалася, расла колькасць насельніцтва. І таму тут рашылі пабудаваць сярэднюю школу. Працаваць яна стала з 1939 г. Заняткі прыпыніла вайна, пасля вызвалення вёскі ад гітлераўскіх акупантаў вучоба ў школе аднавілася.

З 1989 г. у Бацьвінаўскай СШ пачала працаваць трупа «Пошук». Дзякуючы настойлівай рабоце гэтай трупы ў школе быў створаны гісторыка-краязнаўчы музей «Гісторыя вёскі Бацьвінаўка». Тут сабраны ўспаміны воінаў-землякоў, фотаздымкі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і людзей, што вызначыліся высокапрадукцыйнай працай у мірны час, гістарычныя звесткі пра вёску. Экспазіцыя музея папаўняецца.

**Крычаўская СШ № 1.** Сярэдняя школа № 1 была адкрыта ў 1918 г. і размяшчалася ў былым Пацёмкінскім палацы. Спачатку яна насіла імя А.П. Чэхава, а з 1924 г. — імя У.І. Леніна. У час фашысцкай акупацыі Крычава школа не працавала. Вучоба пачалася восенню 1943 г. Дырэктарам тады быў Андрэй Аляксеевіч Нікалаеў.

У 1959 г. школа перамясцілася ў другое памяшканне. У ім яна знаходзіцца і цяпер. У



2-І выпуск Крычаўскай сярэдняй школы.

1960 г. школы імя Леніна і імя Карла Маркса аб'ядналіся. Узначаліў яе Іван Дзянісавіч Каралёў.

З 1 сакавіка 1963 г. па сакавік 1978 г. дырэктарам школы працаваў выдатнік народнай адукацыі Міхаіл Сямёнавіч Курцікаў. Педагагічны калектыў школы першым у раёне перайшоў на кабінетную сістэму навучання. За работу па патрыятычнаму выхаванню моладзі школа з'яўлялася ўдзельнікам Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. М.С. Курцікаў быў узнагароджаны ў 1969 г. медалём ВДНГ.

Многія выпускнікі школы сталі вядомымі людзьмі як у рэспубліцы, так і за яе межамі. Гэта пісьменнікі Я. Мазалькоў, В. Карамазаў, вучоныя В. Даніленка, А. Гіндзін, дзяржаўныя дзеячы К. Кісялёў І. Пастрэвіч, М. Мяшкоў, спартсмены М. Крываносаў, Н. Лаўрыненка і іншыя.

У 2003 г. у школе навучалася 878 вучняў.

**Сакольніцкая школа.**

Навучаннедзяцей у вёсцы Сакольнічы пачалося ў апошняй чвэрці XIX ст. Спачатку было падворнае навучанне грамаце дзяцей з больш заможныхсем'яў вандроўнымі настаўнікамі. Першым настаўнікам, які абучаў дзяцей тутэйшых сялян, быў нейкі Шчамель.

У 1895 г. сяляне вёскі Сакольнічы на свае сродкі пачалі будаўніцтва школы. У 1896 г. адкрыта царкоўнапрыходская школа граматы, дзе настаўнікам быў Канапелька, якога ўтрымлівалі на свае сродкі сяляне. У 1905 г. у Сакольніцкай царкоўнапрыходскай школе працавалі настаўнікамі Апанас Шаўкуноў і Лявон Мяшкоў.

У 1908 г. была адкрыта двухкамплектная пачатковая школа. З 1933 г. пачала дзейнічаць сямігодка. Будынак гэтай школы спалілі фашысты ў 1941 г.

Дырэктар школы А.С. Гурыновіч ваўмовах фашысцкай акупацыі арганізаваў падпольную арганізацыю, якая мела цесную сувязь з партызанскім рухам.

Былая вучаніца, першая трактарыстка раёна Таццяна Міхайлаўна Гіндзіна была

разведчыцай і загінула ў засценках гестапа.

У 1951 г. была адкрыта новая школа-сямігодка.

З 1951 па 1959 гг. адбылося 9 выпускаў сямікласнікаў у колькасці 262 вучні.

З 1970 г. школа стала сярэдняй.

З 1 верасня 1989 г. у вёсцы Сакольнічы заняткі пачаліся ў новым двухпавярховым будынку. За час існавання сярэдняй школы было выдадзена 368 атэстатаў аб сярэдняй адукацыі.

З 1 лістапада 1999 г. школа рэарганізавана ў комплекс «Школа-дзіцячы сад».

## Крычаўскі агратэхнічны каледж

У раённым музеі захоўваюцца копіі дакументаў дырэкцыі народных вучылішч Магілёўскай губерні за 1902—1911 гады. У адным з іх, датаваным 1905 годам, гаворыцца: «У 1888 годзе дваране і сяляне Чэрыкаўскага павета вырашылі адкрыць у м. Крычаў для сялянскіх хлопчыкаў рамесныя класы пры Крычаўскім 1-м народным вучылішчы. На жаль, класам не суджана было доўга праіснаваць. У 1898 годзе ў час пажару ў мястэчку будынак класаў згарэў, таму спыніліся заняткі ў іх. Цяпер былыя рамесныя класы адрадзіліся ў новым, лепшым выглядзе. Рамесныя класы ператварыліся ў ніжэйшую рамесную школу. На месцы згарэўшых будынкаўузвялі новы, вельмі прыгожы мураваны 2-павярховы будынак. 30 студзеня 1905 года ў 2 гадзіны апоўдні ў будынку школы сабраліся ганаровыя госці на чале з прадвадзіцелем дваран Чэрыкаўскага павета панам Сірэнкам Г.А., мясцовым земскім начальнікам Марозавым Г.А. Прысутнічалі мясцовыя памешчыкі, інтэлігенцыя і шмат сялян».

Рамеснае вучылішча мела 2 аддзяленні: слясарна-кавальскае і сталярна-такарнае. Навучанне працягвалася 4 гады. Першым дырэктарам рамеснага вучылішча быў Тэорий Фаміч Нікалаеў, настаўнікі - Кузьма Галкоўскі, Ігнат Макарэвіч, Уладзімір Сядлецкі, чаляднікі - Фёдар Яверкін (сталяр- ная справа), Іван Прэйс (слясарная справа).

Вялікая ўвага ў рамесным вучылішчы ўдзялялася агульнаадукацыйным прадметам. Вывучаліся руская мова, арыфметыка, фізіка і механіка, чарчэнне, рысаванне, тэхналогія, рахункаводства, Закон Божы.

Сярод выпускнікоў Крычаўскага рамеснага вучылішча было многа рэвалюцыйна настроенай моладзі. Сярод выпускнікоў 1913 года Адам і Павел Попелі, Іван Поклад, Васіль Магілёўкін, Анісім Пузырэўскі. Хутка ўсе яны паехалі ў Петраград. Там, на заводах, выпускнікі Крычаўскай рамеснай школы славіліся выдатнай прафесійнай падрыхтоўкай. Адам Попель быў умелым токарам. Разам з Васілём Магілёўкіным яны працавалі на заводзе «Айваз», Анісім Пузырэўскі - у трамвайным дэпо, Павел Попель - кацельшчыкам на суднабудаўнічым заводзе. Усе яны актыўна ўдзельнічалі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне.

Былы выпускнік рамеснага вучылішча Мацвей Кісялёў першым у нашай краіне ў гады грамадзянскай вайны быў двойчы ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сдяга.

Крычаўская рамесная школа праіснавала да 1924 года, з 1925 года была перайменавана ў Крычаўскую прафесіянальна-тэхнічную школу, у якой навучанне працягвалася таксама 4 гады.

У 1933 годзе прафтэхшкола была рэарганізавана і перайшла з падпарадкавання Міністэрства асветы ў Міністэрства земляробства (Наркамзем). Называлася яна тады школай трактарных брыгадзіраў, а праз два гады была перайменавана ў Крычаўскую рэспубліканскую школу механізацыі сельскай гаспадаркі. Тут рыхтавалі механікаў для МТС, брыгадзіраў трактарных брыгад, трактарыстаў, камбайнёраў, ільноцерабілынчыкаў, шафёраў. Выпускніцай гэтай школы была першая дзяўчына-трактарыстка на Крычаўшчыне Таццяна Гіндзіна.

Шмат гадоў прапрацаваў у рамесным вучылішчы, прафтэхшколе, школе трактарных брыгадзіраў І.Ц. Кісялёў. Вось артыкул з Крычаўскай раённай газеты за 1940 г. «Кузня кадраў»: «Цёпла, з любоўю адклікаюцца курсанты аб школе і яе выдатных педагогах і інструктарах. Многа пісьмаў ад сваіх выхаванцаў атрымлівае інструктар слясарнай справы Іван Цімафеевіч Кісялёў. Інструктарам ён пачаў працаваць яшчэ 26 гадоў таму ў рамеснай школе. За сваё жыццё ён абучыў слясарнай справе каля 2000 чалавек».

У сваім пісьме Івану Цімафеевічу брыгадзір Жлобінскай МТС тав. Вярбіцкі піша: «На рабоце я сябе апраўдаў. Ад усёй душы дзякую за навуку, за ганаровае званне брыгадзіра, якое я атрымаў у школе».

У пасляваенныя гады працоўныя традыцыі працягвала школа ФЗО, прафтэхвучылішча № 5, СПТВ-38, СПТВ-112, СПТВ-216. Крычаў па-ранейшаму з'яўляецца кузняй высокакваліфікаваных кадраў для калгасаў, будаўнічых і прамысловых арганізацый. З 15.4.2002 г. вучылішча стала Крычаўскім прафесійным агратэхнічным каледжам.

*Н.М. Марозава.*

## Вызначыліся працай

### ГЕРОІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

**ГАТОЎЧЫК Анатоль Дзянісавіч,** нарадзіўся 24.3.1937 г. у в. Воранёва. Герой Сацыялістычнай працы (1975). З 1963 г. машыніст вярчальных печаў Крычаўскага цэментна-шыфернага камбіната. Званне Героя прысвоена за працоўную доблесць у выкананні заданняў 9-й пяцігодкі і высокія тэхніка-эканамічныя паказчыкі ў рабоце.

### Час выбраў яго

Анатоль Дзянісавіч Гатоўчык скончыў Крычаўскае тэхвучылішча № 5. Пасля службы ў арміі ўладкаваўся працаваць на цэментна-шыферны камбінат.

Прадпрыемства з кожным годам павялічвала выпуск прадукцыі. У цэху абпалу ўводзілася новая, болын магутная трэцяя вярчальная печ, а побач - чацвёртая. Працаваць тут маглі толькі падрыхтаваныя рабочыя. На камбінаце арганізавалі курсы па падрыхтоўцы машыністаў і машыністаў вярчальныў печаў. На экзаменах добрыя веды паказаў А.Дз. Гатоўчыц. Але гэтага было мала. Неабходна было вучыцца далей. У 1962 г. А.Дз. Гатоўчык завочна паступіў у Мінскі індустрыяльны тэхнікум. Хутка яму даверылі пульт кіравання адной з самых вялікіх вярчальных печаў. Тут ён праявіў сябе сапраўдным майстрам.



А. Дз. Гатоўчык (злева), І.І. Магілёўцаў (справа).

— Спачатку мне шмат дапамагалі машыністы вярчальных печаў Магілёўцаў, Галаванаў, начальнік цэха Майсеенка, — успамінае Анатоль Дзянісавіч. — Выкарыстоўваў іх вопыт.

У кабінеце, дзе пульт кіравання, над лістом чыстай паперы схіліўся А.Дз. Гатоўчык. Ён заносіць паказчыкі прыбораў аб рабоце печы. Пасля ідзе на «галоўку», якая дыхае гарачынёй. Уважліва назірае, як бушуе ў печы полымя і адзначае задаволена ў думках: «Усё ідзе добра».

А тэта азначае, што печ выдав за гадзіну 51 тону клінкера, на 1 тону больш за праектную магутнасць. Дабаўка за змену - 8 тон. А за год?

Анатоль Дзянісавіч Гатоўчык падрыхтаваў сабе добрую змену. Яго часта запрашаюць на сустрэчы школьнікі, бывае майстар на іншых прадпрыемствах. Ён з гонарам расказвае аб сваёй прафесіі, аб сябрах, якія працуюць у аб'яднанні. Людзі ўважліва слухаюць ветэрана працы.

*І. Салаўёў.*

## Галоўны інжынер Брацкай ГЭС

**ГІНДЗІН Арон Маркавіч,** нарадзіўся ў Крычаве. Герой Сацыялістычнай Працы. Скончыў Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію.

На адной з вуліц Крычава, што пралягла ў бок ракі Сож, жыў у дарэвалюцыйныя гады Меер Гіндзін. Каб пракарміць сям'ю, ён удзень і ўначы віў вяроўкі. Дапамагаў бацьку і маленькі Арон, але яму не падабалася гэтая аднастайная работа. Ён любіў бавіць час на рацэ, купацца. Любіў марыць. Чуў ад людзей, што ёсць на свеце моры і акіяны, вялікія рэкі. Вось бы стаць капітанам далёкага плавания!

Жыццё ў Крычаве ў першую сусветную вайну рабілася ўсё цяжэйшым. І ўспомніў Меер Гіндзін пра сваяка ў Маскве. Рашыў з яго дапамогай уладкавацца там на працу. У 1916 годзе Гіндзіны выехал і з Крычава. Але ў Маскве з яўрэяў прыпісвалі толькі куп- цоў першай гільдыі. Меер Гіндзін быў бедняком, а такіх Масква не прымала.

З цяжкасцю ўдалося ўладкавацца на жыхарства ў падмаскоўным гарадку Падольску. У рэшце рэшт сям'я Гіндзіных вярнулася ў Крычаў.

Рэвалюцыйныя перамены адкрылі шырокія дарогі дзецям беднякоў. Арон закончыў сярэднюю школу і паступіў у Маскоўскую сельскагаспадарчую акадэмію, на гідратэхнічны факультэт. Студэнт з першых дзён паказаў выдатныя здольнасці. Практыку заўсёды праходзіў на самых буйных гідратэхнічных будоўлях краіны, у тым ліку наДнепрабудзе.

... Таджыкістан, Азербайджан, Грузія - вось тыя месцы, дзе ўзводзіў гідрастанцыі Арон Маркавіч Гіндзін. У кінаэпапеі «Летапіс паўстагоддзя» ёсць кадры часоў даваенных пяцігодак, дзе паказана Храмская гідраэлектрастанцыя ў Грузіі. На іх мы бачым аднаго з кіраўнікоў будоўлі - Арона Гіндзіна. Грузія стала роднай для інжынера. Доўга ён працаваў тут і на працягу многіх гадоў з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета Грузіі.

Аднойчы Арона тэрмінова выклікалі ў Маскву да высокага начальства. Тэта было ў пяцідзесятых гадах. Яму задалі пытанне:

—Што вы скажаце, калі мы прапануем вам пасаду галоўнага інжынера на будаўніцтве Брацкай ГЭС?

Не адразу даў адказ на такую прапанову інжынер. Калі звярнуўся за парадай да жонкі, тая сказала проста: калі ўпэўнены ў сваіх сілах, ехаць можна. Яна Сібіры не спалохаецца.

Гіндзіны прыехалі ў Брацк, пасяліліся ў прыстасаваным доміку. Для іх пачалася новая старонка жыцця. Тэта была найвялікшая і адказная будоўля. Шмат сіл, волі, энергіі каштавала людзям пакарэнне свавольнай і магутнай Ангары.

Міналі тыдні, месяцы. І вось наступіў дзень, калі першы агрэгат быў запушчаны. Неўзабаве Брацкая ГЭС запрацавала на поўную магутнасць. Энергія, народжаная водам! імклівай Ангары, пайшла на заводы і фабрыкі, у гарады і сёлы сярод некалі глухой сібірскай тайгі.

Творчая праца Арона Гіндзіна высока ацэнена. Наш зямляк удастоены звания Героя Сацыялістычнай Працы. Яго інжынернае і арганізатарскае майстэрства, праяўленае пры будаўніцтве Брацкай ГЭС, стала выдатнай школай для многіх гідрабудаўнікоў. Таму імя Арона Гіндзіна сярод лаўрэатаў Ленінскай прэміі.

*М. Ф. Мельнікаў.*

## Металург і вучоны

**БАРЫСАЎ Аляксандр Піліпавіч,** Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, нарадзіўся ў невялікай вёсцы Стараселле. Яна раскінулася ўсцяж балынака, што пралёг ад Крычава да Мсціслава. Да васемнаццаці гадоў Аляксандр працаваў з бацькамі ў сельскай гаспадарцы і вучыўся. У1926 годзе выехаў у Ленінград, каб ажыццявіць сваю мару - стаць горным інжынерам.

Вучоба не была лёгкай. Даводзілася вучыцца і працаваць. Калі выпадалі вольныя ад заняткаў часіны, ішоў на станцыю або ў марскі порт і станавіўся грузчыкам.

У дваццаць тры гады Аляксандр Барысаў атрымаў дыплом інжынера-металурга і накіраванне на Кузнецкі металургічны завод у Сібір. Завод будаваўся, і маладому спецыялісту прыйшлося стаць будаўніком. А калі вытворчыя карпусы ўвашлі ў строй дзеючых, хлопец з Стараселля стаў майстрам доменнага цэха. Ён да ўсяго ўважліва прыглядаўся, сачыў за навінамі тэхнікі, пераймаў вопыт старых металургаў.

Мінула некалькі гадоў. Аляксандр Барысаў узначаліў доменны цэх. Тэта была адказная пасада.

Вялікая Айчынная вайна. Фронт патрабаваў многа металу. На ўліку быў кожны спецыяліст. Даводзілася не толькі варыць сталь, але вучыць і выхоўваць людзей, якія станавіліся на змену тым, хто ішоў на барацьбу з ворагам.

1945 год. Аляксандр Піліпавіч Барысаў назначаецца начальнікам доменнага цэха Магнітагорскага металургічнага камбіната, а праз дзесяць гадоў - дырэктарам гэтага буйнейшага ў свеце металургічнага прадпрыемства.

Потым працаваў намеснікам міністра чорнай металургіі СССР, намеснікам старшыні Дзяржплана і старшыні Саўнаргаса РСФСР, старшыні Чалябінскага і Паўднёва-Уральскага саўнаргасаў. У 1965 годзе Аляксандр Піліпавіч быў прызначаны першым намеснікам міністрачорнай металургіі СССР.

Аляксандр Піліпавіч Барысаў спаўнааддаваў сябе служэнню Радзіме і народу, справе ўмацавання металургічнай індустрыі краіны. Ён двойчы выбіраўся дэлегатам партыйных з’ездаў, а таксама дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР двух скліканняў.

Самаадданая праца нашага земляка ацэнена па заслугах. Аляксандр Піліпавіч Барысаў узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. Яму прысвоена высокае звание Герой Сацыялістычнай Працы. У 1961 годзе за ўдзел у важнейшых навуковых работах у галіне развіцця савецкай металургіі А.П. Барысаву прысвоена таксама званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі.

Такі працоўны шлях нашага земляка Аляксандра Піліпавіча Барысава.

*М.Ф. Мельнікаў.*

## Майстар вогненнай справы

**МАГІЛЁЎЦАЎ Іван Іванавіч** нарадзіўся 17.10.1930 г. у в. Новы Дрокаў Суражскага раёна Бранскай вобласці. Герой Сацыялістычнай Працы (1958). Звание Героя прысвоена за поспехі ў вытворчасці будаўнічых матэрыялаў. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССРу 1963—1967 гг.

Вярнуўся Іван Іванавіч Магілёўцаў з адпачынку і адразу ў цэх завітаў.

Дзень быў пагодлівы, сонечны. Пад промнямі сонца зеленелі сады. Цішыня ў пасёлку. Толькі недзе на Сажы тарахцела маторка ды на чыгуначнай станцыі час ад часу чахкалі паравозы.

Адпачываючы ў Ялце, бывала, затрымліваў позірк на цеплаходзе і ўспамінаў Сож, сяброў, такіх, як і ён, работнікаў Крычаўскага цэментна-шыфернага камбіната. А цяпер тут, на рабочым месца, чамусьці ўспомніліся дзіцячыя гады, калі марыў стаць шахцёрам або лётчыкам. Ды старэйшы брат Павел паклікаў да сябе на цэментны завод, які тады яшчэ толькі будаваўся. З пісьмом брата, быццам з пропускам, упершыню пераступіў парог заводскага цэха - вялікага, шумнага. Тут нібы аглушыла - стаяў нейкі час ў нерашучасці.

—Смялей, браток, не палохайся.

Юнак не адразу зразумеў што звяртаюцца да яго. А калі зразумеў, усміхнуўся. Так адбылося яго першае знаёмства з калектывам цэментнікаў...

А зараз ён ужо ветэран прадпрыемства, персанальны пенсіянер. У кішэні бестэрміновы пропуск на камбінат і пасведчанне машыніста-інструктара.

Упэўненай хадой гаспадара крочыць Іван Іванавіч усцяж 170-метровай печы. Нале «галоўцы», нібы штурман і рулявы на капітанскім мосціку акіянскага лайнера, стаялі двое: за пультам кіравання малады машыніст Анатоль Белавусаў, а за штурвалам мазутных фарсунак - яго памочнік Яўген Жандараў. Абодва - былыя вучні Івана Іванавіча. Магілёўцаў паназіраў за іх дзеяннямі і заспакоена адзначыў: «Малайцы, усё ідзе добра».

Узяў шчыток, зазірнуў унутр печы. Там шугала полымя.

Ветэран накіраваўся на суседні ўчастак.

Рабочыя кожнай брыгады радасна сустракаюць прыход машыніста-інструктара.

— Мне проста пашанцавала, што з першых дзён трапіў вучнем да такога майстра, — гаворыць пра Магілёўцава малады машыніст А. Белавусаў. — Чалавек ён незвычайны. Нястомны працаўнік, выдатны настаўнік, усё раскажа, навучыць, пакажа.

— Ён не баіцца цяжкасцей, можа ўзяць на сябе адказнасць, пайсці дзеля справы на рызыку, вядома, узважаную і абдуманую, — уступае ў размову майстар Віктар Вацура.
— Памятаю, аднойчы абвалілася футароўка ў час абпалу. Мы ўсе разгубіліся, не ведалі, што рабіць, а Магілёўцаў...

Так, быў такі выпадак, Іван Іванавіч не разіубіўся, хоць становішча было складаным. Можна было загасіць печ на суткі, каб астыла, потым устанавіць футароўку і зноў распаліць. Але ж тады непазбежна сарваўся б графік выканання не толькі сутачнага, але і месячнага задания. Як быць? Як пазбегнуць страты часу? Магілёўцаў прыняў рашэнне. Ён гіапрасіў прынесці валёнкі, ватоўку, шапку-вушанку, пачакаў, пакуль спадзе тэмпература да цярпімага ўзроўню, і адважна нырнуў у гарачую печ. Праз нейкі час яго змяніў памочнік, які ўжо бачыў, што і як трэба рабіць. Потым яшчэ раз пайшоў Магілёўцаў.

І не суткі спатрэбіліся на ўхіленне аварыйнай сітуацыі, аўсяго паўтары гадзіны. У печы зноўзагудзела полымя. І тады Іван Іванавіч сказаў маладому машыністу:

—На фронце, браток, траплялі і не ў такое пекла. І заўжды пераможцам выходзіў той, хто не губляўся ў цяжкую хвіліну.

Яго ваенная біяграфія таксами багата на рызыку, няпростыя сітуацыі і рашэнні.

Магілёўцаў удзельнічаў у баях пад Сталінградам, Варонежам, Курскам... Аднойчы на пазіцыю палка, дзе ён быў сувязістам, рухаўся цэлы сталёвы «звярынец» - фашысцкія «тыгры», «пантэры». Вакол усё было ахутана дымам ад разрываў бомб, снарадаў. З каманднага пункта прыбег сувязны. «Магілёўцаў, да камандзіра дывізіі!». Пабег, адрапартаваў аб прыбыцці, а той пытае:

—Чаму гэта гвардыя сагнулася?

—Звычка такая, таварыш палкоўнік. Мы ж сувязісты.

—Трымацца трэба бадзёра, не гнуцца перад небяспекай. Падцягніся, выпрамся і стань ва ўвесь рост.

Гэта была прэлюдыя да загаду - Магілёўцаву неабходна было замяніць загінуўшага камандзіра ўзвода і забяспечыць надзейную сувязь з артылерыяй узаемадзеяння, стралковымі батальёнамі.

Пад безупынным абстрэлам гублялася сувязь, радзелі рады тэлефаністаў. І Магілёўцаву самому давялося адправіцца на ліквідацыю пашкоджання кабеля на небяспечным участку боя.

На шляху трапіўся нямецкі танк. Магілёўцаў не спалохаўся. Спачатку даў аўтаматную чаргу, каб адсекчы пяхоту, потым шпурнуў процітанкавую гранату. «Тыгр» закруціўся на адной гусеніцы, задыміў.

— «Наперад!» — скамандаваў самому сабе Магілёўцаў. Выскачыў з траншэі. Бег, падаў, страляў, ускокваў зноў. А вось і месца парыву кабеля. Толькі цяпер адчуў боль у пальцах. Успомніў што яшчэ ў самым пачатку боя пры артылерыйскім абстрэле аско- лак снарада ўпіўся ў левую руку. Каб злу- чыць канцы перабітага провада, Магілёўцаў сціснуў іх зубамі.

Прыйшоў пасля бою да камандзіра з дакладам, а ён, аказваецца, усё бачыў сам, быў задаволены.

— Не спалохаўся ты, не сагнуўся перад небяспекай. Будзеш так заўжды дзейні- чаць — будзеш пераможцам. Сёння твой учынак забяспечыў поспех палка.

Грудзі Магілёўцава ўпрыгожыла першая ў яго жыцці ўрадавая ўзнагарода - ордэн Чырвонай Зоркі. Другі ордэн Магілёўцаў атрымаў за бітву на Віслe. Ужо ў якасці разведчыка.

75. Зак. 808.

Перад дывізіяй была пастаўлена задача захапіць пераправу, стварыць плацдарм для масавага прарыву абароны праціўніка. Нашаму камандаванню невядомы былі сілы ворага. Узнікла неабходнасць правесці разведку, захапіць «языка».

Трупа смельчакоў пасля ўдалай пераправы нечакана аказалася перад носам праціўніка. Прайсці ціха не ўдалося. Завязаўся бой. Іван Магілёўцаў шгіурнуў на пазіцыю ворага звязку гранат, ускочыў у траншэю і аказаўся літарал ьна на плячах у двух гітлераўцаў. Аднаго аглушыў прыкладам, другога падмяў пад сябе, абяззброіў і вывеў на брусцвер. Палоннага яфрэйтара падхапілі сябры-разведчыкі.

Калі пачалі адыходзіць, каб даставіць «языка» у штаб, немцы апамяталіся, распачалі страляніну з мінамётаў, пайшлі ў контратаку. Але Іван Магілёўцаў ужо заканапаціў прабітыя асколкамі дзіркі ў лодцы і пад прыкрыццем сваіх таварышаў пераправіў немца на другі бераг. Так на грудзях разведчыка заззяў ордэн Славы III ступені. Уручаючы ўзнагароду, камандзір дывізіі спытаў:

—Ну як, гвардыя не гнецца?

—Ніколі, таварыш генерал.

Потым былі крывавыя баі на Одэры, дайшоў да Берліна. Колькі было пройдзена дарог, колькі смерцяў сяброў перажыта, а словы камдыва не забываліся. Яны сталі своеасаблівым дэвізам на ўсё жыццё: не згінацца.

Пасля дэмабілізацыі Магілёўцаў вярнуўся на тую дарогу, адкуль пачынаўся яго працоўны шлях да вайны. Яго прызначылі машыністам вярчальнай печы.

Не ўсё ішло гладка ў цэху абпалу. Печы рэканструявалі, а аддачы, якой чакалі, не было. Быў брак, перарасход паліва. У чым справа? Каля печы завіхаліся інжынеры і тэхнікі, бывалыя машыністы.

Спрабавалі самыя розныя варыянты, абмяркоўвалі шмат усялякіх прапаноў. Падаў голас і Магілёўцаў.

—Усё, мне здаецца, залежыць ад тэмпературы і колькасці паветра, якое падаецца ў печ.

Ён падыйшоў да засланкі вентылятара, перавёў рычаг на адно дзяленне. Агонь у печы гіаярчэў. Браку стала менш, пабольшала паўнацэннага клінкеру. Прайшоў дзень, другі, трэці. Усё складвалася добра.

Яшчэ і яшчэ раз правяраў Магілёўцаў свае разлікі.Паступова павялічваў падачу паліва, уносіў змены ў рэжым паступлення паветра. І неўзабаве зразумеў, што аказаўся на правільным шляху. Іван Іванавіч першым дабіўся перавышэння праектнай магутнасці печы. Але і тэта не задавальняла яго: поспех аднаго мала значыць для цэха, для ўсяго прадпрыемства. Магілёўцаў перадаваў свой вопыт таварышам, выступіў ініцыятарам спаборніцтва за высокую прадукцыйнасць працы на кожным рабочым месцы.

За дасягненне высокіх паказчыкаў у асваенні вытворчых магутнасцей І.І. Магілёўцаву ў 1958 годзе присвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

... Перагортваючы старонку за старонкай своеасаблівую «кнігу памяці», Іван Іванавіч разумеў што яму трапіліся ў жыцці добрыя, зычлівыя людзі: школьныя настаўнікі, майстры вытворчага навучання, армейскія камандзіры. А колькі добрага зрабілі для яго кіраўнікі цэха, старшыя майстры? Асабліва першы яго рабочы настаўнік Карней Пракопавіч Карпаў які па-бацькоўску цёпла і клапатліва вучыў яго сакрэтам абпалу клінкера.

Такія, як Карней Пракопавіч, дапамагалі яму ўзняцца да вяршыні прафесійнага майстэрства. Цяпер жа ён сам вучыць маладых.

Вучыць Іван Іванавіч можа добра, асабліва тых, хто хоча вучыцца Стаpанным і вельмі ўважлівым вучнем аказаўся, напрыклад, Віктар Вацура. Ён разумеў машыніста, хутка вывучыў-апаратуру, тэхналогію абпалу.

Да кожнага навічка ў Магілёўцава свой падыход. Перш за ўсё гэта дабразычлівасць, павага да чалавека, даверлівасць.

Дваццаць вучняў было ў Івана Іванавічц. І ўсе дваццаць сталі майстрамі вогненнай прафесіі. Сярод іх - машыністы вярчальных печаў А.Дз. Гатоўчык, Д.П. Кліменка, А.М. Белавусаў і шмат іншых. У кожнага з іх цяпер свае вучні.

Ведаюць Магілёўцава і ў суседняй Польшчы, дзе ён удзельнічаў у пуску і асваенні цэментных заводаў, перадаваў рабочым сваё майстэрства. Ведаюць у Камянец-Падольску, Ваўкавыску і іншых гарадах.

*Г.А. Баршчэўскі.*

# Настаўніца-гераіня

**МАНІНА Алена Іванаўна,** нарадзілася 10.10.1922 г. у в. Дзягавічы. Герой Сацыялістычнай працы (1968). Звание Героя присвоена за заслугі ў навучанні і выхаванні вучняў.

Малодшая ў сям'і, яна была любіміцай маці, аднак пры гэтым яе залішне не песцілі. Лена з дзяцінства прывыкла да працы і ў многім дапамагала бацькам.

Закончыўшы сямігодку, Алена паступіла ў Мсціслаўскае педагагічнае вучылішча і паспяхова яго закончила. Прызначэнне на работу атрымала ў Мінскую вобласць. Там выйшла замуж за добрага чалавека. Жыць бы ды жыць маладым. Але ў мірнае жыццё ўварвалася вайна.

Вёску, дзе жыла Алена Іванаўна, акупавалі фашисты. Муж Манінай і два яго бра- ты сталі сувязнымі партызан. Тэта было вельмі небяспечна, аднак падполынчыкі менш за ўсё думалі пра сябе. Яны змагаліся з ненавісным ворагам, каб абараніць сваю зямлю, сваіх дзяцей ад чужаземнага рабства.

Бяда прыйшла нечакана. Мужа Алены і яго братоў схапілі гестапаўцы. Хтосьці высачыў, данёс. Яны загінулі ў засценках гестапа, не выдалі партызан.

Каб не стаць ахвярай гестапа, Алена Іванаўна вымушана была пакінуць вёску. Разам



А.Л. Маніна сярод вучняў.

са сваім вучнем, Колем Станкевічам, пайшла да партызан. Пайшла, каб стаць разведчыцай, распаўсюджваць па вёсках лістоўкі. Але гэтага мала здавалася жанчыне. І яна дасканала вывучыла падрыўную справу. Так у партызанскай брыгадзе імя Куйбышава Мінскай вобласці стала адным мінёрам больш.

Алена Маніна часта выходзіла на дыверсіі, з сябрамі падрывала чыгуначнае палатно, мініравала дарогі. У лясах Бабруйшчыны сустрэла Алена Іванаўна наступаючых байцоў Чырвонай арміі.

Пасля вызвалення ад фашыстаў зноў працавала ў школе. А як цяжка было працаваць! Ні школьных будынкаў, ні падручнікаў, ні паперы. Ды ці толькі гэта? Яна, настаўніца, былая партизанка, у першую пасляакупацыйную врсень хадзіла басанож аж да першых замаразкаў.

Вельмі прыцягвала А. Маніну работа з сіротамі, дзецьмі, у якіх вайна адабрала бацькоў. Некаторыя з іх у гады вайны і пасля яе не ведалі нават, што такое мацярынс- кая ласка. Любоў да такіх дзяцей прывяла Алену Іванаўну ў Парэчанскую школу-інтэрнат Гродзенскай вобласці. Тут выхоўвалася шмат дзяцей з фізічнымі і псіхічнымі недахопамі. Нялёгкай была работа педагогаў. Акрамя ведаў па педагогіцы, патрабавалася дасканала ведаць псіхалогію такіх дзяцей, асновы медыцыны. Зноў давялося садзіцца за вучобу. Скончыла Гродзенскі педагагічны інстытут.

Праца сапраўднага педагога заўсёды дае добры плён. Многія яе вучні і цяпер пішуць пісьмы сваёй настаўніцы, дзякуюць за шчодрасць яе душы, патрабавальнасць. А ў маі 1967 года з'ехаліся на сустрэчу былыя выпускнікі школы-інтэрната, некаторыя - з сем'ямі. Колькі хвалюючых сустрэч, успамінаў! Вялікая гэта была радасць для педагога — сустракацца з вучнямі, якіх яна выха- вала, дапамагла знайсці правільную дарогу ў вялікае жыццё! Іх шчаслівыя лёсы-вынік яе штодзённай працы ў сценах школы.

У 1968 годзе Алена Іванаўна Маніна, наша зямлячка, першай з педагогаў Беларусі была ўдастоена высокага звания Героя Сацыялістычнай Працы. Гэты вялікі гонар заслужаны ўсім яе баявым і працоўным жыццём.

*М. Ф. Мельнікаў.*

## Слаўны жыццёвы шлях

**МАРОЗАЎ Міхаіл Васілевіч,** нарадзіўся ў в. Каранед. Герой Сацыялістычнай Працы. Скончыў Данецкі політэхнічны інстытут. Працаваў на шахтах Данбаса.

Міхаіл Васілевіч Марозаў нарадзіўся ў сям'і селяніна. Цяжка жылося мнагадзетнай сям'і. Не хапала абутку і адзення. Не кожны дзень на стале быў хлеб. Аднак дзяцей бацькі імкнуліся вывучыць. Міша Марозаў пайшоў у школу, скончыў сем класаў. Трэба было выбівацца на свой жыццёвы шлях.

У 1930 годзе шаснаццацігадовым юнаком прыехаў Міша ў Данбас. На шахце № 3 «Капітальная» ён быў самым маладым будаўніком.

Мінуў год, і яго пацягнула ў шахту. Стаў вучнем слесара, адначасова паступіў на рабфак. Тут, на рабочим факультэце, вечарамі набываў веды. А пасля, параіўшыся са старэйшымі таварышамі, паступіў у Данецкі політэхнічны інстытут. Вучыўся і працаваў. Разгружаў з вагонаў на станцыі абсталяванне, іншыя грузы, нагружаў вугаль у вагоны. Жыццё ў такім рытме было надзвычай цяжкім, але вучобу не кінуў.

Дыплом горнага інжынера дазволіў Міхаілу Васілевічу Марозаву ўзначаліць горназдабыўны ўчастак на адной з шахт траста «Краснадонвугаль».

Грымнула Айчынная вайна. Міхаіл Васілевіч стаў камандзірам агнявога ўзвода ў артылерыйскім палку. Двойчы артылерысты сумесна з пехацінцамі вялі ўпартыя баі з ворагам за станцыю Лазавую, двойчы вызвалялі яе ад гітлераўцаў. Зацяжныя баі завязаліся за вёску Кіпцеўка. Пераўзыходзячымі сіламі пяхоты і танкаў праціўнік аднойчы атакаваў савецкіх пехацінцаў. Пасля ўпартага бою нашы воіны пачалі адыходзіць. У жывых не засталося ніводнага камандзіра. Тады на дапамогу пехацінцам кінуўся Міхаіл Марозаў і камандзір узвода сувязі артпалка. Яны спынілі байцоў і павялі іх у контратаку. Уварваліся ў вёску, але сіл аказалася мала, каб яе ўтрымаць. Гітлераўцы акружылі смельчакоў. Савецкія байцы мужна адбіваліся ад насядаўшых з усіх бакоў фашыстаў. Калі боепрыпасы скончыліся, пайшлі на прарыў. У гэтым баі Міхаіл Марозаў атрымаў ранение.

Болын Міхаілу Васілевічу ваяваць не давялося. Яго адклікалі з арміі і зноў накіравалі ў Краснадон на шахты. Пазней М.В. Марозаў арганізоўваў здабычу вугалю ў Сярэдняй Азіі.

Ішла вайна. Сярэдняя Азія станавілася галоўнай вугальнай базай Савецкага Саюза. Міхаіл Васілевіч на сваім участку рабіў усё магчымае, каб даць нагара як мага болын каменнага вугалю.

1943 год. Чырвоная армія прагнала фашыстаў з Данбасу. Вызвалены легендарны Краснадон. Тут у дні акупацыі дзейнічала геаічная падпольная маладзёжная арганізацыя «Маладая гвардыя». На Краснадонскія шахты вярнуўся Марозаў галоўным інжынерам траста «Бокавантрацыт». Ён умела арганізоўваў работу шахцёраў. Праз дваццаць гадоў вопытнага інжынера прызначылі ўпраўляючым траста. Тэта было высокае давер'е кадраваму шахцёру. Мільён дзвесце тысяч тон вугалю звыш плана сямігодкі - такі працоўны подзвіг шахцёраў траста.

Партыя і ўрад высока ацанілі працу шахцёраў. Траст быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, каля двухсот яго работнікаў атрымалі ордэны і медалі. Тры з іх, у тым ліку М.В. Марозаў, удастоены звания Героя Сацыялістычнай Працы.

Даючы адказ на пісьмо з музея, М.В. Марозаў напісаў: «Няхай маладыя людзі сённяшняга дня ніколі не адступаюць перад цяжкасцямі і смела працягваюць слаўныя традыцыі. Вучыцца і працаваць, працаваць і вучыцца - гэта галоўнае ў нашым жыцці».

Міхаіл Васілевіч Марозаў узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку», мае тры ступені знака «Шахцёрская слава». Ёсць і баявыя ўзнагароды.

*М.Ф. Мельнікаў.*

## Яму ўдзячны многія будаўнікі

**ЦЫТОВІЧ Мікалай Аляксандравіч** нарадзіўся26.5.1900г.ув. Бель 1-я, вучоныў галіне механікі грунтоў, геамеханікі фундаментабудавання і інжынернай геалогіі. Член-карэспандэнт АН СССР (1943), док- тар тэхнічных навук (1930). Герой Сацыялістычнай працы (1980). Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР (1952).

Скончыў Ленінградскі інстытут грамадзянскіх інжынераў (1927). З 1940 г. прафесар, загадчык кафедры Ленінградскага інжынерна-будаўнічага інстытута, у 1947—1953 гг. старшыня ПрэзідыумаЯкуцкага філіяла АН СССР, з 1952 г. загадчык кафедры Маскоўскага інжынерна-будаўнічага інстытута. Удзельнік і кіраўнік навуковых экспедыцый па вывучэнню месцаў буйнога прамысловага будўніцтва, у тым ліку Беларускага Палесся.

Імя Мікалая Аляксандравіча Цытовіча добра вядома спецыялістам-будаўнікам. Ён займаўся механікай мёрзлых грунтоў, стаў віцэ-прэзідэнтам міжнароднай арганізацыі па механіцы грунтоў.

Вельмі складанай была праблема будаўніцтва ваўмовах Запаляр'я. Будынкі, узведзеныя на вечнай мерзлаце, рушыліся. І вось маладому вучонаму даручылі падрыхтаваць праект будаўніцтва доменнай печы ў Пятроўску-Забайкальскім Чыцінскай вобласці. Былі сотні разлікаў, чарцяжоў. М.А. Цытовіч з пастаўленай задачай справіўся выдатна. Домна была пабудавана і стаяла трывала, хаця была ўзведзена ў зоне вечнай мерзлаты, і ў ніжняй яе частцы тэмпература дасягала амаль паўтары тысячы градусаў.

У канцы першай пяцігодкі, праз 7 год пас- ля ўзвядзення домны, выйшла ў свет першая капітальная навуковая праца М.А. Цы-товіча «Механіка грунтоў». Выкладчыкі і студэнты будаўнічых навучальных устаноў атрымалі першы ў гісторыі краіны падручнік па гэтай праблеме, а будаўнікі - кіраўніцтва да дзеяння. Кніга вельмі дапамагала будаўнікам поўначы, якія ўзводзілі гарады, электрастанцыі. Удзячны былі вучонаму будаўнікі Брацка і Усць-Ілімска, Сургута і Магадана, Вілюйскай ГЭС.

2 чэрвеня 1980 года Мікалаю Аляксандравічу Цытовічу присвоена званне Героя Сацыялістычнай Прады. Яму тады споўнілася 80 год. Праца яго адзначана многімі высокімі ўзнагародамі Радзімы. Першы ордэн Леніна ён атрымаў у 1942 годзе за распрацоўку доўгачасовых абарончых збудаванняў у блакадным Ленінградзе, за кіраўніцтва іх будаўніцтвам. Яшчэ двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «Знак Пашаны», двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і многімі медалямі ўзнагароджаны Мікалай Аляксандравіч.

Яго праца «Механіка грунтоў» шмат разоў перавыдавалася ў СССР, перакладзена на многія замежныя мовы. З многіх краін ішлі ў Маскву станоўчыя водгукі аб работах прафесара М.А. Цытовіча. Выдатнага вучонага помняць выкладчыкі і студэнты Чэхіі і Славакіі, Польнчы, Югаславіі, Румыніі, Канады, Індыі, Англіі, дзе яму даводзілася выступаць з лекцыямі.

М. А. Цытовіч пабываў у нашым горадзе. Ён глыбока цікавіўся гісторыяй нашага краю.

Ён нарадзіўся ў вёсцы Бель-1, за 5 кіламетраў ад нашага горада. У Маляцічах у юнацтве Мікалай Цытовіч працаваў настаўнікам. А на будаўніцтве чыгункі Орша—Горкі—Крычаў—Клімавічы працаваў яго брат Аляксандр, які затым стаў інжынерам і працаваў у Сярэдняй Азіі. Тут нарадзіліся і

яго браты: Пётр, гідрабудаўнік, які загінуў у баях з фашыстамі пад Ленінградам, Іван, інжынер-суднабудаўнік. Чатыры браты - выдатныя інжынеры, патрыёты сваёй Радзімы. Іх маці, Варвара Аляксееўна, была настаўніцай.

Многія інжынеры і вучоныя былі вучнямі М.А. Цытовіча. Ён адкрыў перад імі шлях у навуку, абагаціў ведамі і навыкамі асноў прамысловага будаўніцтва ў цяжкіх умовах вечнай мерзлаты. І калі будзеце вы ў Магнітагорску, Керчы, Днегірагіятроўску - ведайце, што металургічныя камбінаты і ў гэтых, і іншых гарадах стаяць на трывалых падмурках, пабудаваных пры актыўным удзеле тэарэтыка і практыка, члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР М.А. Цытовіча, які ўзначальваў кафедру механікі грунтоў, асноў і падмеркаў МІБІ імя В.В. Куйбышава ў Маскве.

М.А. Цытовіч пісаў нам: «Шчыра жадаю я сваім землякам-беларусам вялікіх поспехаў у працы, навуцы і жыцці, а ў мяне назаўсёды застанецца самы светлы ўспамін аб сумленным, працавітым народзе Беларусі, пра мае дзіцячыя гады, праведзеныя недалёка ад Крычава ў вёсцы Бель»...

*М.Ф. Мельнікаў.*

## Яны ўзнагароджаны

### ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

**АНІСАВА Феня Сцяпанаўна,** звеннявая па вырошчванні кукурузы калгаса «Іскра».

**БЛІННІКАЎ Сямён Мацвеевіч,** начальнік участка пуці.

**БЯЗБАБІЧ Іван Рыгоравіч,** машыніст паравознага дэпо.



І.Р. Бязбабіч сярод піянераў, 1967 г.

**ВАСЬКІН Віктар Міхайлавіч,** трактарыст калгаса «Перамога».
**ВАРАБ'ЁЎ Якаў Васілевіч,** трактарыст саўгаса «Крычаўскі».
**ВОЛКАЎ Кузьма Акімавіч,** машыніст паравознага дэпо.




Ц.І. Жарыкаў. І.І. Кашанскі.




А.Ц Карнеева. К.М. Кіявіцкая



М.С. Курцікаў.

**ГАЛУЗАЎладзімір Аляксеевіч,** дырэктар цэментна-шыфернага камбіната.
**ГРЫПА Віктар Спірыдонавіч,** дарожны майстар Крычаўскай дыстанцыі пуці.
**ДЗЯНІСАЎ Аляксандр Макаравіч,** начальнік дэпо.
**ЖАРЫКАЎ Цімафей Іванавіч,** бры- гадзір калгаса «Памяць Леніна».
**ЗОНТАЎ Мікалай Яфрэмавіч,** ма- шыніст цэментных млыноў цэментна-шыфернага камбіната.
**ІВАНЕНКА Кліменцій Ціханавіч,** намеснік начальніка дыстанцыі пуці.
**ІСКАРОЎ Мікалай Еўдакімавіч,** брыгадзір клейшчыц завода гумава-тэхнічных вырабаў.
**КАПІАНСКІ Іван Іванавіч,** камбайнер калгаса імя Карла Маркса.
**КАРНЕЕВА Алена Цімафееўна,** брыгадзір клейшчыц завода гумава-тэхнічных вырабаў.
**КІЯВЩКАЯ Капіталіна Мікалаеўна,дырэктар СШ № 3.**
**КУРЦІКАЎ Міхаіл Сямёнавіч,** дырэктар СШ№ 1.
**ЛАБУШКІН Сяргей Фёдаравіч,** трактарыст калгаса імя XXII з'езда КПСС.
**НІКАЛАЕВА Аксіння Рыгораўна,** на- стаўніца СШ № 1.
**ПАДЛЯГАЕЎ Мітрафан Максімавіч,** мащыніст паравознага дэпо.
**СКАРАХОДАВА Ніна Паўлаўна,** фельчар здраўпункта Крычаўскага завода гумавых вырабаў імя 50-годдзя БССР.

## ЗАСЛУЖАНЫ ЮРЫСТ

**ПАСТРЭВІЧ Іван Пракопавіч** (гл. раздзел «Генералы»),

## ЗАСЛУЖАНЫ ДЗЕЯЧ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

**КРЫВАНОСАЎ Міхаіл Пятровіч,** н. 1.5.1929 г. у г. Крычаў. Беларускі спартсмен і трэнер па лёгкай атлетыцы (кіданне молата). Заслужаны майстар спорту СССР (1954). Заслужаны трэнер БССР (1965), заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР (1971). Кандыдат педагагічных навук (1971). Скончыў Беларускі інстытут фізічнай культуры (1953). З 1976 г. прарэктар па навучальнай рабоце Беларускага інстытута фізічнай культуры. Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў (1956, Мельбурн, Аўстралія). Чэмпіён Еўропы (1954, Берн). Сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы (1958, Стакгольм). Чэмпіён СССР (1952, 1954–58). Аўтар навучальных дапаможнікаў па лёгкай атлетыцы.

М.П. Крываносаў



**ЛАЎРЫНЕНКА Наталля Пятроўна,** нарадзілася ў 1978 г. у г. Крычаў. Чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь 1995–2000 гг. у складзе васьмёркі па грэблі. Бронзавая прызёрка Алімпійскіх гульняў у Атланце 1996 г. Заслужат майстар спорту Рэспублікі Беларусь па грэблі.

# Яны нарадзіліся на Крычаўшчыне

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ ДЗЕЯЧЫ

**КІСЯЛЁЎ Кузьма Венядзіктавіч,** нарадзіўся 1.11.1903 г. у в. Лабковічы. Дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат. Кандыдат медыцынскіх навук (1936). Скончыў Варонежскі універсітэт (1928). З 1928 г. на навуковай рабоце. З 1937 г. нарком аховы здароўя БССР. У 1938–1940 гг. старшыня Савета народных камісараў БССР. З 1940 г. намеснік дырэктара Інстытута эксперыментальнай медыцыны, дырэктар дзяржаўнага медыцынскага выдавецтва (Масква), старшыня Ульянаўскага аблвыканкома. З снежня 1943 г. 1-ы намеснік старшыні СНК БССР, з сакавіка 1944 г. намеснік старшыні СНК БССР (да 1958) і міністр замежных спраў БССР. У 1966–1977 гг. саветнік СМ БССР. Член бюро ЦК КПБ у 1938–1940 гг., 1947–1949 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1937–1958 гг., Вярхоўнага Савета БССР у 1938–1967 гг.

Памёр 4.5.1977.

**МЯШКОЎ Мікалай Максімавіч,** н. 11.5.1922 г. у г. Крычаў. Дзяржаўны дзеяч БССР. Кандыдат гістарычных навук (1953), прафесар (1969). Скончыў БДУ (1949), Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1953). Удзельнік Айчыннай вайны. З 1942 г. на грамадскай і партыйнай рабоце ў Таджыкістане. З 1953 г. намеснік дырэктара, дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, загадчык аддзела навукі, навучальных устаноў і школ ЦК КПБ, дырэктар Мінскай вышэйшай партыйнай школы. З 1958 г. міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага савета БССР, членам ЦК КПБ. Узнагароджаны ордэнамі і медалямі СССР.



Н.П. Лаўрыненка.



М.М. Мяшкоў.

## ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЙ

**АЛЯКСЕЕНКА Міхаіл Міхайлавіч,** нарадзіўся 16.10.1949 г. у вёсцы Дарагая. Скончыў Бацьвінаўскую сярэднюю школу, Мсціслаўскае СПТВ. Працаваў трактарыстам у калгасе «Памяць Леніна», звеннявым па вырошчванню льну. За самаадданую працу яму была прысуджана ў 1978 г. Дзяржаўная прэмія СССР.

**ЛАБУШКІН Сяргей Фёдаравіч,** нарадзіўся 10.05.1930 г. у вёсцы Бель 1-я. Вучыўся ў Бельскай няпоўнай сярэдняй школе. З 1944 г. палявод у мясцовым калгасе. У 1946 г. скончыў курсы механізатараў пры Крычаўскай МТС, стаў працаваць трактарыстам у калгасе імя XXII з’езда КПСС, потым узначаліў механізаванае звяно па вырошчванню льну.

За выдатныя паказчыкі ў працы двойчы ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973, 1982), ордэнам Леніна (1986). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1978).



М.М. Аляксеенка.



С.Ф. Лабушкін.

## НАВУКОЎЦЫ, ТВОРЦЫ

**АНЦІПЕНКА Лявон (Леанід Міхайлавіч),** нарадзіўся 25.01.1935 у в. Ціцькаў. Закончыў Бацьвінаўскую СШ (1953), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага – гісторыка-філалагічны факультэт (1959). Потым тры гады працаваў дырэктарам Ракашыцкай школы Уздзенскага р-на. З 1963 г. – літаратурны супрацоўнік, загадчык сельгасаддзела шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт». З 1965 г. працуе намеснікам рэдактара, з 1975 г. – рэдактарам гэтай жа газеты. Жыве ў Шклове. Член СЖ РБ.

Першыя свае байкі надрукаваў у чэрыкаўскай раённай газеце (20 мая 1954 «Мядзведзь і самакрытыка»). Потым яго байкі, сатырычныя і лірычныя вершы, пародыі, апавяданні друкаваліся ў газетах «Магілёўская праўда», «Звязда», «ЛіМ», «Чырвоная змена», у часопісах «Вожык», «Полымя», «Беларусь» і іншых перыядычных выданнях. Сааўтар калектыўных зборнікаў «Вожык» у дарозе» (1966), «Беларуская байка» (1986), «Асцюкі за каўняром» (1989), «Ранішняя дарога» (1990) і інш. Выдаў зборнік вершаў, эпіграм і пародый «За лугамі, за ракою» (1994).

**Мядзведзь і самакрытыка**
(Байка)

У гушчары
Сабраліся звяры.
Як наступіла цішыня на зборы,
Мядзведзь сказаў: – Сябры мае,
Зайцы мне скардзіліся ўчора –
Ім Воўк праходу не дае.
Ён крыўдзіць іх на кожным кроку,
Няма спакою ім – бяда!
Я так мяркую: зараз Воўку
Дадзім мы слова, грамада,
Няхай сябе пакрытыкуе наймацней,
Каб самакрытыка яго прабрала да касцей.

...І ў гушчары
Аж да зары
Ваўчуга кляўся,
Зайцоў не крыўдзіць даў зарок.
Назаўтра ж зноў сваім заняўся –
Ваўком застаўся Воўк.

Кіраўнікоў я ведаю такіх,
Што не прымаюць мер крутых
Да тых,
Што у грахах клянуцца,
А выпраўляць іх – не імкнуцца.

**БУГАЁЎ Дзмітрый Якаўлевіч,** нарадзіўся 12.1.1929 г. у в. Сычык. Беларускі крытык і літаратуразнавец. Член саюза беларускіх пісьменнікаў. Кандыдат філалагічных навук (1960). Прафесар (1987). Скончыў Магілёўскі педагагічны інстытут (1952). Пасля вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1952–1955), выкладаў беларускую літаратуру ў Мазырскім педагагічным інстытуце (1955–1959), з'яўляўся навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Я. Купалы Акадэміі навук БССР (1959–1964). З 1964 г. працуе ў Белдзяржуніверсітэце. Выйшлі кнігі: «Шчодрае сэрца пісьменніка» (1963), «Паэзія МаксімаТанка» (1964, 2-е выданне 2003), «Уладзімір Дубоўка» (1965), «Максім Гарэцкі (1968, 2-евыданне 2003), «Шматграннасць» (1970), «Талент і праца» (1979), «Праўда і мужнасць таленту» (1995), «Спавядальнае слова» (2001) інш., аўтабіяграфія «Жыццём ідучы...» (1995). Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа ў 1984 г. за кнігу крытычных нарысаў «Талент і праца».

### Згадваючы бацьку...

Мой бацька быў звычайным селянінам, зусім непісьменным. Але ў афіцыйных паперах яго называлі, як якога-небудзь цара, Бугаёў Якаў Якімавіч Першы. У іх сям'і былі яшчэ Іван, Куліна і Яшка. Так звалі ў побыце самага малодшага з сыноў майго дзеда па бацькавай лініі. Але па дакументах Яшка таксама ішоў як Якаў Якімавіч, але ўжо не Першы, а Другі. Два ж Якавы ў адной сям'і атрымалася таму, што імя давалі тады строга па царкоўным календары. Дык Якаў воляю лёсу дастаўся і майму бацьку, і ягонаму брату.



Рыгор Барадулін, Васіль Быкаў, Дзмітрый Бугаёў.

78. Зак. 808.

Дарэчы сказаць, Яшка, хоць, па прызнанні вяскоўцаў, ён быў самым недалёкім з братоў, адзін уцалеў пры бальшавіцкіх рэпрэсіях і памёр ужо зусім старым і нямоглым на руках у сваіх сямейнікаў.

Вельмі нялёгкая доля выпала і бацькавай сястры Куліне, казалі, надта падобнай наяго. Гэтая сардэчная, надзвычай спагадлівая жанчына (па мужу яна стала Логінавай) у цяжкія часы часта адведвала нас, хоць жыла далекавата – у вёсцы Гарадок, размешчанай кіламетраў за дзесяць ад нашых мясцін. Куліна заўсёды прыносіла кожнаму з малых пляменнікаў, якія сталі бязбацькавічамі, нейкі гасцінец – цукерку, пернік (тады ў вёсках тэта было рэдкасцю), колькі яблыкаў і вельмі смачных ігруш-дуляў. Мне асабліва запомніліся вялікія, падобныя на мужчынскія, рукі цёткі Куліны, амаль заўсёды чырвоныя ад пастаяннага працоўнага напружання.

Але вярнуся да Яшкі. Яго я добра ведаў у розныя часы, а таму магу ўпэўнена сцвярджаць, што пры ўсёй праставатасці хітраваць



А.А. Бугаёва.

і прыстасоўвацца ён умеў. Відаць, якраз гэтага ўменння неставала ні майму бацьку, ні яго брату Івану, які таксама быў рэпрэсаваны і згінуў недзе ў гулагаўскіх нетрах.

Абставіны склаліся так, што свайго бацьку я ведаў мала, ва ўсякім разе, далёка не так, як таго Яшку. І дакладныя даты, звязаныя з бацькам, узяў не з памяці, а з судовай справы, якая захоўваецца ў Магілёўскай абласной пракуратуры. Пазнаёміцца з гэтай справай я атрымаў магчымасць толькі ў 1994 годзе. Там я вычытаў, што нарадзіўся бацька ў 1885 годзе. Дзень і месяц нараджэння мне невядомы і цяпер. Але дакладна ведаю, што нарадзіўся ён у вёсцы Губіншчына. У даваенныя гады (маю на ўвазе вайну Айчынную) яна належала да Горкаўскага сельсавета Чэрыкаўскага раёна. У перыяд хрушчоўскіх перакройванняў, калі Чэрыкаўскі раён далучаўся да Крычаўскага, Горкаўскі сельсаветзліваўся з суседнім Бацьвінаўскім, ужо на Крычаўшчыне. З цягам часу Чэрыкаўскі раён быў адноўлены, але сельсавет у Горках не аднавілі. Таму і Губіншчына засталася ў Крычаўскім раёне.

Некалі гэта была вялікая вёска. Адным сваім канцом яна выходзіла да маляўнічай і паўнаводнай тады ракі Воўчас (прыток Сажа). Старая Губіншчына адчувала перанаселенасць. Калі здараўся пажар, дык ён вынішчаў у губіншчанцаў не адну хату і гаспадарку. Аднойчы гарэў і набытак маіх бацькоў. Я сам гэтага не памятаю (мусіць, тое было яшчэ да майго з'яўлення на свет), але ведаю пра тую бяду з матчыных успамінаў.

У 20-я гады мінулага стагоддзя мясцовыя ўлады ў адпаведнасці з агульнай бальшавіцкай палітыкай заахвочвалі стварэнне хутароў і пасёлкаў. Сталі падавацца на болын вольны прастор і многія губіншчанцы. Так узніклі пасёлкі Асінаўка, Падабак, Ліпкі, Майскі, Чырвоны, Сычык і іншыя. Усе яны ствараліся перасяленцамі і Губіншчыны, а сама яна паступова страчвала сваю прэстыжнасць, якая патроху, але няўхільна пераходзіла да Сычыка. І ўрэшце ён перарос у вёску на пяцьдзесят з лішнім двароў, бо стаў цэнтрам калгаса. Пасля Айчыннай вайны там ужо быў і магазін, у які прыходзілі і жыхары старой Губіншчыны, бо свайго магазіна (лаўкі) у іх не стала. Пасля Чарнобыльскага

выбуху і Губіншчына, і Сычык, і ўся Чэрыкаўшчына, як і болынасць раёнаў Магілёўшчыны, сталі зонай экалагічнага бедства, пра што я ведаю больш з гаворак сваякоў ды нешматлікіх знаёмых, якія дажываюць свой век у пакутах, бо ў родных мясцінах нахапаліся радыяцыі.

Жыццё маіх бацькоў памятаецца мне не па Губіншчыне, у якой я нарадзіўся, а па невялікім пасёлку Быкоўка. Увогуле, у маім пашпарце і ў біяграфічных даведках, якія змяшчаліся ў друку, пазначана, што я паявіўся на свет у вёсцы Сычык. Маці ж казала (так запісана і ў маіх метрыках, выдадзеных у 1936 годзе), што я нарадзіўся ў вёсцы Губіншчына. Мая дзіцячая памяць ніякіх уражанняў ад Губіншчыны не захавала. І гэта не выпадкова – бацькі пакінулі Губіншчыну ў хуткім часе пасля майго нараджэння. Разам з сем'ямі япічэ пяцярых губіншчанцаў яны ў тым жа 1929 годзе стварылі пасёлак Быкоўку, якая праіснавала толькі адно дзесяцігоддзе. У 1939 ці 1940 годзе пасёлак быў ліквідаваны, а яго жыхароў перасялілі ў вёску Сычык.

Пасёлак Быкоўка быў размешчаны каля маляўнічага балота, у якім яшчэ і на маёй памяці вадзіліся качкі, кулікі (у нас іх называл! дзікімі баранамі), зрэдку пракідаліся журавіны. Побач быў добры лес. У ім раскашавалі магутныя дубы і вельмі прыгожыя клёны, якія давалі дужа смачны сок – кляновік. Гэтыя дрэвы падыходзілі да самых хат, а ў Яшкі раслі і на двары. (Ягонае селішча было крайнім ад лесу). Памятаю таксама тоўстыя бярозы, ад якіх ранняй вясной набіралі поўныя вёдры бярозавіку. Восенню чырванелі вялікімі гронкамі ладныя рабіны. У розныя поры года радаваў вока гаманлівы асіннік, вусцішна шумеў пры ветраным надвор'і змрочны ельнік. Мясціны былі багатыя на грыбы, у тым ліку на баравікі. На сонечных прагалах расло шмат суніц.

Пазней усё гэта знікла. Бо лес бязлітасна вынішчылі. Спрабавалі асушаць і балота. Ваду спусцілі ў лагчыну пад назвай Яросвін. Але ўрадлівага поля на месцы былой балотнай раскошы чамусьці не атрымалася. Нават добрая трава там не хацела расці. Буяла толькі грубая асака, якую не жадалі есці ні коні, ні каровы, ні авечкі. Скошаная, гадзілася яна толькі на подсціл жывёле ды зрэдку ішла на сечку, калі з нармальным сенам станавілася тугавата.

У Быкоўцы, яшчэ не спаган «най людской прагнасцю, і прайшло маё дзяцінства, шчодрае толькі на ўражанні ад прыроднага хараства навакольных мясцін, якое, мусіць, заўсёды будзе хваляваць жывую чалавечую душу.

Засмучала ў гэтых адносінах , здаецца, толькі адно – што ў бацькі не было сапраўднага саду. Думаю, што ён з мужыцкай практычнасцю бярог зямлю і на прысядзібным пляцы для больш рацыянальных патрэб – для бульбы, канопляў і, вядома, гародніны.

Каля самай хаты і гаспадарчых пабудоў ды каля плоту, якім адгароджвалася сядзіба ад дарогі праз пасёлак, расло некалькі вялікіх і вельмі ўраджайных кустоў іргі (яе часам завуць беларускім вінаградам), радавалі вока шэраг сліў і тры моцныя ігрушы-паўдзічкі, надта прыгожыя ў шчодрай квецені вясною. Яны таксама кожнае лета давалі багата пладоў, якія станавіліся прыдатнымі для яды пасля дорбрай лёжкі. А яшчэ іх можна было сушыць, што маці заўсёды і рабіла. Сялянская печ для гэтага вельмі падыходзіла. Зімою тыя сушаныя грушы былі ці не найболыпымі нашымі прысмакамі.

3 Быкоўкі нам, аднак, давялося пераязджаць.

Загад аб перасяленні маці ўспрыняла як вестку пра вялікую бяду і не адзін раз паўтарала, што ўсяго два перасяленні роўныя пажару. Трэбы ж было перацягваць на новае месца і знізу падгнілую хату, і таксама не новыя гаспадарчыя пабудовы. Ды і зямля на новым месцы няўгноеная. Колькі гадоў яна будзе радзіць слаба. А самае галоўнае, што ўвесь цяжар перасялення клаўся на матчыны плечы, бо ў нас тады ўжо не было бацькі.

Не захавалася ў нас ад яго самога і якіх-небудзь дакументаў. Нават ягонай фотакарткі не было і ў даваенныя гады. Маці казала, што быў ён светлавалосы. Сама яна ў маладосці мела чарнявае аблічча. 3 дзяцей да сталага ўзросту дажыло шасцёра (цяпер засталіся толькі я ды адзіная ў нас сястра Лена). Бацькаву знешнасць атрымалі зноў жа я ды старэйшы за мяне брат 1923 года

нараджэння Іван. Астатнія чацвёра пайшлі па маці.

Але ў пэўным сэнсе мы ўсе раслі і выбіваліся ў людзі як матчыны, Гапкіны, калі казаць зусім дакладна, дзеці. Гапкай вяскоўцы называлі нашу маці, якая і ў маіх метрыках, выдадзеных для паступлення ў школу ў 1936 годзе, запісана як Бугаёва Гапка Антонаўна. Афіцыйнае ж імя – Агаф'я. Яна нарадзілася ў 1889 годзе, памерла ў 1967-м. такім чынам, яна пражыла 78 гадоў, зведаўшы цяжкасці неймаверныя.

Вядома, сам час, які выпаў на яе долю, аказаўся вельмі скрушлівым, поўным вялікіх грамадскіх катаклізмаў. Але гэта бяда агульная. Для маёй маці яе шматразова ўзмацніў горкі бацькаў лёс.

Але спачатку і ён нічога благога не прадвяшчаў. Бацька ўдзельнічаў у першай сусветнай вайне, вярнуўся з яе жывым (ніякіх канкрэтных падрабязнасцей пра яго ўдзел у той вайне не ведаю).

Як і абсалютная большасць сялянства, мой бацька да калектывізацыі паставіўся насцярожана. Але ўсё ж у 1931 годзе ў калгас уступіў. Настаяла маці, якая лепш за бацьку разумела, што іншага выйсця няма.

19 красавіка 1933 года бацьку арыштавалі, паставіўшы маці ў становішча жахлівае. На яе руках заставалася куча дзяцей. І ўсе, за выключэннем самага старэйшага сына, малалеткі. Івану было дзесяць гадоў, Мішу, які загіне на фронце ў Айчынную вайну, – сем, мне – чатыры, Лене – адзін год. А небарака Аляксей увогуле яшчэ ляжаў у калысцы, бо нарадзіўся ў тым жа 1933 годзе, незадоўга да арышту бацькі.

Страшна такое ўспамінаць, але маці пад старасць казала, што ад роспачы яе адольвала спакуса прыдушыць апошняга сына, паклаўшы яму падушку на галаву. Ды кожны раз перамагала боязь узяць на душу непапраўны грэх. А хіба ж яна, наша вялікая гаротніца, не любіла сваіх дзяцей? Яшчэ як любіла! Яна маладая выйшла замуж, доўга чакала першынца, потым некалькі хлопцаў і дзяўчатак пахавала (часта згадвала іх у сваіх малітвах), а ўжо тых, што выжылі, старалася ўсяляк берагчы. І раптам такая навала, якая магла раздушыць каго хочаш. А потым беды сыпаліся адна за другой, як з рога. Дык ці трэба дзівіцца, што неаднойчы ўзнікала і думка пра самагубства, ды маці яе адганяла, зноў жа баючыся граху перад Богам.

Тыя, што арыштоўвалі невінаватага чалавека, асуджаючы на пакуты яго сям'ю, Бога не баяліся. Яны выслалі бацьку на пяць гадоў «за агитацию и вредительство в колхозе». Гэта цытата з бацькавай судовай справы, той, што захоўваецца ў магілёўскай абласной пракуратуры.

Пра тое, у чым заключалася шкодніцтва і якую канкрэтна агітацыю праводзіў непісьменны чалавек, у судовай справе нічога не гаворыцца. Але маці была пераканана, што яго пагубіў уласны жарабок, набыты незадоўга да калектывізацыі, як быццам лепшы ва ўсім наваколлі. Бацька вельмі ганарыўся ім, не хацеў аддаваць у калгас, але мусіў гэта зрабіць. Відаць, ён увогуле захапляўся коньмі, бо ў калгасе атрымаў пасаду конюха. «Свайго» жарабка ён, сцвярджалі самыя пільныя зайздроснікі, даглядаў лепш, чым іншых калгасных коней. У гэтым і было ўсё шкодніцтва.

Пакаранне бацька адбываў у Дзмітраўскім ВПЛ. Разам са сваім братам Іванам, які ў судовай справе памылкова названы пляменнікам, будавалі яны канал Масква – Волга.

27 чэрвеня 1936 года пастановай Асобай нарады НКУС прысуд у дачыненні да бацькі быў перагледжаны. Тэрмін высылкі яму зменшылі «до отбытого срока». Так бацька апынуўся на волі.

Я добра памятаю, як аднойчы пахмурным летнім ранкам, які адразу зрабіўся для нас святочным, ён прыйшоў дамоў. Мы не маглі нацешыцца ад усведамлення, што цяпер і ў нас ёсць бацька. Цэлы дзень (і можа не адзін) ішлі людзі, вялі з бацькам доўгія гамонкі. З тых гамонак мне запомніліся словы пра канал і яшчэ пра тое, што бацьку вызваліў Галадзед, які, як вядома, у той час яшчэ ўзначальваў беларускі ўрад. Як удалося выйсці на Галадзеда, я не ведаю. Не памятаю і таго, ці ўпамінаў бацька ягоную пасаду. Але само гэтае прозвішча засела ў маёй памяці назаўсёды.

Святочны настрой, прынамсі для мяне, трымаўся, аднак, нядоўга. У хуткім часе бацька зноў стаў дагладаць калгасных коней.

Мясцовыя кіраўнікі не пабаяліся яшчэ раз даручыць такую справу «шкодніку». Відаць, добра ведалі сапраўдную цану тым абвінавачванням... . ;

Догляд у летнюю пару заключаўся галоўным чынам у тым, што коней трэба было пасвіць. Статак быў даволі вялікі. І бацька ў якасці свайго памочніка ўзяў мяне. Тады мне было ўжо сем гадоў. А па вясковых звычках гэта самы час падключацца да сур'ёзнага занятку. Але падпасак з мяне атрымаўся далёка не ідэальны. Залюбаваўшыся якой-небудзь прыроднай з'явай, я мог не заўважыць, як найбольш збродлівы конь падаваўся ў шкоду. За такія міжвольныя прамашкі і ўвогуле за любую нядбаласць бацька караў жорстка, без скідкі на дзіцячы ўзрост і маю прыроджаную ўражлівасць. Сырамятная пуга, разлічаная на тоўстую конскую скуру, хадзіла па маіх голых лытках так, што я не аднойчы з крыўдай думаў: «А навошта нам такі бацька?» Спрабаваў скардзіцца маці, тая ўшчувала бацьку, але ён ад свайго не адступаўся. Мабыць, у гэтым праяўлялася не толькі сялянская натура, нязвыклая да сентыментальнасці, але і суровая жыццёвая школа, пройдзеная ў заняволенні.

Які не быў бацька строгі, але жыццё з яго прыходам палепшылася. У вельмі ўраджайным 1937 годзе мы атрымалі з калгаса на працадні шмат збожжа (адзін раз на маёй памяці). Яно дасушвалася ў нас на печы. Дык я добра памятаю тое багацце. Аднак бацьку спажываць зроблены ў асноўным ім самім хлеб не давялося – яго зноў арыштавалі. На гэты раз, як сведчыць судовая справа, 1 верасня 1937 года.

Арыштоўваць прыйшоў раніцай міліцыянер у форме. Бацькі дома не было. Ён быў пры конях і яшчэ не вярнуўся з начлегу. Знайсці месца начнога выпасу калгаснай жывёлы ў ладных лясных абшарах узяўся Маскалёў Іван. Ён, напэўна, мог бы па-суседску сказаць бацьку пра небяспеку і тым самым дапамагчы яму неяк уратавацца, але не зрабіў гэтага, а здаў міліцыянеру.

І бацьку свайго мы больш не ўбачылі. А ратунак быў, здаецца, рэальнай справай. Ва ўсякім разе, людзі, якія падлягалі арышту, але перахаваліся ў час таго «хапуна», потым адкрыта жылі дома. І іх ужо не чапалі.

А можа, бацька сам не захацеў хавацца, усё яшчэ верыў у нейкую справядлівасць? Гэткая думка ўзнікла, калі я прыгадаў, што маці, як бы прадчуваючы нешта нядобрае, раіла бацьку ў хуткім часе пасля вяртанйя з Дзмітраўскага лагера не ісці ў калгас, а з'ехаць некуды, хоць бы і ў Крычаў, напрыклад, на цэментны завод – там заўсёды патрэбны былі рабочыя рукі. Але бацька адмовіўся. Ён некалі быў вельмі моцным чалавекам, калі меркаваць хоць бы па сундучку, які служыў яму ў высылцы замест чамада- на і застаўся ў нас пасля паўторнага арышту. Той сундучок, зроблены не з фанеры, а з танкаватых дошак, і пусты важыў нямала. А бацька ж насіў яго не пустым. Ён хаваў там усе свае «зэкаўскія» набыткі. Відаць, шмат здароўя адабраў канал. Во я і сам чуў, як бацька ноччу цішком скардзіўся маці, што ў яго пачынаюць пухнуць ногі...

А можа, спрацавала славутая беларуская талерантнасць, якая на практыцы вельмі часта ператвараецца ў абыякавасць да ўласнага лёсу?

Увогуле, бацькава справа выклікае цэлы шэраг пытанняў. Пачну з таго, што ордэр на арышт быў выдадзены чэрыкаўскімі ўладамі яшчэ вясною, у красавіку месяцы. А сам арышт, як я ўжо казаў адбыўся 1 верасня. Значыць, некалькі месяцаў міліцыя дабіралася з Чэрыкава да Быкоўкі. А гэта ўсяго нейкіх 18 кіламетраў... Чаму так доўга цягнулі з арыштам? Нехта спрабаваў да апошняга моманта ратаваць бацьку? А можа ўлічвалі, што ў калгасе вясною шмат працы, дык з-за гэтага знарок не спяшаліся арыштоўваць? Ці вельмі вялікая нагрузка была на карныя органы?..

Судзіла бацьку ў 1937 годзе тройка НКУС БССР у складзе ... двух чалавек. 5 лістапада яна прызнала, што бацька быў кулаком, выступаў «против мероприятий партии и правительства», і пастанавіла: «заключить в исправительный лагерь сроком на десять лет».

Тэрмін вылічаўся з 1 верасня, г. зн. з дня арышту.

Ужо ў той дзень (1.9.37) бацька быў дастаўлены ў магілёўскую турму. У віну яму зноў ставілі контррэвалюцыйную агітацыю, маўляў, гаварыў што ў калгасе працуюць

толысі дурні, сам працаваў, але заявы ў калгас не падаваў, сцвярджаў, што хутка будзе вайна і савецкая сістэма разваліцца, заклікаў не падпісвацца на абаронную пазыку. Гэта запісвалася са слоў крывадушных сведкаў.

У адзіным пратаколе допыту, які адбыўся 6 і 7 лістапада, рабіўся закід, нібыта яшчэ да калектывізацыі ён, Бугаёў Якаў, трымаў парабкаў. Непісьменны селянін добра зразумеў, куды хіліць такі закід, і запярэчыў, што быў толькі адзін парабак на час сезонных работ і не ў яго самога, а ў ягонага бацькі.

На абвінавачванне, што «умышленно выводил колхозных коней из строя зимой 1936 г.», бацька зноў запярэчыў: «верно, работал на лесовозе, но коней колхозных из строя не выводил».

Нашы сяляне сапраўды кожную зіму мусілі выконваць цяжкую павіннасць: некалькі тыдняў цягаць з Васілеўшчыны да сплаўных пунктаў на Сажы будаўнічы лес, які ішоў у розныя куткі краіны, у тым ліку ў Данбас. Называлася гэта ехаць у калоды, бо там, на лесавывазцы, сяляне ўвесь тэты час і жылі, адарваныя ад сем'яў. Здаралася, што і гінулі. А цяпер гэтае шчыраванне на дзяржаву паварочвалі як абвінавачванне!

Ды бацька прызнаў сябе вінаватым толькі ў тым, што ў 1933 годзе быў «судим по подозрению в агитации».

Прачытаўшы гэтыя радкі пратакола, запісаныя са слоў непісьменнага бацькі, я ажно сцепануўся: такая мужнасць і непахіснасць ужо ў 1937 годзе! Нездарма адзін наш вясковец пасля смерці Сталіна і, вядома, без сведкаў, казаў, што бацька быў не толькі вельмі працавіты, але і надта сумленны, справядлівы чалавек. Гэты вясковец – Кастусь Палякоў.

Вяртаючыся да бацькавай судовай справы, не магу не сказаць, што 16 снежня 1940 года яна пераглядалася. Людзі, якія ажыццяўлялі гэты пераглад, ніякіх няўвязак у ёй не ўбачылі. І вырашылі «жалобу оставить без удовлетворения».

Такая фенаменальная слепататагачасных юрыстаў выпадковай быць не магла. Яна, відаць, азначала, што бацькі тады ўжо не было на гэтым свеце. Ягоны прысуд на дзесяць гадоў лагернага зняволення ці не суправаджаўся не зафіксаваным на паперы дадаткам – «без права переписки», якім тады па-фарысейску камуфліраваўся расстрэл?.. Ва ўсякім разе, мы ніякіх звестак ад свайго бацькі пасля другога прысуду ўжо не мелі. А пасля першага арышту і высылкі лісты, як казала маці, вельмі рэдка, але прыходзілі.

І яшчэ адно пытанне ўзнікае. Якая скарга разглядалася ў 1940 годзе? Хто тады мог скардзіцца на «самы справядлівы ў свеце савецкі суд»? Гэта таксама быў бы яўны крымінал. А вось прашэнне аб памілаванні бацькі сапраўды было. Яно пісалася на імя самога Сталіна і так падавала трагедыю сям'і, пазбаўленай карміцельца, што, здавалася, магло расчуліць і халодны камень. Гэтае прашэнне доўга шліфавалася рознымі людзьмі і таму неаднойчы зачытвалася ў прысутнасці ўсіх нас. І мы кожны раз плакалі пры гэтым горкімі слязьмі.

А плакаць было ад чаго. Маці заставалася ў вёсцы з пяццю дзецьмі. Старэйшаму з іх, Івану, праўда, было ўжо 14 гадоў, але ён жа яшчэ мусіў хадзіць у школу. Затое самаму малодшаму, Аляксею, тады споўнілася толькі чатыры гады. Дарэчы, у матэрыялах справы яму, а таксама сястры Лене і мне ўзрост завышаны, кожнаму на год. Выпадковая памылка? Не ведаю.

Зусім не ўпамінаецца ў гэтых матэрыялах матчын першанец Яфім (маці называла яго Аўхімам). Ён нарадзіўся ў 1914 годзе. Ад нас з'ехаў калі не да, дык адразу пасля першага бацькавага арышту. Мабыць, асцерагаўся, каб не «замялі» і яго. А таму шукаў нейкага свайго заробку ў сталіцы. З цягам часу паступіў у Мінскі мединстытут, які закончыў толькі пасля вайны. У час вучобы (у даваенныя гады) працаваў у мединстытуце лабарантам нейкай фізічнай ці радыёфізічнай лабараторыі. Колькі-небудзь істотнай дапамогі сям'і ён аказваць не мог, хоць зрэдку летам, калі мы жылі яшчэ ў Быкоўцы, дамоў прыязджаў. Прывозіў кожнаму з нас нейкі падарунак.

Пісьмы дамоў Яфім прысылаў зрэдку. 1 заўсёды без зваротнага адрасу, які маці трымала ў строгім сакрэце. Відаць, баялася, каб хто з вясковых актывістаў не настукаў на хлопца ў сталіцу.

У прашэнні аб памілаванні бацькі пра

існаванне Яфіма нічога не гаварылася. Гэта ўжо была маленькая хітрасць, падказаная тымі, хто параіў звярнуцца да самаго ўладара краіны.

Дужа жаласнае пасланне «вялікаму правадыру» (так і яшчэ з многімі іншымі пашанотнымі вызначэннямі называўся ў тым пасланні Сталін) пісалася, вядома, не ў канцы 1940 года, а намнога раней, відавочна, у хуткім часе пасля вынясення другога прысуду. Мы лічылі, што яна ўвогуле бясследна знікла, бо афіцыйнага адказу, здаецца, не было. Але да мяне ўскосная вестка пра тое пасланне дайшла, лічы, праз 57 гадоў – у час знаёмства з бацькавай справай...

З гэтай жа справы я даведаўся, што па прысуду 1937 года бацька афіцыйна рэабілітаваны 26 верасня 1989 года. Спрацавала пастанова аб рэабілітацыі ўсіх, хто быў асуджаны асобымі нарадамі і рознымі тройкамі.

Прысуд, вынесены тройкай 19 красавіка 1933 года, адменены 25 лістапада 1958 года вызначэннем судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР. Судовая справа супроць бацькі тады была спынена «за недаказанасцю абвінавачвання». Пра гэта мне паведамілі з пракуратуры Магілёўскай вобласці 17 лютага 1995 года. Раней ні я, ні хто іншы з нашай сям’і, у тым ліку і маці, пра гэтую акалічнасць нічога не ведалі.

Да поўнай бацькавай рэабілітацыі маці і ўвогуле не дажыла...

*Дз.Я. Бугаёў.*

**БЯЛЯЦКІ Мікалай Мікалаевіч,** нарадзіўся ў 1963 г. у Крычаве. Кандыдат медыцынскіх навук. Скончыў Віцебскі медінстытут. Аўтар 27 навуковых прац. Жыве і працуе ў Віцебску.

**ВЯРЖБІЦКІ Васіль Гаўрылавіч,** нарадзіўся 14.3.1906 г. у в. Сакольнічы. Доктар гістарычных навук (1965). Скончыў БДУ (1929). У 1924–1929 гг. настаўнік, выкладчык педтэхнікума ў Лепелі, Барысаве. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 г. - выкладчык Ваенна-палітычнай акадэміі імя Леніна. У 1957–1962 гг. прадаваў у Цэнтральным музеі Савецкай арміі. З чэрвеня 1962 г. па 1972 гг. – дырэктар Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**ГРЫГОР’ЕЎ Аляксандр Дзмітрыевіч,** нарадзіўся 4.01.1949 г. у г. Крычаў. Доктар гістарычных навук (2000). У 1972 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. У 1972–1974 гг. працаваў сакратаром Крычаўскага РК ЛКСМБ. З верасня 1974 г. па 1994 г. служыў у Савецкай арміі. У 1987 г. скончыў ваенна-палітычную акадэмію ў Маскве. З верасня 1995 г. – дацэнт кафедры сацыяльнай педагогікі Беларускага педуніверсітэта імя М. Танка. З 2002 г. – прафесар, працуе на факультэце сацыяльна-педагагічных тэхналогій БГПУ. Аўтар больш за 100 кніг, брашур, навуковых артыкулаў.

**ДАНІЛЕНКА Валерый Мікалаевіч,** нарадзіўся ў Крычаве ў 1947 г. Доктар біялагічных навук (1996). Скончыў МДУ імя Ламаносава (1970), у 1974 г. – аспірантуру на кафедры генетыкі біялагічнага факультэта МДУ. З 1975 г. малодшы, а з 1979 г. – старшы навуковы супрацоўнік Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута генетыкі і селекцыі прамысловых мікраарганізмаў. У 1983 г. узначаліў лабараторыю генетычнай біятэхналогіі Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута антыбіётыкаў Мінмедпрама СССР. З кастрычніка 1991 г. загадвае лабараторыяй Дзяржаўнага навукова-даследчага інстытута генетыкі ў Маскве. Пад яго кіраўніцтвам 10 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

**ДУКТАЎ Уладзімір Уладзіміравіч,** нарадзіўся 28.12.1953 г. у г. Крычаў. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1994). Скончыў факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта (1971–1976). У 1986–1987 гг. вучыўся ў Мінскай вышэйшай партыйнай школе. З 1976 г. працаваў карэспандэнтам Клімавіцкай раённай газеты «Новае жыццё». З 1977 г. – лектар, з 1979 г. намеснік загадчыка аддзела, з 1980 - загадчык аддзела Магілёўскага абкома камсамола. З 1982 г. на партыйнай рабоце. З 1987 г. рэдактар магілёўскай раённай газеты «Прыдняпроўская ніва».

З 1970 г. выступаў ў друку і па радыё. Аўтар



А.Дз. Грыгор’еў.



У.У. Дуктаў.



І.С. Жарыкаў.

кніг прозы «Дзякуй і даруй» (1993), «Трэцяя асоба» (1997), «Смешкі-пацешкі» (1998).

**ЖАРЫКАЎ Іван Сямёнавіч,** нарадзіўся ў 1921 г. у в. Хацілавічы. Заслужаны дзеяч навукі БССР. Кандыдат біялагічных навук (1962). Доктар ветэрынарных навук (1976). Скончыў Маскоўскую ветэрынарную акадэмію (1951). Працаваў выкладчыкам у Клімавіцкім зааветтэхнікуме, інструктарам сельгасаддзела ЦК КПБ, у Беларускім навукова-даследчым ветэрынарным інстытуце. З 1968 г. – дырэктар Беларускага навукова-даследчага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі. Аўтар больш як 100 навуковых прац. Сярод іх 6 манаграфій.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі», у мірны час – ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За працоўную доблесць», «За працоўную адзнаку».

*Н.М. Марозава.*

**ЖЫРКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч,** нарадзіўся 1.10.1899 г. у в. Залесавічы. Беларускі мовазнавец, заслужаны дзеяч навукі БССР (1951), кандыдат педагагічных навук (1944). Скончыў БДУ. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Працаваў настаўнікам, выкладчыкам у Магілёўскім педінстытуце (1933–1941), у БДУ (1943–1969). У 1953–1968 гг. загадчык кафедры беларускай мовы ў Белдзяржуніверсітэце.

Аўтар падручнікаў для сярэдніх і васьмігадовых школ, шматлікіх прац па пытаннях беларускай літаратурнай мовы. Памёр 13.08.1984 г.

**ЗАБАЛОЦКАЯ (САЛАМАХА) Людміла Васілеўна,** нарадзілася 27.12.1949 г. у г. Крычаў. Скончыла ў 1968 г. Крычаўскае медыцынскае вучылішча, у 1974 г. філалагічны факультэт БДУ. Друкуецца з 1968 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Сакавік» (1974), «Радаводны васілёк» (1981), «Свяйтло палыну» (1989), «Струны ламяці» (1991). Жыве і працуе ў Мінску.

**КАРАМАЗАЎ Віктар Філімонавіч,** нарадзіўся 27.6.1934 г. у г. Чэрыкаў у сям'і настаўнікаў. Беларускі пісьменнік. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990), Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2003). Яго бацька, Філімон Сяргеевіч, больш за пяцьдзесят гадоў выкладаў у школах і Крычаўскім педвучылішчы беларускую і рускую мову і літаратуру, маці, Ганна Анісімаўна, працавала настаўніцай пачатковых класаў у Крычаўскай чыгуначнай школе. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны сям'я эвакуіравалася з Крычава на Волгу і жыла ва Ульянаўскай вобласці, у вёсцы Тургенева. Па заканчэнні вайны сям'я вярнулася ў Крычаў. тут Віктар Карамазаў і яго сястра Людміла вучыліся ў сярэдняй школе імя Карла Маркса. У 1952 г. будучы пісьменнік закончыў школу і паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У.І. Леніна на аддзяленне журналістыкі. Закончыўшы універсітэт, працаваў у чэрыкаўскай раённай газеце «Сацыялістычная перамога», а праз год, пераехаўшы ў Крычаў, у мясцовых газетах «Шлях сацыялізму» і «Новае жыццё», уласным карэспандэнтам «Магілёўскай праўды» па Крычаўскім, Клімавіцкім і Мсціслаўскім раёнах. У 1964 г. пераехаўз Крычава ў Мінск.

Сваё першае апавяданне «Сыны» Віктар Карамазаў апублікаваў у часопісе «Советская Отчизна» ў 1957 г. яшчэ студэнтам, напісаўшы яго па матывах паездкі ў Казахстан на ўборку цаліннага ўраджаю, а першая кніга апавяданняў «Падранак»



Віктар Карамазаў з маці Ганнай Анісімаўнай каля роднай хаты, 1992 г.

выйшла праз дзесяць гадоў і пачыналася апавяданнем пра родны дом у Крычаве, пра бацьку ды маці, прыезд у госці вясковага чалавека, які будаваў настаўніку дом, пра скрыпачоў, гаспадара дома і яго госця, і музыку. Ужо першая кніга пісьменніка выявіла галоўны напрамак яго творчага шляху – тэму роднай зямлі, роднай прыроды. На старонках апавяданняў «Букініч», «Запозненыя паязды», «Зялёныя тоні», «Па слончыну песню», «Ліменскі сшытак», «Мне сніцца бой ласёў» чытачы пазналі лясныя ваколіцы Крычава ды Чэрыкава, куточкі Сажа, мясцовых леснікоў ды егераў. Роднаму краю аўтар не здрадзіў і пазней, беручы сюжэты і вобразы для аповесці «Пагоннік», рамана «Пушча», новых апавяданняў, эсэ, нарысаў. Лірычныя вобразы роднага краю напоўнілі яго кнігі «Па талым снезе», «Вясёлка сярод зімы», «Дома», «Дзень Барыса і Глеба», «Дзяльба кабанчыка». Пісьменнік рашуча сцвярджаў галоўны прынцып свае творчасці: пісаць тое, што пражыта, што ў сэрцы, у думках, што ўражвае і хвалюе. Ен шмат падарожнічае па родным краі і не блізкім, а часам і далёкім, свеце. З падарожжаў нараджаюцца аповесці-эсэ «Глядзіце ў вочы лемуру», «Руны мараны», «Векавое». Пісьменнік жыве ў памораў на Белым і Баранцавым марах - піша пра іх; з суровай таежнай поўначы Урала прывозіць і публікуе эсэ пра катаржнае жыццё свайго дзеда Максіма; бярэ ўдзел у выпрабаваннях 130-тонных БелАЗаў у жалезарудных басейнах Крывога Рогу – стварае аповесць «Спіраль» пра выпрабавальнікаў машын.

Аналізуючы прозу пісьменніка, глыбокі і бліскучы ў слове М. Стральцоў пісаў: «Карамазаў– празаік надзвычай сучасны, і самае дарагое ў гэтай ягонай рысе... тое, што ён падрыхтаваны, як не кожны сённяшні празаік, да творчай трансфармацыі сучаснага матэрыялу ўсім сваім жыццёвым і асабовым вопытам: выхаваннем, уласцівасцямі ўражлівай, артыстычнай паводле складу свайго натуры, любоўю да чалавечага ўмельства...» І ў той жа час, маючы свой, з маленства, вопыт вайны, пісьменнік зноў ды зноў вяртаецца ў творчасці да ваеннага мінулага. Асвойваючы тэму вайны спачатку ў жанры апавядання, ён піша шматпланавы раман» Бежанцы», у аснову якога кладзе пуцявіны ўласнага блукання па прасторах вайны. І ў той жа час выходзіць з друку яго новая кніга «Проста ўспомніў я цябе», складзеная з вандроўных падарожжаў і літаратурных эсэ пра пісьменнікаў, жыццём і творчасцю блізкіх аўтару, – Аляксея Пысіна, Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Міхася Стральцова, Анатоля Кудраўца, Міхаіла Шолахава, Леаніда Ляонава, якіх ён ведаў і адкрываў па-свойму, сэрцам, то як сяброў, то як творцаў удзячны старэйшым майстрам літаратуры. За гэтую кнігу ён першы ў беларускай літаратуры атрымоўвае Дзяржаўную прэмію імя Кастуся Каліноўскага.

Як толькі на бацькаўшчыну пісьменніка абвальваецца чарнобыльская бяда, ён адразу ж, у першыя яе дні, прыязджае сюды, на Сож, жыве ў любай сэрцу Ліменскай пушчы, перажывае бяду разам са сваімі сябрамі-землякамі і піша з жывых назіранняў за нечакана зламаным жыццём аповесць «Краем Белага Шляху», апавяданні «Супраць неба – на зямлі», «Час ваўкоў», «Галуба», старонкі мастацкіх дзённікаў, што некалькі гадоў друкуюцца ў часопісе «Неман». У той жа час пісьменнік выходзіць на новую для сябе і для ўсёй беларускай літаратуры тэму – мастацкім словам даследуе жыццё і творчасць выдатных беларускіх мастакоў В. Бялыніцкага-Бірулі, С. Жукоўскага, А. Бархаткова, Г. Вашчанкі, А. Бараноўскага. Пра іх жыццё ў мастацтве адна за адной у друку з’яўляюцца аповесці «Крыж на зямлі і поўня ў небе», «Мой брат духоўны...», «Чырвоная брама», эсэ «Зачараваная душа» і «Жавароначкам бласлаўлёнае». На радзіме Бялыніцкага-Бірулі пісьменнік рэалізуе сваю даўнюю ідэю правядзення пленэраў мастакоў-пейзажыстаў і сам кожны год прымае ў іх удзел і як пісьменнік, прапагандыст творчасці Бялыніцкага-Бірулі, і як мастак-пейзажыст. Творы пра мастакоў і свой дзённік-роздум, напісаныя на пленэрах, ён выдае і асобнымі творамі, і кнігай «З вясною ў адным вагоне», якая атрымала прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

В. Карамазаў шмат працуеў кінематографе. Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкія фільмы «Пушча» (дзве серыі па раману «Пушча»), «Зялёныя фрэгаты», «Крыж на зямлі і поўня ў небе» (па аднайменнай аповесці), а таксама шэраг дакументальных фільмаў.

*Дз. Т. Дудзінская.*

# Мая Радзіма

## З эсэ В. Карамазава

Бацькоўская субота перад Раданіцай. У царкве святога Мікалая памянуў маму, гэтай зімою памерлую, бацьку, якога няма ўжо сорак гадоў, сястру Люду, якая адышла раней за бацьку, яшчэ ў маладыя студэнцкія гады. Дадому вяртаўся берагам Сажа. Ідучы, углядаючыся ў наваколле, зноў ды зноў спыняўся. То пазнаўшы лазенку, у якой, калі

вучыліся ў школе, жыў Толік Шпак, наш надзейны футбольны варатар; то старую вярбу, пад якою ў забоіне трымаў сваю лодку Барыс Зуеў, мой школьны сябра, і з якім два апошнія гады сядзелі за адной цартай. А тут па начах, таемна ад рыбнагляду, закідалі ў Сож брэдзень, выцягвалі з травой і рыбай. А на тым беразе ўлетку, як цямнела, варылі юшку. Спыніўся каля старога броду, успомніўшы, як тут з мамай пераходзілі Сож, ідучы ў луг па шчаўе ці яшчэ далей у лес па маслякі, рыжыкі. Ішоў далей – насустрач старая: сышла са сцежкі, мне ўступіўшы, спынілася, павіталася. І я спыніўся павітаўся. Пытаецца: «Зноў прыехалі на радзіму?» – «Зноў», – кажу. «Радзіма не забываецца?» – «А як жа яе забудзеш?..» Тады яна - мне: «Дай Бог вам здароўечка...» – Ды і пайшла сваёй дарогай. А я гляджу ёй услед і думаю: хто такая?.. Бо кранула сэрца яе дабрыня: «Дай Бог здароўечка...» – за тое, што я не забываю свой родны бераг?.. І ўжо ішоў, у думках паўтараючы крыху запозненае сваё, ёю пачутае: «Дай Бог і табе, матуля, здароўечка...» А дома, як вярнуўся з Сажа, падумаў і пра Зуева, і пра Шпака, і пра Жорку Марозава, і пра іншых цудоўных хлопцаў з берага, сяброў маленства: дзе яны ўсе? Хто жывы? Пасля школы, як раз'ехаліся па той, што была, агромністай савецкай краіне – ані гуку. І зноў – пра старую падумаў: можа, яе сын таксама некалі з'ехаў у далёкі свет і не вярнуўся? Можа, адсюль і ласка да чалавека, што свой бераг не забывае, тая матчына ласка, якою б яна хацела сустрэць роднага сына, калі б вярнуўся?..

І так мне зажадалася яе спаткаць яшчэ аднойчы, каб ходь словам, як мог, суцешыць.

На сустрэчах з пісьменнікам чытачы часта пытаюцца пра яго радзіму: дзе нарадзіўся, хто бацька ды маці, дзе школа, у якой вучыўся, якія творы напісаў пра родны край? Нядаўна ў школе малады чалавек, дзесяцікласнік, спытаў: «А што вам бачыцца, калі падумаеце пра сваю радзіму?» Я здзівіўся: цікава, па-свойму, ад душы спытаў. І раней, як на пытанне адказаць, убачыў сваю зялёную тару ў Крычаве, на ёй, за брамай, хату, у сцяне – два акны, перад імі на лаўцы – маму і бацьку, маму ў злінялай шарсцянай кофце, бацьку ў белым палатняным пінжачку. Мама глядзіць на мяне ды ўсміхаецца, а бацька глядзіць на маму і ёй усміхаецца, а твары ў абаіх светлыя, добрыя, у цёплым пачуцці вельмі адно на адно падобныя, і такія сціплыя ў сваім шчасці, па-боску чыстыя. Іх убачыўшы, убачыў вакол кусты ружаў, белыя ды чырвоныя, і ружы далей, каля ганка,і за ганкам ружы, і яшчэ далей, па сцежцы ў сад, абапал сцежкі, маму ў садзе паміж кустоў ружаў, як яна іх высаджвае, абразае, акучвае, абпырсквае ад дробнай зялёнай тлі, пачуў яе голас «восемдзесят шэсць гатункаў адных ружаў...» (не кустоў – гатункаў!). Больш, яку мамы, у Крычаве ружаў ні ў каго не было, але гэта здзіўляла людзей чужых, не мяне, бо я бачыў як яна працавала ў садзе, бачыў пасылкі з каранямі кветак, якія да нас прыходзілі з Рыгі, з Мікіцкага батанічнага сада ў Крыме, з Львова ад мае стрыечнай сястры Клары, з Драгобыча ды Івана-Франкоўска ад мамінай сястры Таццяны. Цяпер каму пра гэта скажаш – пытаюцца: прадавала? А мы нічога ніколі не прадавалі і не бралі задарма, толькі куплялі, як было за што, у той час у Крычаве наогул ніхто кветак не купляў і не прадаваў. Кветкі маці пачала разводзіць у пяцьдзесят другім годзе, як памерла Люда, яшчэ такая маладая ды прыгожая. Ёй на магілку насіла, ледзь не кожнага дня. І дарыла людзям, каб Люду, як казала, на тым свеце адарыў Гасподзь. І вось гэтакія, як яна, да нас кожнага дня заходзілі жанчыны – сама дабрыня. Усе, з кім сябравала, любілі кветкі, разводзілі іх, бралі ўдзел у гарадскіх выставах кветак: настаўніца Ірына Нічыпараўна Карачун, Матрона Ларывонаўна Зямлянская, таксама настаўніца, суседка Ганна Сяргееўна Гузікава, маці майго сябра Арнольда. Матрона Ларывонаўна доўга і цяжка хварэла, беспамылкова адчувала ў апошнія гады свой блізкі канец жыцця, але самоты ў яе твары ніхто не бачыў, з кветкамі ішла ў царкву, з гасцінцамі да людзей, заўсёды бачыла, чым чалавеку пасобіць, і вельмі часта заходзіла да нас, да маці, ужо старэнькай, як завітае – святлее ў хаце. Аднойчы я завітаў да яе і Віктара Паўлавіча, яе мужа, баявога лётчыка, які ўсю вайну адваяваў на крылах знішчальніка, якраз на Спаса, з яблыкамі, селі за стол, пагаварылі, і тады я

ўпершыню ўбачыў у яе вачах слёзы. Яны, старыя, у той час пахавалі сына, што жыў з імі, і сама Матрона Ларывонаўна дажывала апошнія дні. Але дзіўныя ў яе і тады былі слёзы. Яна так не хацела мне іх паказаць, і хавала за ўсмешкай, за жартаўлівым слоўкам. Якая мужнасць!

Выходжу з хаты ў сад, стаю, гляджу на кветкі, якія першую вясну без мамы, гляджу на яблыні ў кволай ад халадоў квецені, кожную чую сэрцам, бо кожная так шмат расказвае мне пра дарагіх людзей – не толькі пра маму ды бацьку. Вось уэлс – дзіва з дзіваў, яблык на яблынцы кожны год як ягад на гронцы вінаграднай, і кожнае густа-чырвонае, гарыць рубінам, салодкае, адзін раз адкусіш - поўны рот соку, пакінеш назіму - пералежыць і антонаўку, і любое іншае яблыка, і сок да лета не страціць. Адкуль яблынька? Памятаю, як яе прынёс танклявым саджанцам бацькаў былы вучань ляснічы Карпушэнка (шкада, што ўжо не памятаю, як зваць, хоць і заглядаў ён да нас часта), як садзілі яе і ён, і Ліда, мая маладая тады жонка, і я. А далей, дзе не зарадзіла бульба, стаяла пепінка: яблычка жоўценькае, нібы бурштын, сонцам налітае. Тое дрэўца нам прынесла Ірына Нічыпараўна Карачун. Як памерла, дык і яблынка, нібы ад гора па ёй, счарнела. Я яе выкарчаваў, але на тым месцы ўжо нішто не радзіла, што ні пасодзіш – змарнее. І ландышы, якія ў другім канцы саду, прынёсшы з лесу, разам з зямлёю, камякамі, пасадзіла Ірынушка, як яе мама называла, ліхтарык, як называлі яе мае малыя дзеці, цяпер разрасліся, кожную вясну як зацвітуць – водар па ўсёй тары. І манжурскі арэх яе. Закараніўся – ніякім жалезам з зямлі не выб'еш. Ды і навошта выбіваць? Арэхаў не дае, але ж памяць пра светлага чалавека даражэйшая. Ці белы наліў – дзве дзеравіны. Яблыка не ўлежнае, зняў ды з'еў, аднаго пня было б даволі, але як адно з двух пакінеш, калі Арнольд, цудоўны сусед ды сябра, пасадзіў два? Была ў маім садзе і яблынка Гарасіма Іванавіча Зубарава з Хацілавіч, вёскі пад Крычавам. Ён нам клаў хату з братам Ахрэмам і пасадзіў рэпачку, яблыкі былі што мёд і на смак, і водарам, пчолы па ёй раямі пасліся, яблыка з-за іх было не ўзяць з яблыні. А як памерла мая сястра – яблынка пачала ўсыхаць. Памёр Гарасім – зусім высахла. Толькі музыка ад Гарасіма і засталася ў вушах звінець. Часта, бывала, прыязджаў з вёскі да нас на сівым калгасным коніку. Пад вокнамі паставіць на гары, пасак адпусціць, хамут рассупоніць, кіне з воза сена каню і ў хату – да скрыпкі. Бацька іграў па памяці, і па нотах, больш Чайкоўскага ды Бетховена, класіку, а Гарасім – свае вясковыя танцы ды песні, франтавыя. З тых яго прыездаў і цяпер бачу асобныя малюнкі пад скрыпку...

Вось – за акном каля плота сівенькі конік хрумстае сена ці саломку на сакавіцкай праталіне. У салодкай млосці вочы то заплюшчыць, то расплюшчыць. Аў вачах нявымытыя сонейкам зімовыя слёзы. На конскай спіне варушыцца вясновы прыпарачак. Верабейка скача па ўгрэтае холцы, выдзёўбвае з падшэрстку зімовую каросту. Конік хрумстае, не варушачы ні вухам, ні хвастом, каб дробную птушачку не спужнуць, каб яна яшчэ і да костачак дадзяўблася.

А там, угары, пад лапінкай жыцця зямнога, блакіт вясны – таксама мацярык...

А тут...

Тут – бацька. Стаіць у паліто наросхрыст і без шапкі – шапку ў руках камечыць. У старых амерыканках-чаравіках – у лужыне, якую, пэўна, не бачыць і не чуе пад сабою. Загледзеўся на каня, на вераб'я, жмурыцца, каб не спужнуць і птушачку, і радасць конскую, і само сонейка вясновае, і штосьці зусім сваё, таемнае.

Ад брамы на гару падымаецца Гарасім – з крамы. На плячы – мех. У мяху – буханкі хлеба, які чакаюць у вёсцы, бо вёска хоць хлеб і вырошчвае, але на стале свайго не мае.

Я рады, як у хату ідзе Гарасім. Бо ведаю, што тут ён скіне з плячэй світку, з галавы – шапку, зломкам грабянца расчэша чарнявыя вал асы і папросіць у бацькі скрыпку...

Сустрэчы з найдабрэйшым і найчысцейшым душою селянінам Гарасімам мяне калісці вельмі ўражвалі і шмат давалі для душы, для разумения жыцця вясковага чалавека, яго прыроднага таленту, і не выпад - кова самая першая мая кніга «Падранак» пачынаецца апавяданнем «Нязгаснае» – пра родную хату, пра бацьку, маму, Гарасіма, пра скрыпку і яе душу, якую так умелі будзіць і

Гарасім, і бацька, нават і пра сівога коніка пад акном. І не выпадкова пазней, уключаючы апавяданне ў іншыя зборнікі прозы, я называў яго больш канкрэтным і блізкім да мае душы словам – «Дома».

Чую, як хтоські кажа: «Ты нарадзіўся ў Чэрыкаве, які за дваццаць кіламетраў ад Крычава, і там, напэўна, твая радзіма?» Так і не вельмі так. Так – я нарадзіўся ў Чэрыкаве. Але наконт радзімы – тут у мяне свае і думкі, і адчуванні.

У тым годзе, калі я нарадзіўся, наша сям'я жыла то ў Мінску, то ў Астрашыцкім Гарадку пад Мінскам. Час быў цяжкі, і мама, каб падарыць мяне свету, прыехала ў родны Чэрыкаў. Тут яе чакалі два ўтульныя дамы. У адным, дзе яна і нарадзілася, і вырасла, пасля смерці бацькі жыў са сваёй сям'ёй старэйшы брат Грыгорый, а ў доме на гарадскім возеры жылі дзядзька Станіслаў і цётка Марыя Іванаўна, дзяцей у іх не было, а маму і яе сям'ю яны вельмі любілі – у іх доме мама і спынілася. Тут я і нарадзіўся. Тут мяне Марыя Іванаўна і ахрысціла. У той час хрысціць дзяцей было найстрога забаронена, а ў сям'і настаўнікаў пра тэта падумаць было жахліва. Але аднойчы ўвечары, як сцямнела, калі ў доме не было нікога, акрамя мяне і яе, мае на той час няньκі, яна загарнуля мяне ў коўдру, вынесла, каб ніхто не бачыў, за вароты і вуліцаю бегма праз два дамы да дома Старадомскага, бацюшкі – хутчэй на ганак ды ў хату. Старадомскі, якога ў Чэрыкаве вельмі паважалі, мяне і ахрысціў, пра што не ведала нават мама. Неўзабаве пасля гэтага бацюшку арыштавалі, і мама бачыла, як яго ў нас пад вокнамі вялі на штыху, пад канвоем. Забралі і ўсю яго сям'ю. А я, цяпер пра гэта думаючы, чую ў сабе, як боль, удзячнасць і бацюшку, які паклаў на мяне першы Гасподні крыж, і бабулі Марыі Іванаўне, кланяюся ім за тую, у рупнасці пра маю душу, мужнасць.

З Чэрыкава мама са мною вярнулася ў Мінск, а праз гады тры мы з Мінска пераехалі жыць у Крычаў. Быў год, здаецца, трыццаць сёмы. Бацька і маці пачалі настаўнічаць у чыгуначнай школе.

Аднойчы я вызначыў межы, хоць і адносныя, маёй малой радзімы, і яны пралеглі як па Чэрыкаўшчыне, так і па Крычаўшчыне, ніякіх адносін да межаў адміністрацыйных не маючы: праз вёскі Мірагошч, Лімень, Гронаў Вепрын, Паклады, Лабковічы, Маляцічы, Дарагую, Волчас, Хацілавічы, Лабанаўка. У гэтым коле былі, вядома, і Чэрыкаў, і Крычаў, і, ад Мірагошчы да Лабковіч, Сож – мая найпершая і наймілейшая на зямлі рака. Тэта круг майго найшчаслівейшага жыцця, самых дарагіх для душы захапленняў і ці не большый паловы маіх літаратурных матываў, вобразаў, сюжэтаў. А неўзабаве, думаючы пра гэтую сваю краіну, жыццё ў ёй не толькі маё, але і блізкіх мне людзей, я здзівіўся і яшчэ аднаму нечаканаму адрыццю: гэты круг вымаляваў яшчэ дзед Анісім, мамін бацька Анісім Раманавіч Шаблоўскі, калі мяне на свеце не было, і я, як атрымоўвалася, сваім лёсам паўтарыў круг дзеда. Дзіўна, як мы з ім размінуліся на гэтым крузе? Дакладна мама не памятала, калі ён памёр, але ці не гадоў за чатыры-пяць да маіх народзінаў. З яе казанняў я бачу дзеда Анісіма буйным, прыгожа-вусатым, самавітым, годным, даволі разумным і культурным чалавекам. Ён меў сямёра дзяцей, матэрыяльнай спадчыны не меў, адзін зарабляў на ўсю сям'ю, жонку, маю бабулю, пахаваў рана, у дзесятым годзе, узяў у дом сваю і жончыну маці, але ўсім змог даць жыццё не толькі ў поўным матэрыяльным дастатку ды ў радасцях маленства, але яшчэ да рэвалюцыі ўсіх вывучыў і выдатна выхаваў. А працаваў, можна сказаць, мазалём, жыў з рамёстваў: купляў і вырабляў скуры, на сырамяць, шыў з яе конскую вупраж, хамуты, шляі, сядзёлкі, усім вырабам даваў мастацкую аздобу, шыў і боты, і чаравікі з хрому, ягдташы паляўнічым, аздобу даваў і колерам, і металёвым наклёпам, варыў алей ды фарбы, распісваў ды рэстаўраваў княскія ды панскія палацы, саборы, іканастасы, крыў золатам саборныя купалы, крыжы. У Мірагошчы працаваў у князя Абаленскага, у Лімені ды Вепрыне – у паноў Васілеўскіх, якія былі братамі, пад Крычавам у Нізках даводзіў палац яшчэ аднаму Васілеўскаму, брату ліменскага ды вепранскага паноў, і ўсюды, дзе працаваў, яго цанілі і паважалі. У Нізках сышоўся з Аніскай, дачкою ахмістрыні пана Васілеўскага і стаў з ёю пад шлюбны вянец у Крычаве ў царкве Святога

Міколы. Аніска была ад пана, які выгледзеў Параску, яе маці, у вёсцы, тая была сялянкаю, і, не ўзяўшы з ёю шлюб, які не дазвалялі саслоўныя каноны, узяў у свой палац гаспадыняю на кухні, ахмістрыняю. Пра Аніску, сваю маці, мая мама ведала мала, амаль не памятала, бо тая памерла, як маці было тры гадкі, ведала ад бацькі, сваіх старэйшых братоў і сясцёр, як апошняя ў сям'і з дзяцей, але часта пра яе думала, вобраз яе ў сабе насіла з вялікай пашанаю і любоўю, і ў думках,сэрцам з ёю часта гаварыла ў малітвах перад іконаю Маці Божае, асабліва ў апошнія гады жыцця, перад смерцю. А бабулю, маці Анісі, добра памятала і расказвала, якая яна была заўсёды чысценькая, ласкавая, як спявала, як курыла, павучаная гэтаму ў панскім двары. Тое, што маміным дзедам па маці быў Васілеўскі з Нізкаў, у нашым доме было вялікай таямніцаю, але ў апошнія гады жыцця мама, калі мы заставался ўдваіх, у хвіліны шчырых размоў за вячэрняй гарбатаю, спрабавала мне пра тэта паведаць, хоць і гублялася ў гэтакай размове, нечага асцерагалася, як і хацела, каб я ведаў пра свой род, і нештаяе стрымлівала. А калі памерла, я атрымаў ліст ад стрыечнай сястры з Івана-Франкоўска, якая тое самае чула ад свае маці, што была з маёю роднымі сёстрамі, і мне напісала. Дзед Анісім прывёз Аніску ў Чэрыкаў і там за адно лета пабудаваў добры дом на беразе Сажа, а калі рэвалюцыя разагнала паноў і пазнішчала іх палацы, ён прывёз у свой дом і Параску з крычаўскіх Нізкоў. Яна ў яго жыла да самай смерці.

Круг жыцця дзеда Анісіма на Крычаўшчыне ды Чэрыкаўшчыне я паўтарыў па-свойму. З маленства маючы стыхійныя выхады на дзедавы сцежкі-дарожкі, а то і свядомыя, ад успамінаў мамы і бацькі, найбольш абжыў тэты круг, як вярнуўся на радзіму з Мінска, закончыўшы універсітэт і працуючы то ў Чэрыкаве, то ў Крычаве ў раённых газетах, то карэспандэнтам «Магілёўскай праўды» ў родным краі на Сажы, то пасля, жывучы ў Мінску, але часта прыязджаючы сюды, у хату, і жывучы тут падоўгу. У гэтыя гады я глядзеў на сваю і дзедаву зямлю ўжо як журналіст, пісьменнік, мастак, даследчык, і пісаў, жывучы ў Мірагошчы ды Лімені, раман «Пушча», апавяданні «Апошняе паляванне з лайкай», «Букініч», «Час ваўкоў», «Зялёныя тоні», жывучы ў Гронаве, ганяючы па Сажы плыты з Гронава на Гомель яшчэ па-старому, шастом ды кацярынкаю на перакатах, пісаў аповесць «Пагоннік», у Пакладах, у калгасе «Запаветы Ільіча», заначаваўшы аднойчы на пашы з пастухамі, знайшоў сюжэт і напісаў апавяданне «Сцяпан, Дзіч і Цырля», за Дарагою ў спарахнелай хатцы сустрэў старую, якую тут звалі галубаю, і апісаў яе надзвычай драматычнае жыццё ў апавяданні «Галуба». У Крычаве, па жывых уражаннях ад мясцовага жыцця, была напісаная і аповесць «Аброчны крыж», якая мела выйсце ў свет яшчэ і пад назваю «Краем Белага Шляху».

Жыццё і праца ў родным краі на зялёнай горцы, у сваім доме ледзь не кожны дзень пераконваюць, што роднае – гэта не толькі тое, што родным адчуваеш сам, але і тое, што родным адчувае цябе. Тады і атрымоўваецца, што не толькі сам знаходзіш для душы і працы думкі, словы, матывы, вобразы, сюжэты, але гэта табе дае твой край, яго людзі, яго прырода, дораць як свайму чалавеку, цябе ведаючы і табе давяраючы свае глыбіні, таямніцы.

Ёсць у мяне апавяданне «Сямёнаўна». Яно якраз з тых, якія не шукаеш, якія нечакана прыходзяць да цябе самі.

Колькі стаяла на зялёнай горцы наша хата, столькі стаяла і малая шэрая хацінка насупраць цераз вуліцу, і ў ёй увесь тэты час жыла Сямёнаўна з унучкай Святланай. Мужа Сямёнаўны не памятаю, бо ён, як казалі, памёр ад франтавых ран у хуткім часе пасля вайны. Сямёнаўна працавала на пошце і старэла, а Святлана, як скончыла школу ды недзе яшчэ падвучылася, пераехала жыць у Мінск. Састарылася Сямёнаўна ў сваёй хатцы адна, але ўнучка яе не забывала, прыязджала, чым магла, пасабляла. Жыла суседка ціха, і ніхто пра яе жыццё нічога не ведаў. І вось захацелася ўжо старой Сямёнаўне зрабіць з нейкай нагоды Святлане падарунак. Пайшла па крамах і ўбачыла ў раймагу дыванок – вельмі ён ёй спадабаўся. Вярнулася дадому, дастала з-пад падушкі панчоху, вытрасла з яе назбіраныя грошы, палічыла – на дыванок хапала. Прыйшла ў

магазін, каб купіць, а прадаўшчыца – на смех: ці ты баба, герой вайны: Паказвай дакументы. І вярнулася старая дадому ў слязах. А тут і я зайшоў: што за слёзы? Аказалася, дыванок мог купіць толькі ўдзельнік вайны. Я кажу: ідзіце ў ваенкамат і вазьміце паперку на мужа – ён у вас за вайну колькі меў ордэнаў ды раненняў? Дак жа ён памёр? Ну і што? Удава ветэрана! Пайшла. А ў ваенкамаце, шукаючы дакументы на Сямёна, знайшлі і на яе паперкі, пагарталі: вы ж самі ўсю вайну былі на франтах? Узнагароды, нават баявая Чырвоная Зорка – ордэн? Вярнулася дадому – даведку ўзяць пасаромелася: які ж я, кажа, ветэран вайны? Ну, працавала на паштовым поездзе, пошту на фронт і з фронта, на фронт і з фронта, бамбілі нас, гарэў наш поезд, хавала ў дарогах сяброў, салдацікаў, але ж які я герой?.. Баба, як усе бабы... І па дыванок не пайшла. Пасекла сваіх курэй, склада ў сумку і паехала да Светкі ў Мінск.

Зноў спускаюся са свае зялёнае горкі, пераходжу вуліцу, спыняюся, гляджу ў вокны дома Сямёнаўны. Цяпер тут жывуць іншыя людзі. І ў доме суседнім – іншыя. Некалі жылі Марозавы, стары і старая, дом прадалі, а самі паехалі да дзяцей аж у Сібір. І з другога боку ад дома Сямёнаўны, у доме, дзе жыў стары Карагодаў, людзі новыя, настаўніца з дзяўчынкаю. Нікога, што за людзі, не ведаю. Але ж некалі і Сямёнаўну не ведаў, пакуль выпадкова не адкрылася. Думаў: баба і баба, а як адкрылася – колькі ахвярнасці, сціпласці, мужнасці! Гэтак кожны раз: прыедзеш на сваю радзіму, ідзеш па ёй ад дома да дома, і кожны дом, кожнае ў ім акно, кожнае дрэва мала сказаць – знаёмае, яно – сваё, блізкае, і на кожным кроку можаш чакаць, як зараз табе хтосьці ці штосьці адкрыецца, як адкрылася аднойчы Сямёнаўна – нечаканым слоўкам, пачуццём, вобразам, сюжэтам, як свайму чалавеку. Гэтакае бывае толькі на радзіме.

Праўда, яшчэ нядаўна нас усіх вучылі, што радзіма ў нас ад мора да мора, ад Калінінграда да Уладзівастока. І мы гэтаму верьте І растрэслі па той вялікай краіне, што называлася СССР, вельмі шмат сваіх сыноў І дачок. Цяпер падыйдзеш да свае былой школы, паглядзіш на яе вокны, як у жывыя вочы, успомніш, які вялікі быў у нас клас, за трыццаць дзяўчат і хлопцаў, як усе, хто хацеў, паканчалі універсітэты, акадэміі, інстытуты, вышэйшыя вайсковыя вучэльні – дзе яны? Большасць – там, у нязмераных прасторах СССР. Жывыя ці мёртвыя?..

Ведаю і я ці не ўсе куточкі СССР, пабываў і на Далёкім Усходзе, і на Поўначы, і ў Сібіры, на Урале, у Сярэдняй Азіі, дзе толькі не вадзіла мяне мая журналісцкая ды пісьменніцкая душа. І ўсюды, забыўшы, што казалі мне мае настаўнікі, я адчуваў, што Сібір – радзіма для сібірака, Чукотка – для чукчы, Якуція – для якута, Волга – для рускага чалавека, а ў мяне, беларуса, радзіма адна – Беларусь, а ў Беларусі самае любае і святое месца тое, дзе нарадзіўся і вырас, дзе мой бацькоўскі дом і дзе магілы мамы і бацькі.

**ЛЯХОВІЧ *Ларыса Уладзіміраўна,*** нарадзілася 13.6.1968 г., кандыдат гістарычных навук (2001). Працуе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры. Выйшлі з друку яе навуковыя працы па эканамічных, палітычных і культурных сувязях Беларусі і Францыі. Займаецца навукова-метадычнай распрацоўкай вучэбных дапаможнікаў і метадычнай літаратуры для сярэдняй і вышэйтпай школы. Вядзе навукова-даследчую работу па гісторыі сваёй «маладой радзімы» – Крычаўшчыны. У гэтай кнізе змешчаны шэраг матэрыялаў аб падпольным і партызанскім руху ў раёне, які выявіла і падрыхтавала да друку Л .У. Ляховіч.

**МАЗАЛЬКОЎ Яўген Сямёнавіч,** нарадзіўся 17(30).9.1909 г. у Крычаве. Крытык,



Л.У. Ляховіч.

перакладчык і літаратуразнавец. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1968). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Скончыў 1-ы Маскоўскі універсітэт (1930). У Вялікую Айчынную вайну рэдактар выдання на рускай мове часопіса «Беларусь». У 1948–1969 гг. старшыня камісіі, потым савета па беларускай літаратуры пры праўленні СП СССР. Друкаваўся з 1924 г. Аўтар прац пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, З. Бядулі, К. Чорнага, М. Танка, П. Броўкі, А. Куляшова, К. Крапівы. На рускую мову пераклаў творы Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі. За кнігу «Янка Купала» (1949) Дзяржаўная прэмія СССР (1950).

Памёр 15.12.1969 г.

**МАСКАЛЕЎ Канстанцін Васілевіч,** нарадзіўся ў 1963 г. у Крычаве. Кандыдат медыцынскіх навук. Дацэнт. Жыве і працуе ў Віцебску.

**НАЗДРОЎСКІ Сцяпан Андрэевіч,** нарадзіўся ў 1888 г. у Крычаве. Калі яму споўнілася 9 гадоў, бацькі адправілі сына вучыцца ў Пецярбург, у гімназію. Скончыўшы яе, Сцяпан паступіў на фізіка-матэматычны факультэт сталічнага ўніверсітэта. Але ён марыў стаць лётчыкам. Спачатку пайшоў працаваць на самалётабудаўнічы завод у Пецярбургу. Там асвоіў слясарную і такарную справу, а таксама зборку самалётаў. Потым паступіў у авіяцыйную школу Усерасійскага авіяклуба.

Пройдзе не так ужо шмат часу, і вучань авіяцыйнай школы Сцяпан Наздроўскі ў час экзаменацыйнага палёту на Каменданцкім аэрадроме пад Петраградам зробіць пяць «васьмёрак» на працягу шасці з паловай хвілін. Гэта сусветны ракорд. Аб ім з захапленнем пісалі расійскія газеты.



С.А. Наздроўскі

У жніўні 1913 г. Наздроўскі атрымаў дыплом пілота-авіятара за № 164. Здольнага лётчыка пакінулі ў школе інструктарам. Сваё майстэрства Сцяпану Андрэевічу не ўдалося перадаць маладзейшым калегам – грымнула першая сусветная вайна. Наздроўскі пакінуў школу і пайшоў добраахвотнікам на фронт.

На вайне Сцяпан Андрэевіч удзельнічаў у розных аперацыях. Яго баявыя разведвальныя палёты, што праходзілі ў глыбокім варожым тыле і пад інтэнсіўным артылерыйскім агнём, увайшлі ў манаграфіі і падручнікі паветранай разведкі таго часу. Пра яго гераізм, ваенную кемлівасць сведчаць узнагароды. Ён кавалер чатырох салдацкіх Георгіеўскіх Крыжоў, аднаго афіцэрскага Георгіеўскага Крыжа I ступені і ордэна святога Уладзіміра з мячамі і бантам IV ступень

У жніўні 1917 г. камандзір 10-га авіяатрада знішчальнікаў капітан Наздроўскі прызначаны начальнікам Каменданцкага аэрадрома. У студзені 1918 г. Сцяпан Андрэевіч узначаліў авіяцыйную школу Казанскага аэраклуба, пазней працаваў тэхнічным кіраўніком авіяцыйнай Пятай Чырвонай арміі.

Пасля грамадзянскай вайны ў 1920 г. у Маскве быў створаны навукова-вопытны аэрадром, на тэрыторыі якога размясцілася лабараторыя аэранавігацыі. Узначаліў яе С. А. Наздроўскі. Ён стаў адным з найбольш вядомых спецыялістаў у галіне аэранавігацыі, выдаў шэраг кніг: «Пытанні аэранавігацыйнай практыкі», «Тэорыя навігацыйных прыбораў», «Агульная тэорыя і методыка разліку вымяральных прыбораў» і шмат іншых.

У Вялікую Айчынную вайну С.А. Наздроўскі ўзначальваў у Ваенна-паветранай акадэміі кафедру на штурманскім факультэце. Пасля вайны працаваў старшым выкладчыкам кафедры механічных прыбораў у Маскоўскім авіяцыйным інстытуце. Памёр ў 1950 г.

*Н.М. Марозава.*

**ПАЛІТЫКА Апанас (Панас) Паўлавіч,** нарадзіўся 5.2.1935 г. у вёсцы Бродак. У 1951 г. скончыў у Кіеве рамеснае вучылішча. Працаваў на машынабудаўнічым заводзе «Бальшавік» (1951–1954). У 1954 г. паехаў на асваенне цалінных зямель у Акмолінскую вобласць (Казахстан). Рабіў прычэпшчыкам на ферме Балкашынскага племсаўгаса, трактарыстам зернесаўгаса «Калінінскі» (1954–1955). Служыў у Савецкай арміі (1955–1957). Быў электраслесарам шахты «2-Паўднёвая» (горад Шахты, Растоўская вобласць). З 1959 г. жыў у Крычаве, працаваў слесарам на птушкакамбінаце, цесляром у саўгасе «Вялікі Кастрычнік». У 1960 г. скончыў сярэднюю школу рабочай моладзі, у 1967 г. філалагічны факультэт Мапл ёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў выхавальнікам школы-інтэрната ў Крычаве (1967–1969), загадчыкам сельгасаддзела крычаўскай раённай газеты «Ленінскі кліч». З 1975 г. карэспандэнт-арганізатар, загадчык аддзела інфармацыі і радыёвяшчання газеты «Ленінскі кліч». Член СП СССР з 1981г.

Першы верш апублікаваў у 1960 г. (газета «Магілёўская праўда»). Аўтар кніг «Маўчанне навыперадкі» (гумар і сатыра, 1980), «Свой хлопец» (сатырычныя аповесці і апавяданні, 1985), «Праверка» (сатырычныя апавяданні, 1990).

**РЫЖЭВІЧ Рэма Пятроўна,** нарадзілася ў 1941 г. у Крычаве. Член Саюза музычных дзеячоў Беларусь Скончыла Белдзяржкансерваторыю. Выкладчык па класу фартапіяна. Загадвала харавым аддзяленнем Рэспубліканскага музычнага каледжа.

**СВАДКОЎСКІ Іван Фаміч,** нарадзіўся ў в. Мірнае. Скончыў гарадское пачатковае вучылішча, Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Удзельнічаў у першай сусветнай вайне. Скончыў школу прапаршчыкаў, атрымаў званне малодшага афіцэра. Пасля лютаўскай рэвалюцыі І.Ф. Свадкоўскі – камісар штаба трэцяй арміі і рэдактар газеты «Голас трэцяй арміі». Потым лёс закінуў яго ў Ніжні Ноўгарад. У Казані ён трапіў у палон да белагвардзейцаў, але неўзабаве ўцёк з палону і каля году вёў рэвалюцыйную работу ў тыле калчакаўскай арміі. Пазней працаваў у сібірскім Бюро ЦК партыі. Ён рэдагаваў часопіс «Чырвонаармеец». З 1923 г. І.Ф. Свадкоўскі – студэнт і сакратар партарганізацыі Акадэміі камуністычнага выхавання. Пісаў працы па гісторыі педагогікі. У 1926 г. вывучаў школьную справу ў Амерыцы, чытаў там лекцыі, працаваў у Акадэміі педагагічных інстытутаў.

У Вялікую Айчынную вайну І.Ф. Свадкоўскі працаваў дырэктарам трох дзіцячых дамоў у Омскай вобласці. Аб гэтым часе ён цікава расказвае у сваёй кнізе «Выхаванне працавітасці» З 1960 па 1964 гг. рэдагаваў часопіс «Сям'я і школа».

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», адзначаны вышэйшай педагагічнай узнагародай – медалём імя К.Дз. Ушынскага.

*Н.М. Марозава.*

**СТАРАВОЙТАЎ Іван Мацвеевіч,** нарадзіўся 25.05.1903 г. ў в. Горкі. Беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, доктар медыцынскіх навук (1958), прафесар (1966), заслужаны дзеяч навукі БССР (1966). У 1929 г. скончыў БДУ. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1937 г. на кафедры акушэрства і гінекалогіі Мінскага медыцынскага інстытута. З 1958 г. загадчык кафедры.

**СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Карпавіч,** нарадзіўся ў 1947 г. у в. Прыгаўка. Скончыў Валгаградскі політэхнічны і Паволжскі сацыяльна-політэхнічны інстытуты. Доктар хімічных навук. Доктар эканомікі і менед-



А.П. Палітыка.



І.М. Старавойтаў.

жменту. Доктар тэхнічных навук. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР. З 1993 г. Генеральны дырэктар ААТ «Волжскі аргсінтэз». Аўтар больш як 100 навуковых прац, патэнтаў і вынаходніцтваў.

**ТОКІН Барыс Пятровіч,** нарадзіўся ў 1900 г. у Крычаве. Вучоны-біёлаг. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1950). Скончыў у 1929 г. Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Прафесар Томскага (1936–1947) і Ленінградскага (з 1949) універсітэтаў. Аўтар шарага работ у галіне эксперыментальнай эмбрыялогіі, па пытаннях рэгенерацыі, клетачнага дзялення. Ён паклаў пачатак вывучэнню імунітэту эмбрыёнаў. У 1942–1955 гг. працаваў у Інстытуце эксперыментальнай медыцыны, потым у Акадэміі медыцынскіх навук СССР.

**ТРУХАНОЎСКІ Уладімір Рыгоравіч,** нарадзіўся 15.7.1914 г. у в. Бацьвінаўка. Член-карэспандэнт АН СССР (1964). Скончыў педінстытут імя М.Н. Пакроўскага (1940), Вышэйшую дыпламатычную школу МЗС СССР (1941). У 1941–1953 гг. – на дыпламатычнай рабоце, з 1947 г. – загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі, затым гісторыі міжнародных адносін і знешняй палітыкі СССР Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін. У 1953 – 1957 гг. – намеснік дырэктара інстытута гісторыі АН СССР. З 1960 г. – рэдактар журнала «Вопросы истории».

Узнагароджаны 3 ордэнамі СССР.

**ШЭМЕТАЎ Віктар Піліпавіч,** нарадзіўся ў 1930 г. у в. Гуркова Ніва. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Скончыў у 1955 г. Мінскі медыцынскі інстытут. Працаваў у



В.П. Шэметаў.

Быхаве ўрачом, галоўным урачом райбальніцы, асістэнтам у Гродзенскім медыцынскім інстытуце, галоўным педыятрам Гродзенскага аблздраўаддзела, загадчыкам кафедры Смаленскай дзяржаўнай медыцынскай акадэміі. Аўтар 107 навуковых прац.

## ГЕНЕРАЛЫ

**ДУБАСАЎ Мікалай Філімонавіч,** нарадзіўся ў вёсцы Лабковічы. Генерал-маёр міліцыі. Працаваў сакратаром Кашанскага сельскага савета, у 1951–1958 гг. – на камсамольскай рабоце. З 1958 па 1975 г. – інструктар Магілёўскага абкома КПБ, 2-і сакратар Шклоўскага, першы сакратар Клімавіцкага райкомаў партыі, загадчык аддзела Магілёўскага абкома КПБ. Больш 10 гадоў узначальваў упраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкома, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, Магілёўскага абласнога Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», медалямі.

**ПАСТРЭВІЧ Іван Пракопавіч,** нарадзіўся ў 1919 г. у Крычаве. Генерал-маёр юстыцыі. Скончыў Мінскі юрыдычны інстытут, працаваў народным суддзёй Заслаўскага р-на Мінскай і Круглянскага р-на Магілёўскай абласцей. У1938 г. прызваны ў Чырвоную армію, служыў ваенным следчым і памочнікам ваеннага пракурора. У Вялікую Айчынную вайну займаў адказныя пасады ў органах ваеннай пракуратуры Заходняга і 3-га Беларускага франтоў. Пасля вайны – пракурор Туркестанскай ваеннай акругі. З 1968 па 1973 гг. працаваў пракурорам Беларускай ССР. Выбіраўся членам ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, двойчы – Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

## Ганаровыя грамадзяне

**ГУСАКОЎСКІ Іосіф Іраклієвіч** (Гл. раздзел «Героі Савецкага Саюза – ураджэнцы Крычаўшчыны).

**ЖАДАЎ Аляксей Сямёнавіч** (Гл. раздзел «Абаранялі Крычаўшчыну).

**МАКСІМЦАЎ Міхаіл Данілавіч,** нарадзіўся ў 1909 г. у Варонежскай вобласці. Генерал-маёр. Скончыў Варонежскі індустрыяльны тэхнікум, працаваў на будоўлі, служыў у Чырвонай арміі. У 1941 г. скончыў ваенна-інжынерную акадэмію імя Куйбышава. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам 559-га асобнага батальёна 229-й стралковай дывізіі 50-й арміі, потым – начальнікам штаба інжынерных войск гэтай арміі. Удзельнік баёўзавызваленне Калужскай, Тульскай, Бранскай абласцей, фарсіраваў рэкі Дзясну, Сож, Днепр, Віслу, Одэр, Эльбу. У 1951 г. скончыў акадэмію Генеральнага штаба, служыў начальнікам інжынерных войск Закаўказскай ваеннай акругі. Звольнены ў запас у 1955 г.

Падраздзяленні, якімі камандаваў М.Д. Максімцаў, вызвалялі Крычаў.

**РЭУЦКІ Кузьма Андрэевіч** (Гл. «З успамінаў былога сакратара Крычаўскага падпольнага райкома партыі К.А. Рэуцкага).

**САВІН Алег Яўгенавіч,** нарадзіўся ў 1912 г. у Яраслаўскай вобласці. Палкоўнік, камандзір 572-га Крычаўскага артылерыйскага палка. У 1933 г. скончыў Ленінградскую артылерыйскую школу, служыў камандзірам агнявога ўзвода, начальнікам разведкі дывізіёна, камандзірам батарэі. Удзелыгік савецка-фінляндскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Удзельнічаў у баях пад Масквой, Віцебскам, Оршай. У 1945 г. лужыў у Манголіі, у г. Дальні. Звольніўся ў запас у 1958 г. Падраздзяленні, якімі камандаваў А.С. Савін, вызвалялі Крычаў.

**СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Карпавіч** (Гл. раздзел «Навукоўцы»).

**СУПРУНОЎ Мітрафан Фёдаравіч,** нарадзіўся ў 1903 г. у Белгарадскай вобласці. Генерал-маёр, камандзір 385-й Крычаўскай стралковай дывізіі. У 1929 г. скончыў Сярэднеазіяцкую ваенную школу імя Леніна, у 1939 г. – ваенную акадэмію імя Фрунзе. З 1940 г. выкладаў у ваеннай акадэміі. У



М.Д. Максімцаў.



А.Я. Савін.



М.К. Старавойтаў.



М.Ф. Супруноў.

гады вайны быў на аператыўнай рабоце ў штабе арміі, з 1943 г. – камандзір 385-й стралковай дывізіі. Пасля заканчэння вайны служыў у ГДР, быў ваенным саветнікам у КНР.

Дывізія, якой камандаваў М.Ф. Супруноў, вызваляла Крычаў.

***Падрыхтавала да друку Н.М. Марозава.***

## Яны ўзнагароджаны

### «МЕДАЛЁМ МАЦЯРЫНСТВА» І ступені

**АЎСЯННІКАВ А Галіна Аляксандраўна,** калгасніца калгаса « Звязда».

**ЕЛІСЕЕНКАВалянціна Іванаўна,** хатняя гаспадыня.

**ЖАЛУДЗЁВА Ганна Іванаўна,** супрацоўніца дзіцячага сада № 9.

**КУЧУК Надзея Пятроўна,** даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік».

**ЛАБАР Валянціна Уладзіміраўна,** лаба-

рантка цэментна-шыфернага камбіната. Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступені.

**МАРОЗАВА Ганна Раманаўна,** супрацоўніца аўтапарка.

**ПАЛЯКОВА Раіса Емяльянаўна,** рабочая саўгаса «Крычаўскі».

**ПАУЛАВА Клара Пятроўна,** калгасніца калгаса «Запаветы Леніна». Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступені.

**СВІРЫДЗЕНКА Вера Яўхімаўна.**

**ФРАЛЯНКОВА Ніна Рыгораўна,** рабочая мясакамбіната.

**ЦЯМНІЦКАЯ Тамара Мікалаеўна.** Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» II ступень

**ШАЎМЕРАВА Раіса Гаўрылаўна,** калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

**ШУПО Любоў Рыгораўна,** рабочая саўгаса «Дзягавічы».

**«МЕДАЛЁМ МАЦЯРЫНСТВА» II ступені**

**АЗАРАВА Вера Дзмітрыеўна,** калгасніца калгаса «Вялікі Кастрычнік».

**АСТАПЕНКА Тамара Мікалаеўна,** калгасніца калгаса «Савецкая Беларусь»

**БЕЛЯНКОВА Тамара Мікалаеўна,** калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

**БОЛАТАВА Галіна Васілеўна,** рабочая станцыі Крычаў.

**ВОЛІКАВА Раіса Васілеўна,** даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік».

**ВЯРЖБІЦКАЯ Кацярына Дзмітрыеўна,** калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

**ГАЛАУНЁВА Раіса Мікалаеўна,** даярка калгаса «Звязда».

**ГАРБІЦКАЯ Ніна Міхайлаўна,** калгасніца калгаса «Перамога».

**ГРЫСЯНКОВА Людміла Уладзіміраўна,** тэхнолаг піўзавода.

**ДВАРАЧЭНКА Галіна Аляксееўна,** даярка калгаса «Бель».

**ДЗЕТЦЕЛЬ Ніна Пятроўна,** работніца аўтапарка.

**ДРАЧОВА Марыя Іванаўна,** калгасніца калгаса «Паямць Леніна».

**ДУБРОВІНА Ніна Аляксееўна,** даярка кал гаса « Перамога».

**ЗАЙЦАВА Галіна Андрэеўна,** калгасніца калгаса «Ленінскі прызыў».

**ЗАРАНКІНА Галіна Фадзееўна,** калгасніца калгаса імя Карла Маркса.

**ІСАЧАНКА Валянціна Рыгораўна,** калгасніца калгаса «Бель».

**КАВАЛЬЧУК Вольта Паўлаўна,** даярка калгаса імя Карла Маркса.

**КАЗАКОВА Таццяна Мікалаеўна,** рабочая саўгаса «Дзягавічы».

**КАЮМАВА Раіса Аляксееўна,** рабочая аддзела пазаведамаснай аховы.

**КРАСПАМОВЕЦ Марыя Пятроўна,** рабочая завода гумавых вырабаў.

**КРАЎЦОВА Тамара Пятроўна,** рабочая завода гумавых вырабаў.

**МАЛАШАНКА Валянціна Віктараўна,** інспектар раённага камітэта ДТСААФ.

**МІХНІКАВА Валянціна Рыгораўна,** калгасніца калгаса «Бель».

**НЕСЦЕРАВА Любоў Восіпаўна,** работніца мясакамбіната.

**НІЖЭВІЧ Тамара Васілеўна,** даярка калгаса «Бель».

**ПАЛУШЫНА Марыя Іванаўна,** даярка саўгаса « Крычаўскі».

**ПАЎЛЮЧЭНКА Надзея Міхайлаўна,** рабочая завода гумава-тэхнічных вырабаў.

**ПАЧАЧУЕВА Любоў Мікалаеўна,** рабочая саўгаса «Крычаўскі».

**ПЯТРОВАВалянціна Захараўна,** рабочая хлебапякарні станцыі Крычаў.

**ПЯТРОВА Ніна Дзмітрыеўна,** калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

**РАГОЎСКАЯ Аляксандра Пятроўна,** даярка калгаса імя Суворава.

**РАЗІКАВА Тамара Елісееўна,** калгасніца калгаса «Звязда».

**РАМАНЕНКА Ганна Васілеўна,** калгасніца калгаса імя Суворава.

**РАЎКОЎСКАЯ Марыя Ягораўна,** рабочая цэментна-шыфернага камбіната.

**РУДКЕВІЧ Галіна Міхайлаўна.**

**РУДНІЦКАЯ Ніна Канстанцінаўна,** калгасніца калгаса «Перамога»

**РЫШТАКОВА Зоя Іванаўна,** загадчыца клуба вёскі Сычык.

**САЛАШЭНКА Ганна Паўлаўна,** хатняя гаспадыня, вёска Зарубец.

**САЎЧАНКА Тамара Сяргееўна,** калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

**СКАЧКОВА Галіна Пятроўна,** выхавальніца Маляціцкай СШ.

**СЛУЧКОВА Тамара Мікалаеўна,** калгасніца калгаса «Звязда».

**СЦЕШАКОВА *Людміла Уладзіміраўна,*** калгасніца калгаса «Перамога».

**ЦІМАШЭНКА Тамара Уладзіміраўна,** калгасніца калгаса «Запаветы Ільіча».

**ЦІХАНЕНКА Вера Паўлаўна.**

**ЦЮКАЛАВА Вольга Рыгораўна,** калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

**ЧУНАЕВА Зоя Дзмітрыеўна.**

**ЧЫЖ Галіна Апанасаўна,** калгасніца калгаса «Камунар».

**ЧЫСЛОВА Валянціна Мікалаеўна,** рабочая мясакамбіната.

**ШЫЛКІНА *Любоў Міхайлаўна,*** калгасніца калгаса «Сацыялістычны шлях».

**ОРДЭНАМ «МАЦЯРЫНСКАЯ СЛАВА» III ступені**

**ВАЛАДЗЬКО Надзея Максімаўна.**

**КАСАНОЎСКАЯ *Лідзія Спірыдонаўна.***

**МЫРЗА *Яўгенія Восіпаўна,*** калгасніца калгаса «Памяць Леніна».

**МАНУЛЕНКА Ганна Яўгенаўна,** даярка калгаса імя Суворава. Узнагароджана таксамі «Медалём мацярынства» І ступені, «Медалём мацярынства» II ступені.

**МЯНЦЯННІК *Любоў Віктараўна,*** даярка калгаса «Вялікі Кастрычнік». Узнагароджана таксама «Медалём мацярынства» І ступені.

**ШЭПШАЛЁВА Марыя Лаўрэнаўна.**

**ШЭПШАЛЁВА Таццяна Лаўрэнаўна,** калгасніца калгаса «Вялікі Кастрычнік».

**ОРДЭНАМ «МАЦЯРЫНСКАЯ СЛАВА» II ступені**

**КУПЦОВА Ганна Раманаўна,** работніца цэментна-шыфернага камбіната.

**ОРДЭНАМ МАЦІ**

**КАЗЛОВА Галіна Мітрафанаўна,** паштальён Лабковіцкага аддзялення сувязі.

**МІХНЕВІЧ Вольга Уладзіміраўна,** паштальён Асавецкага аддзялення сувязі.

**ПАУЛАВА Валянціна Пятроўна,** даярка калгаса «Перамога».

**СВЯТКІНА Любоў Леанідаўна,** санітарка-буфетчыца райбальніцы.

**ШЭДКО Таццяна Андрэеўна.**

## След Чарнобыля

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС, якая здарылася 26 красавіка 1986 г., прынесла бяду. Звыш 70% радыяцыйнага попелу высыпалася на тэрыторыю нашай рэспублікі. З геаграфічнай карты краіны знікла мноства вялікіх і малых па колькасці насельніцтва вёсак, жыхары якіх з болем і горыччу вымушаны былі пакінуць сваё жытло і перасяліцца ў іншыя мясціны. З землекарыстання ў рэспубліцы выключана 264000 га забруджанай радыенуклідамі зямлі.

Пакінула свой злавесны след Чарнобыльская катастрофа і на Крычаўшчыне.

У вёсках Бацьвінаўскага сельсавета Бранск, Вародзькава-1, Вародзькава-3, Даленшчына, Зайцава Слабада, Канцы, Лучкі, Малінаўка, Асавец, Бацьвінаў- ка, Масціцкая Слабада, на чыгуначнай станцыі Асавец, Прусіна, Цінькава, Янаў забруджанне глебы цэзіем-137 складае ад 1 да 5 кюры на кв. км.

Аналагічнае становішча і ў вёсках Гуркава Ніва, Доўгі Лог, Дарагая, Лушчэвінка, Макаўе, Паклады, Пушкары, Свадкавічы, Сячыхі, Хацілавічы Касцюшкавіцкага сельсавета.

У Бацьвінаўскім сельсавеце ёсць вёскі, у якіх забруджанасць радыенуклідамі складае ад 5 да 10 кюры на кв. км: Буланы, Вярхоўцы, Вародзькава-2, Горкі, Губеншчына, Касцюкоўка, Меляціна, Падудага, Ратнае, Сетнае, Юркаўка.



Чорны след Чарнобыля.

Такі ж узровень забруджання і ў вёсках Касцюшкавіцкага сельсавета – Волчас, Малькаўка, Касцюшкавічы, Ноўкі, Прыгаўка.

Некалькі гадоў пасля аварыі ўтойвалася ад людзей праўда аб небяспецы, што нясуць радыенукліды. Такое недаравальнае замоўчванне прынесла шкоду: вырас узровень захворваемасці, асабліва дзяцей.

Зараз раённыя ўлады робяць усё магчымае для таго, каб стварыць нармальныя ўмовыг пражывання ў зонах з дапушчальным узроўнем радыяцыі. Праводзіцца пашпартызацыя ўсіх падворкаў на ступень радыенукліднага забруджання, распрацавана спецыяльная сістэма кантролю за чысцінёй прадуктаў харчавання, якія вытвараюцца ў раёне і ўвозядца з іншых месц. Раённым цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі наладжаны кантроль за ўтрыманнем радыенуклідаў у пітной вадзе, сельгаспрадуктах, у грыбах і ягадах з мясцовых лясоў, у выпускаемай прадукцыі мясакамбінатам і маслазаводам.

Медыцынскія ўстановы раёна праводзяць агляды насельніцтва. Лячэбна-дыягнастычная дапамога аказваецца вучням Бацьвінаўскай, Касцюшкавіцкай і Сакольніцкай школ. Там арганізавана двухразовае харчаванне. 5680 школьнікаў, якія пражываюць у зоне перыядычнага кантролю, аздаравіліся па пуцёўках у незабруджаных радыенуклідамі мясцінах. 1152 санаторныя пуцёўкі былі выдадзены рай-

комам прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу для аздараўлення дарослага насельніцтва, якое пражывае ў зоне бедства.

Пабудавана і адрамантавана 384 км дарог, за кошт сродкаў ЧАЭС у калгасах узведзена 19 дамоў. У райцэнтры, у 70-кватэрным доме, пацярпелым ад катастрофы выдзелены 19 кватэр з усімі бытавымі зручнасцямі, у вёсцы Касцюшкавічы праведзена дэзактывацыя тэрыторыі дзіцячага садка.

*В.Ф. Куліненка.*

## Мох, наш мох

**из школьного сочинения на чернобыльскую тему**

Я родился 16 декабря 1979 года, и мне тогда было чуть больше шести лет. Я вспоминаю отрывки своего детства.

Утро. Влажная дымка не дает пробиться солнцу. Мы с отцом вышли на огород: готовились к севу. Выглянуло солнце, и мы целый день радовались ему. Сначала работали, а после обеда всей семьей поехали на «москвиче» в лес. Через день опять – за березовым соком. Мы разожгли костер, жарили сало, пили сок. Было интересно и радостно. Сок привезли домой, угощали знакомых и друзей. Поставили его в погреб и пили все лето.

Солнечный день был и 1 Мая. Вокруг красным-красно от флагов. Все улыбаются, радуются. Мы проходим мимо трибуны и кричим: «Ура! Слава КПСС!».

9 мая к нам в Кричев приехали ветераны-освободители. Им вручали цветы и подарки. На Кургане Славы много детей и взрослых. После митинга был концерт и ярмарка.

Целое лето мы с родителями ездили под Чериков, собирали возле озера чернику, землянику, грибы. Купались в Соже, загорали.

Осенью я пошел в первый класс. В нашей школе выступали ветераны войны и труда. Проходили уроки мира. Позже все готовились отмечать 850-летие Кричева. Снова в городе был праздник. И снова красные флаги, красивые речи и песни.

О Чернобыле нам стало известно в 3-4 классах. Говорили, что реактор взорвался от нас далеко. И ни слова о том, что пострадали от взрыва и наши район, город. Об этом вскоре мы сами стали догадываться. Два-три года молчали о том, что нельзя было собирать в лесах ягоды и грибы. Мы пили чернобыльский березовый сок. Ели отравленные цезием, стронцием и плутонием грибы и ягоды. Загорали на радиоактивном солнце и купались в насыщенных радиацией реках и озерах.

Со мной училась Алеся Мельникова. Ее родители построили новый деревянный дом. Жили в нем три года, а потом Алеся заболела. Вызвали санстанцию. Когда измерили уровень радиации, он оказался выше нормы. Как выяснилось, дом поставили на холоблинском мху – он был радиоактивный. Позже за счет Госкомчернобыля им построили новый дом, а Алесе дали путевку в санаторий. Но не одна Алеся болела и болеет.

За последние годы я и мои одноклассники отдыхали в Нальчике и Витебске. А в прошлом году вместе с ребятами из Ботвиновки, Осовца и Сячика, где большой уровень радиации, побывали в Германии. За два с половиной часа самолет доставил нас в город Гютерсло (земля Северный Рейн). Поселили в немецких семьях, тоже имеющих детей. Мы хорошо понимали друг друга, да и переводчиков было много: ведь там жили беженцы – немцы из Казахстана и России.

Меня поселили в красивый деревянный дом Мехтхильды и Вильгельма Гроферов, у которых трое детей – мальчики Макс, Тило и Ян. Нас возили на концерты, в цирк и музей военной техники. Гуляли в парках, катались на каруселях. Самое яркое впечат-

ление произвел бассейн с винтовой лестницей, по которой можно быдо скатиться сверху в воду. Купались, сколько хотели. Знали, что дома такое нам и не присниться. Жили вместе с детьми в одной комнате, ели тоже вместе. Ездили на велосипедах на прогулки. Я с хозяйкой Мехтхильдой, кроме того, ездил часто в продовольственный магазин. Там изобилие! Такое можно увидеть только во сне.

Немецкие друзья подарили каждому из нас плейеры, кассеты, джинсы и куртки, красивые спортивные сумки, шоколадки и конфеты. Хоть там нам было хорошо, я немного соскучился по своему городу, друзьям и природе, какая у нас.

Возвращались на автобусе «Мерседес» через Германию, Польшу. Дома написали письма немецким друзьям. Осенью они прислали нам посылки и письма. Вот что написал отец Макса, Тило и Яна – Вильгельм:

«Посылаем посылку и фотографии. У нас все хорошо и вам этого желаем. Из печати узнали, что Чернобыльская АЭС еще полностью не заглушена и выделяет радиацию. Мы просим и молимся Богу за всех вас, чтобы Чернобыль снова не повторился. Молитесь Богу и вы за нас».

По решению Всемирного Совета Мира в августе ежегодно проводится Неделя действий по запрещению ядерного оружия и солидарности с жертвами атомных бомбардировок. Не только осиротевшие хиросимцы и их соотечественники – все человечество повторяет в этот день клятву. Она высечена на каменном надгробье в хиросимском Парке мира: «Спите спокойно, это не повторится!».

Хочется, чтобы люди не забывали о Чернобыле, об этой трагедии. Чтобы помнили, как запрещали говорить правду! Как обманывали и выводили на солнечные кумачовые демонстрации. И назвали имена и фамилии тех, кто замалчивал преступление против белорусов, россиян и украинцев. Правду нельзя спрятать, нельзя закопать в землю.

В нашей школе в последние годы проводится «День Чернобыля». Горят свечи, мы вспоминаем учеников, учителей, всех знакомых, кто умер после аварии. Сейчас мы открыто говорим о Чернобыле, хоть кому- то это и не нравится. Я знаю это от взрослых.

Земля у американцев, японцев, немцев, белорусов одна, и мы должны дорожить ей. Она – наш дом. Беречь ее надо всем вместе.

*Виктор Бысов ученик 8-го класса*
*СШ №4 г. Кричев*

*Друкуецца паводле кн.: «След черного ветра», Мн,, 1995 г.*

## Дрэва дружбы

В далёкой Японии в Нагасаки есть парк Мира, который посвящён памяти жертв Хиросимы и Нагасаки. Дети и взрослые со всех концов страны съезжаются в этот парк, чтобы почтить память жертв атомной бомбардировки, приносят с собой разноцветных бумажных журавликов, которых оставляют на ветвях деревьев. Ведь журавль – символ мира и дружбы. Круглый год весь парк увешан такими разноцветными гирляндами. Побывав с отцом в Японии, мы были удостоены великой чести посадить дерево дружбы – сакуру – в этом самом парке возле самого постамента, посвящённого жертвам. Подобной чести не удостаивались даже высокопоставленные лица бывшего СССР. Нашим друзьям из комитета «Помощь Чернобылю» потребовалось приложить немало усилий, чтобы получить на это разрешение. И вот частичка Беларуси теперь осталась в Стране восходящего солнца. И о нас с вами будут вспоминать не только по-



Дрэва Дружбы.

тому, что Японию и Беларусь объединяет память о погибших в результате страшной силы атома, а и потому, что в парке Мира растёт наше дерево дружбы.

*Виктор Бысов.*
*Кричев.*

*Советская Белоруссия, 2002 г., 24 жнгўня.*

## Злавесныя сляды вайны ў Афганістане

Вайна ў Афганістане не абмінула і Крычаўшчыну. Семдзесят адзін юнак удзельнічаў у баявых аперацыях у чужой краіне. Ніхто з іх не трапіў у палон, усе ўзорна выконвалі свой воінскі абавязак, маюць урадавыя ўзнагароды. Адны вярнуліся з таго пекла здаровымі, другія – інвалідамі, сем нашых землякоў загінулі. Іх мужнасць і вернасць воінскаму абавязку назаўжды застануцца ў памяці народнай.

# Загінулі ў Афганістане

**ВАЛЧКОЎ Віктар Генадзьевіч,** нарадзіўся 27.11.1964 г. у г. Крычаў. У 1980 г. скон- чыў 8 класаў сярэдняй школы № 1, у 1983 г. – Крычаўскае ПТВ №112. У 1983 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Малодшы сяржант В.Г. Валчкоў загінуў 10.07.1984 г. пры выкананні баявога задания. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Пахаваны у г.Крычаў.

**З пісьма В.Г. Валчкова бацьку.**

Май 1984 г.

... Вот уже больше месяца служу в ДРА, пока служба идёт нормально...

... А сейчас здесь очень жарко, 60 градусов, 2 человека чуть не умерли от теплового удара, еле спасли. На счёт воды здесь очень плохо...

... Вот получил от тебя письмо, знаешь чуть не заплакал. Так захотелось дома побыть, хоть денёк. Такая тоска, как всё равно 1 месяц в армии. Ну ничего, мне ещё полтора года осталось...

**ГАЛАЎНЁЎ Юрый Мікалаевіч,** нарадзіўся 4.01.1962 г. у г. Крычаў. У 1979 г. скончыў сярэднюю школу у г. Чарнаўцы (Украіна), у 1983 г. – Камянец-Падольскае ваенна-інжынернае каманднае вучылішча. Служыў на Урале. У маі 1986 г. быў накіраваны ў Афганістан. Старшы лейтэнант Ю.М. Галаўнёў загінуў 13.11.1986 г. Пахаваны ў Мінску на Паўночных могілках. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**ДУБРОВІЧ Сяргей Міхайлавіч,** нарадзіўся 26.06.1967 г. ў саўгасе «Бальшакоўскі» Любанскага раёна Омскай вобласці. У 1982 г. скончыў 8 класаў у 1985 г. – Любанскае ПТВ № 43. У 1986 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Ваенную службу праходзіў у Афганістане. Яфрэйтар С. М. Дубровін памёр ад ран 19.10.1988 г., пахаваны ў вёсцы Даленшчына. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**КАРПАЎ Уладзімір Сямёнавіч,** нарадзіўся 27.08.1960 г. у г. Крычаў. У 1975 г. скончыў 8 класаў сярэдняй школы №3 г.Крычава, потым паступіў у Крычаўскі філіял Мінскага індустрыяльнага тэхнікума. Пасля яго сканчэння працаваў у гарадскім аўтапарку. З 1978 завочна вучыўся ў Рослаўскім сельскагаспадарчым тэхнікуме Смаленскай вобласці. У красавіку 1979 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы У.С. Карпаў загінуў у баі



В. Г. Валчкоў.



Ю.М. Галаўнёў.



У.С. Карпаў.

81. Зак. 808.

3.08.1980 г. Пахаваны ў г. Крычаў, Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Лырвонай Зоркі.

**КРАЎЦОЎ Леанід Віктаравіч,** нарадзіўся 26.02.1964 г. у вёсцы Касцюшкавічы. Скончыў Макаўскую васьмігадовую школу, а ў 1982 г. – Крычаўскае ПТВ №112 па спецыяльнасці электразваршчык. У верасні 1982г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы Л.В. Краўцоў загінуў 1.02.1983 г. пры выкананні баявога задания. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў вёсцы Пушкары.

**З пісьма камандавання часці маці Л.В. Краўцова.**

... За время прохождения службы в нашей части Леонид зарекомендовал себя смелым, мужественным, исполнительным и трудолюбивым солдатом, хорошим товарищем. За организованность и дисциплину, высокое боевое мастерство, инициативу, проявленную при выполнении боевых заданий, неоднократно поощрялся командованием.

1 февраля 1983 года, выполняя боевое задание, верный военной присяге, проявив стойкость и мужество, Леонид погиб. Мы потеряли хорошего друга и солдата. Память о нём навсегда останется в наших сердцах. За мужество и отвагу, проявленные при выполнении своего последнего задания, Леонид представлен к правительственной награде.

Уважаемая Тамара Антоновна, не замыкайтесь в своём горе, пишите нам. Помните что, у вас есть боевые друзья и товарищи Вашего сына, всегда готовые придти к Вам на помощь словом и делом.

С большим уважением к Вам все сослуживцы Леонида и командир войсковой части

Е.М. Мещеряков.
Начальник политического отдела части
С.В. Ткаченко.

**ЛУГАВЫ Сяргей Аляксандравіч,** нарадзіўся 13.03.1965 г. у г. Крычаў. Ў 1980 г. скончыў васьмігадовую школу №4 у г. Крычаве, а ў 1983 г. – Крычаўскае ПТВ №112. У 1983 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл. Служыў у Афганістане. Радавы С. А. Лугавы загінуўу баі 4.06.1985 г. За мужнасць і адвагу пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў г. Крычаў.

**МАСЛЯНКОЎ Ігар Віктаравіч,** нарадзіўся 14.02.1966 г. у г. Крычаў. У 1983 скончыў сярэднюю школу №6 г. Крычава і паступіў у Магілёўскі машынабудаўшчы інстытут. У 1984 г. прызваны ў рады Узброеных Сіл райваенкаматам г. Магілёва. Служыў у Афганістане. Радавы І.В. Маслянкоў загінуў 19.01.1986 г. За мужнасць і гераізм пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны ў г. Крычаў.

... У той дзень І.В. Маслянкоў вылецеў на задание ў складзе группы, якая праводзіла паветраную разведку пустынных раёнаў. Верталёт, у якім знаходзіўся Ігар і яго баявыя таварышы, быў збіты каля г. Лашкаргах...

**З пісьма І.В. Маслянкова родным.**

2 студзеня 1986г.
Лашкаргах, ДРА.

... Наконец-таки получил от вас письмо с радостным известием. У Ирины родилась дочь, жалко, что не мальчик, я бы, конечно, со Славиком хотел иметь мужика. Ну ладно, главное, что Иринка



Л.В. Краўцоў.



С.А. Лугавы.



І.В. Маслянкоў.

Погода нас не балует, начало холодать. На задание я пока не хожу, машина сломалась уже надолго...

стала матерью и всё неплохо обошлось. Это известие я получил 31 декабря 1985 г. в 16 ч. 30 мин., т.е. под Новый год. Я чувствовал повзрослевшим не на 1 год, а на несколько, что входит в понятие дяди.

Мам, а ты ж у меня теперь бабушка, и такая молодая, тебе скоро всего 43 года будет. А бабуся с дедом вообще ужо прабабуля и прадед. Так что, как видите, Новый год я встретил в великолепном расположении духа, что очень хорошо. Ну, а в общем мы отметили праздник очень неплохо. Накупили в магазине сладостей разных. Почти целый день смотрели телевизор, даже Снегурочка приходила поздравлять. Не сомневаюсь, что и вы хорошо провели праздники...